№ 10 (368) 12 сакавіка 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

**Стаўкі зробленыя**
Што чакае Беларусь пасьля выбараў у Расеі?
старонка 5

**Паганская энцыкляпэдыя,**
Джэймс Бонд, Салман Рушдзі, Новы Запавет у перакладзе айца Чарняўскага.
старонка 13

**Андрэй Хадановіч**
Мае вершы як лісты шчасьця.
старонка 2

**Невядомая БНР**
Габрэі ў БНР: нарыс Сяргея Шупы.
старонка 14

# Прэзыдэнталізм ці парлямэнтарызм?



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Тэма нумару.**
**Старонкі 6–9.**

### ТБМ адстаяла Румянцава

Таварыства беларускае мовы дамаглося ад уладаў працягу дамовы на арэнду памяшканьня па Румянцава, 13. Адказ на ліст кіраўніцтва ТБМ да Ўрала Латыпава прыйшоў зь Менскага гарадзкога цэнтру нерухомасьці. Праўда, моваабаронцы прасілі пра бестэрміновую арэнду, а яе працягнулі толькі на год.

### Красоўская ў Кангрэсе

Ірына Красоўская выступіла ў Камітэце міжнародных адносінаў Палаты прадстаўнікоў ЗША. Там адбыліся адкрытыя слуханьні «Правы чалавека ў сьвеце».

### «Гарызонт» у плюсе

У студзені—лютым «Гарызонт», за кошт росту паставак у Расею і Ўкраіну, павялічыў экспарт на 45% у параўнаньні з аналягічным леташнім пэрыядам. За два месяцы выпушчана 80 тыс. тэлевізараў.

### Васілевіч пра трэці тэрмін

Старшыня Канстытуцыйнага суду Рыгор Васілевіч «ня бачыць перашкодаў» для зьмены канстытуцыйнай нормы, якая забараняе адной асобе займаць пасаду прэзыдэнта больш за два тэрміны. Але — толькі праз рэфэрэндум. Гэта ён сказаў на прэс-канфэрэнцыі з нагоды Дня Канстытуцыі. Паводле сацыялягічных дасьледаваньняў НІСЭПД, большасьць беларусаў выказваюцца супраць трэцяга тэрміну.

### Дацкія зьнішчальнікі на беларускай мяжы

Данія з 1 красавіка разьмесьціць у Літве, што ўступае ў NATO, чатыры шматмэтавыя зьнішчальнікі F-16. Фармальна рашэньне пра дыслякацыю авіягрупы мае быць прынята ў чацьвер на паседжаньні камітэту па замежных справах парлямэнту Даніі. Краіны Прыбалтыкі, што ўвайшлі ў Паўночнаатлянтычны альянс, ня маюць у складзе сваіх ВПС сучасных зьнішчальнікаў. Разам з самалётамі 31 сакавіка ў Літву прыбудуць перасоўная радарная ўстаноўка і сотня чалавек лётнага ды тэхнічнага пэрсаналу.

### Сустрэча ў Кракаве

У Кракаве ў сераду пры зачыненых дзьвярах адбылася другая сустрэча сакратароў Радаў бясьпекі Беларусі, Польшчы, Украіны і Расеі. Удзельнікі абмеркавалі праблемы бясьпекі ў кантэксьце пашырэньня NATO і ЭЗ, узаемадзеяньне ў барацьбе з тэрарызмам, злачыннасьцю і нелегальнай міграцыяй. Вырашана правесьці супольныя антытэрарыстычныя вучэньні.

**СМ; БелаПАН**

### «Наша Ніва» й «Arche» ў Астраўцы

На спатканьне з чытачамі самага блізкага да Балтыйскага мора раёну нашай краіны выпраўляцца рэдактар часопісу «Arche» Валер Булгакаў, рэдактар «Нашай Нівы» Андрэй Дынько, палітоляг Віталь Сіліцкі, паэт Андрэй Хадановіч. Сустрэча адбудзецца 14 сакавіка, у нядзелю, у раённай бібліятэцы аб 11-й. Гаворка пойдзе пра ўсё, што хвалюе і набалела.

### Тыдзень без чужога слова

«Наша Ніва» — незалежная крыніца інфармацыі і грунтоўны аналітык беларускага і міжнароднага жыцьця. «Наша Ніва» — гэта 16 старонак без чужога слова штотыдзень. Дык падпісвайся!
Газэта была заснаваная ў 1906 годзе, аднаўленая ў 1991 годзе. Пасьля аднаўленьня выходзіць ужо 13 гадоў.
Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапіКі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс». Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапіках «Белсаюздруку». Падпіска на другі квартал прымаецца да 19 сакавіка.

# Сасім назусім

## Рэпартаж з Баранавіч

**Мікіта Сасім. Нарадзіўся ў Баранавічах. Вучыўся ў школе №5. Пасьля 6-й клясы пайшоў у Сувораўскую вучэльню, пасьля 9-й сышоў зь яе. Працаваў. Узімку 2002 году абараняў Курапаты на вахце. Паўгоду правучыўся ў Беларускім ліцэі. Нежанаты. 19-гадовы. Жыве з маці. Студэнт спэцыяльнасьці «эканоміка і кіраваньне прадпрыемствам» Баранавіцкага каледжу лёгкай прамысловасьці, другі курс. Балятаваўся ў дэпутаты — самы малады ў горадзе кандыдат — не прайшоў, сабраў 12% галасоў. Быў кіраўніком суполкі БРСМ. Размаўляе па-беларуску прынцыпова. Крывадушша афіцыёзу «задрала» — перайшоў у «Зубр». Ня проста перайшоў, а загітаваў з сабою 65 сваіх калег і каляжанак. У дадзены момант сядзіць «суткі». Затрыманы ў аўторак у родным каледжы за расклейку ўлётак. Разам зь ім пасадзілі ягоных сябра і сяброўку.**

Маці сына падтрымлівае: Сьвятлана Сасім сама варыць «зубрам» клейстэр для ўлётак. Лістоўкі «Зубра» ў Баранавічах скрозь, дзе не напісаныя графіці. Дзейнічаюць ня толькі баранавіцкія: сюды зьехаліся «зламысьнікі» з Слоніму, Ляхавіч, Менску на чале зь няўрымсьлівым вэтэранам (у сваe 25 гадоў) арганізацыі Яўгенам Афнагелем, адным з агульнанацыянальных каардынатараў «Зубра». Таго самага «Зубра», якому «Наша Ніва» ў 2001 годзе прарочыла зьнікненьне. І памылілася: ён захаваўся. І ня проста ўтрымаўся, а перарадзіўся пад напорам энтузіязтаў кшталту Афнагеля ў новую якасьць.

Такога Баранавічы ня бачылі ад 1946 году, калі ў Баранавіцкім пэдінстытуце распраўляліся з «Чайкай». Пры Польшчы адбываліся ў горадзе выступы працоўных. Гучныя акцыі супраціву сталіншчыне зьдзяйсьняла моладзь. «Чайку» энкавэдысты вынішчалі з асаблівай стараннасьцю. Цяперашні выпадак ня меў жахлівых наступстваў для юнакоў. Ды ўвогуле, лічы, ніякіх.

Працяг на старонцы 3.

ТЫДЗЕНЬ НАШАГА ЖЫЦЬЦЯ

# Дзень Канстытуцыі

15 сакавіка спаўняецца дзесяць гадоў Канстытуцыі Беларусі. Яна была прынятая на паседжаньні Вярхоўнага Савету 12-га скліканьня ў 1994 г., а ўжо праз два з паловай гады, на рэфэрэндуме 1996 г., у яе былі ўнесеныя істотныя зьмены, у выніку чаго Беларусь ператварылася ў моцнапрэзыдэнцкую рэспубліку. Дарэчы, на той самы рэфэрэндум фракцыі камуністаў і аграрыяў прапанавалі альтэрнатыўны пакет зьменаў у Асноўны закон, паводле якіх пасада прэзыдэнта ўвогуле скасоўвалася. Сёньня такое сабе цяжка ўявіць — зашмат зьвязана за дзесяць гадоў зь дзейнасьцю прэзыдэнта. Тым ня менш, дзесяцігодзьдзе Канстытуцыі — нагода зноў прааналізаваць перавагі й хібы цяперашняй мадэлі і прыглядзецца да альтэрнатываў. Якая ўсё ж форма дзяржаўнага ладу — прэзыдэнцкая ці парлямэнцкая рэспубліка — больш пасуе Беларусі? Пра гэта разважаюць палітоляг Алесь Батура і юрыст Міхал Пліска (**старонкі 8—9**).

У нядзелю Расея абірае прэзыдэнта на выбарах бяз выбару (**старонка 5**). Моцнапрэзыдэнцкая мадэль адна на ўсёй постсавецкай прасторы. Па-іншаму толькі ў Малдове ды Прыбалтыцы. І, пры розьнасьці эканамічных і культурных мадэляў, менавіта ў гэтых краінах захоўваецца найвышэйшая ступень дэмакратыі. Праблемы абмяркоўваюцца на літоўскім прыкладзе — імпічмэнт Паксаса, прапанова Адамкуса аб скасаваньні пасады прэзыдэнта — Сяргеем Дубаўцом і Тацянай Поклад (**старонка 6**). З гэтых матэрыялаў складаецца тэма нумару.

**Барыс Тумар**

## За незалежную Беларусь — разам!

### Такі слоган сёлетняга Дня Волі

Усебеларускі аргкамітэт па сьвяткаваньні 86-х угодкаў БНР абмеркаваў праграму сьвяточных мерапрыемстваў.

У Менску 21 сакавіка ў сядзібе БНФ адчыніцца выстава твораў Івонкі Сурвіллы і Ілоны Барадулінай. На 23 сакавіка плянуецца канцэрт гістарычнай музыкі «Легенды Вялікага Княства».

Уласна 25 сакавіка а 17-й сьвяточныя гулянні распачнуцца на плошчы Свабоды ля Ратушы. Іх удзельнікі спусьцяцца да помніка Янку Купалу, дзе ўскладуць кветкі, пасьля чаго ў Доме вэтэранаў адбудзецца сьвяточны канцэрт, а ў Доме літаратара — вечарына.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Краўчанка ў памяць Арсеньневай

**На замову былога міністра замежных справаў Пятра Краўчанкі вядомы скульптар Алесь Шатэрнік (на фота) адліў у бронзе мэмарыяльную шыльду ў гонар Натальлі Арсеньневай. Шыльда будзе прымацаваная на будынку Беларускай гімназіі ў Вільні, дзе вучылася паэтка. Арсеньнева паказаная ў нацыянальным строі, каля яе — шпак на галінцы вярбы. А.Шатэрнік кажа, што тэкст надпісу на шыльдзе яшчэ абмяркоўваецца. Дата адкрыцьця будзе ўзгадняцца з фундатарам — Пятром Краўчанкам.**

**Аркадзь Шанскі**

## Міны: сёмы ў сьвеце арсэнал зьнішчаецца

Упершыню ад моманту ўступленьня ў сілу Атаўскай канвэнцыі ў Беларусі зладжанае зьнішчэньне 80 супрацьпяхотных мінаў (СПМ). Іх падарвалі ля вёскі Шчыткавічы на Случчыне. Беларусь мае сёмы па велічыні арсэнал гэтага дабра ў сьвеце: каля 4,3 млн СПМ ляжыць на складах. Зь іх 4 млн маюць быць ліквідаваныя паводле канвэнцыі.

У 2004 г. плянуецца ліквідацыя 400 тыс. тратылавых мінаў. Частку вывязуць у Данецк, дзе ёсьць магутнасьці для ліквідацыі. Падрываць астатнія будуць на адным з палігонаў Гомельшчыны.

А ў 2005 г. пачнецца ліквідацыя вадкасных супрацьпяхотных фугасных мінаў. Адмысловыя натаўскія ўстаноўкі павандруюць па краіне: у Рэчыцы знаходзяцца склады мінаў, якія раскідаюцца наземнымі сродкамі, у Добрушы — міны для сыстэмаў залпавага агню, у Гарадку на Віцебшчыне — міны, якія раскідаюцца авіясродкамі. 25% выдаткаў ліквідацыі беларускіх арсэналаў возьме на сябе Канада.

**СМ; БелаПАН**

## Асоба шклоўскай нацыянальнасьці



**Генадзь Лаўранкоў**, новы шэф Кіраўніцтва справаў прэзыдэнта, — чарговы зямляк прэзыдэнта. Магілёўскія прозьвішчы на -коў не пераводзяцца ў апараце. Калі А.Лукашэнка быў старшынём калгасу, Г.Лаўранкоў узначальваў эканамічны аддзел райвыканкаму. Новы кіраўнік «закрытага акцыянэрнага таварыства» прэзыдэнтуры, як чакаецца, ня схільны гуляць самастойную палітычную ролю і будзе ў найвышэйшай ступені «чалавекам прэзыдэнта».

## Сумару нясумна



**Канстанцін Сумар**, чалавек з нуднаватым тварам ідэальнага падатковага інспэктара, прызначаны старшынём Берасьцейскага аблвыканкаму. К.Сумар узначальваў Берасьцейскі райкам КПСС перад канцом Саюзу і быў дэпутатам Вярхоўнага Савету ад тамтэйшае акругі. Пасьля 1994 г. ён ператварыўся ў характэрнага лукашэнкаўскага ўрадоўца, які прайшоў праз розныя пасады ў органах кіраваньня і кантролю.

Лёс былога старшыні **Васіля Даўгалёва** няясны. В.Даўгалёў, якога на Берасьцейшчыне называлі «губэрнатарам Даламаем» вылучаўся неабыякай бізнэс-хваткай, а таксама фэнамэнальнымі сувязямі з рознымі маскоўскімі бізнэс-структурамі. «Савушкаў прадукт» і «Белавеская прадуктовая кампанія» — два найбольш вядомыя. Ці адстаўка яго — гэта апала ці павышэньне, можна будзе зразумець толькі па важнасьці новага прызначэньня.

**Мікола Бугай**

# Кантракт — гэта пастка



**Адмаўляйцеся ад яго падпісаньня, заклікае Леанід Гаравы, дэпутат Гарадоцкага райсавету**

Імкліва набліжаецца гадзіна «Х» для працаўнікоў дзяржаўных арганізацый — 1 чэрвеня. Менавіта да гэтага часу павінен завершыцца масавы перавод бюджэтнікаў і працаўнікоў дзяржпрадпрыемстваў на кантрактную сыстэму. Улады робяць усё патрэбнае, каб у той момант захлопнулася пастка над працоўнымі.

Працоўнае заканадаўства і органы, якія павінны сачыць за яго выкананьнем, цяпер адпачываюць. Між тым, выканаўчая ўлада ціха і мэтадычна робіць сваю справу — паведамляе працаўнікам аб неабходнасьці заключыць кантракты і ў месячны тэрмін іх падпісаць. Масавая сьвядомасьць млява рэагуе на зьнішчэньне свабоды ў выбары працы, на тое, што ўсё грамадзтва трапляе ў залежнасьць ад дзяржаўнай бюракратыі. У Беларусі сёньня — як у той нямецкай прыпавесьці, калі думалі, што рэпрэсуюць габрэяў, камуністаў, суседзяў і спыняцца, але не рэпрэсуюць простага бюргера.

Тое, што ў цывілізаваных краінах зьяўляецца добрай справай, — высокая аплата па кантракце і гарантаваньне правоў і свабод — у Беларусі стане кавадлам, на якім раструшчаць усе грамадзянскія правы беларусаў, а таксама парасткі палітычнага плюралізму. Кантрактная сыстэма пабеларуску — гэта максымум правоў бюракратыі і мінімум працоўным.

Ніводзін кантракт не прадугледжвае павышэньня тарыфнай стаўкі і датковых дзён водпуску, бо «чэсныя» дэпутаты ППРБ не прадугледзелі гэтага ў прынятым бюджэце на 2004 г. Але калі працаўнік на працягу году будзе адстойваць свае правы на працы або, напрыклад, ня пойдзе на датэрміновае прымусовае галасаваньне, зь ім зараз можна будзе проста не працягнуць кантракту. І ніякі прафсаюз, ніякі суд не абароніць яго.

І ў маўклівых ягнят працоўных ператвараюць са згоды Фэдэрацыі прафсаюзаў. Ведаючы ўсё прававое бязьмежжа масавай кантрактнай сыстэмы, галоўнае прававое ўпраўленьне Рады ФПБ выдала Мэтадычныя рэкамэндацыі прафорганам па захаваньні законных правоў і інтарэсаў работнікаў пры пераводзе на кантрактную форму найму. Сэнс гэтых рэкамэндацый: няхай шараговыя арганізацыі змагаюцца з прававым бязьмежжам самі.

Прафсаюзная бюракратыя сарамліва апускае вочы, ухіляючыся ад абароны правоў працоўных. Вось, напрыклад, заключаецца Пагадненьне паміж Міністэрствам адукацыі ды Беларускім прафсаюзам работнікаў адукацыі й навукі на 2004—06 гады, і ў ім узгадняецца пазыцыя, што кантракты заключаюцца адпаведна Дэкрэту №29 «пры наяўнасьці фінансавай магчымасьці, якая забясьпечвае ўмовы выкананьня кантракту» (п. 4.4.7.). Затое ў праектах кантрактаў масава адмяняецца выплата авансаў, што парушае Працоўны кодэкс.

У гэтай сытуацыі, каб ня трапіць у пастку, працоўныя павінны адмаўляцца ад падпісаньня кантрактаў, зьвяртаючыся ў пракуратуру, суд, вышэйшыя інстанцыі. Падаючы туды матываваныя заявы пра невыкананьне наймальнікам патрабаваньняў заканадаўства аб гарантыях па кампэнсацыі пагаршэньня прававога становішча і адсутнасьці абгрунтаваных вытворчых, эканамічных і арганізацыйных прычын для кантракту. Прафсаюзам жа сьлед узначаліць барацьбу супраць масавай кантрактызацыі краіны, а не абслугоўваць інтарэсы наймальнікаў.

**17 сакавіка Прафсаюз работнікаў радыёэлектроннай прамысловасьці мае ладзіць у сталіцы пікет пратэсту супраць масавага пераводу на кантрактную сыстэму. Адпаведную заяўку падаў яго старшыня Генадзь Фядыніч.**

# Андрэй Хадановіч: Мае вершы як лісты шчасьця



**«Для мяне сьмецьця не існуе. У мяне пытаюць, ці шаную я клясыкаў, ці зьдзекуюся зь іх. Найперш шаную, а толькі потым сьмяюся. Хто ж вінаваты, што мая пэрсанальная дошка пашаны часам так нагадвае карыкатуру?» Карэспандэнт «НН» гутарыць з аўтарам «Лістоў з-пад коўдры».**

**«НН»: Чаму «Лісты з-пад коўдры»? Ці добры гэта густ — перадражніваць Каліноўскага?**

**Андрэй Хадановіч:** Гэты назоў узьнік, калі рыхтаваўся ўкраінскі пераклад гэтага зборніка. Ён выйшаў раней за беларускі. Яму бракавала глябальнай «фішкі», і тады ўзьнік гэты назоў. Гэтая адсылка да Каліноўскага прамаўляе пра новую генэрацыю творцаў, якія гавораць не ад нейкага зьбіральнага «мы» (народ, нацыя, рух, адраджэнцы й да т.п.), а ад сябе саміх. Якія ня сеюць разумнага, добрага, вечнага, бо з гэтым лепш спраўляюцца сьвятары, навукоўцы, дыктары БТ... Гэта голас цалкам прыватнага чалавека, які ня вучыць жыць, бо сам ня ведае, як гэта робіцца. Вядома, кожным тэкстам аўтар спрабуе адказаць на глябальныя пытаньні, але гэты адказ слушны толькі ў пэўны момант, а абсалютных слушнасьцяў, здаецца мне, не бывае.

Ліст з-пад коўдры, як мэтафара паэзіі, — гэта такі сабе ліст шчасьця, які ты атрымліваеш, перапісваеш, рассылаеш па дваццаці адрасох, і будзе табе вялікае шчасьце! Нармалёвы культуртрэгер мусіць рассылаць такія лісты шчасьця (натуральна, нікога не абцяжарваючы перапісваньнем). Цяпер кампутары, і ня трэба нічога перапісваць. Задача й прыемнасьць — ствараць і пашыраць. Ня толькі ж гербалайфу памнажацца! Можна памнажаць усё тое радаснае, крэатыўнае й на сёньня экзатычнае, што робіць чалавека чалавекам, а пасьля ўжо беларусам, інтэлектуалам, паэтам, паштаром шчасьця.

Працяг на старонцы 12.

Усё пачалося з гэтага сходу. Суполка БРСМ пераходзіць у «Зубр»: «Годзе лгаць самім сабе!» На трыбуне — Сасім.



PHOTO.BYMEDIA.NET

# Сасім назусім

Працяг са старонкі 1.

Улада абмяжоўваецца запалохваньнем. Улада сама баіцца? А мо ў глыбіні душы салідарная?

2 лютага сябры суполкі БРСМ Баранавіцкага каледжу лёгкай прамысловасьці бальшынёй галасоў (58 «за», 6 «устрымаліся») вырашылі далучыцца да незарэгістраванага руху «Зубр».

Неафіцыйнае спаборніцтва па «ахопе» моладзі, разгорнутае на загад найвышэйшага кіраўніцтва краіны, прывяло да таго, што ў пагоні за лічбамі некаторыя навучальныя ўстановы запісвалі ў «лукамол» 90% студэнтаў. Як некалі ў хрушчоўскія часы, калі ў камуністычны саюз моладзі заганялі нават вернікаў. А цяпер ужо ня тыя часы — куды ты каго загоніш. Дык прыдумляюць мэтады! Напрыклад, чытайце ліст з Маладэчна пра такую самую сытуацыю ў гэтым жа нумары на старонцы 10.

Так што стыхійны пратэст у баранавіцкім каледжы ня быў нечаканы. З такімі самымі ідэямі носяцца студэнты ў розных гарадах. Толькі што ў іншых ВНУ і тэхнікумах не знаходзіцца такіх завадатараў, як Мікіта Сасім.

Дэманстратыўны пратэст ня мог ня выклікаць рэакцыі начальства.

**Серада.** Першы сакратар БРСМ Міхаіл Арда тэлефануе першай сакратарцы Баранавіцкага гаркаму арганізацыі Алене Клішэўскай. Тым часам у горад прыехаў галоўны камсамолец вобласьці. У каледжы апэратыўна склікаецца новы, «правільны» сход БРСМ, на якім прысутнічаюць першыя сакратары вобласьці й гораду, а таксама кіраўніцтва навучальнай установы. Мерапрыемствам кіруе асабіста Клішэўская, а дырэктар каледжу Аляксандар Ліс падлічвае галасы.

Мікіту Сасіму слова не даюць. Тады ён сыходзіць. У выніку яго здымаюць з пасады сакратара, а рашэньне аб далучэньні да «Зубра» анулююць. У падтрымку Сасіма не выказваецца ніхто. Чаму так, пытаемся ў Мікіты.

«Чалавек у залі было на дваццаць болей, чым трэба, — распавядае Мікіта. — Але тыя «дадатковыя» ніякага дачыненьня да БРСМ ня мелі — звычайныя навучэнцы каледжу. Сэнсу ісьці на сход «зубрам» не было — у такіх умовах мы ўсё адно аказаліся б у меншасьці. Калі тыя выступалі, адчувалася, што іх запужалі: прымусілі штосьці казаць, але менавіта што — патлумачыць не пасьпелі; людзі блыталіся. Дырэктар вінаваціў мяне ў тым, што я «ўсіх падмануў».

Сасім дзейнічаў абдумана. Зуброўцы сабраліся побач з каледжам, але прынялі рашэньне ў залю не заходзіць. «Каб дарма людзей не сьвяціць».

Каля каледжу дзяжурылі ня толькі маладзёны. На старым бруку вуліцы Савецкай тырчэлі і тры міліцэйскія «козлікі» — гэткі апошні аргумэнт.

М. Арда ў інтэрвію радыё «Свабода» адмаўляў, што ў сувязі з падзеямі ў Баранавічах яго выклікалі ў Адміністрацыю прэзыдэнта: «Гэта ўсё хлусьня. Усе гэтыя дзеячы — і хартыі, і зубры, і бабры — яшчэ раз даказваюць, што яны акрамя хлусьні больш нічым не займаюцца. І выдаюць жаданае за сапраўднае. Самае крыўднае ва ўсім гэтым, што ў сваёй агоніі яны пачынаюць пераходзіць на падлеткаў і пачынаюць іх падманваць. У Беларусі, сярод людзей, такое ніколі не дазвалялася і не дапускалася. Яны падманулі падлеткаў і вывесілі на сваіх сайтах вось усю гэтую дэзінфармацыю. Гэтую абсалютную праванкацыю, якую яны задумалі». Паводле Міхаіла Арды, сход сяброў БРСМ Баранавіцкага каледжу лёгкай прамысловасьці быў нелегітымны, а вось пераабралі Сасіма цалкам дэмакратычна.

**Чацьвер.** На досьвітку ў горадзе зьяўляюцца некалькі дзясяткаў новых зуброўскіх надпісаў. Выкладчыкі каледжу разгортваюць тлумачальную працу. Пэдагогі распавядаюць пра сапраўдную сутнасьць бунтаўшчыкоў: «зубры» — гэта нэафашысты, сатаністы, раскопшчыкі магілаў. «Такія сапраўды ёсьць між вас?» — пытаемся ў Сасімавага сябра. Ён не адчувае нашай іроніі. «Добра, мы таксама не анёлы. Але на фіга лгаць? Мы проста супраць хлусьні і падману, што пануюць цяпер! Ня хочам больш маніць самім сабе! Вось і ўсё!»

Хлопцы й дзяўчаты з зуброўскімі значкамі дзяжураць ля ганку каледжу, раздаюць свае газэты. І калі выкладчыкі кажуць навучэнцам улюбёнае, як апазыцыя іх «выкарыстала і кінула», найбольш дзёрзкія паказваюць праз шыбу на двор з пытаньнем: «А ета хто?»

На Мікіту палююць журналісты. Радыё «Свабода» прапануе Сасіму ўзяць удзел у перадачы «Праскі акцэнт». Даведаўшыся, што суразмоўцам будзе Аляксандар Фядута, Мікіта — прынцыповы! — адмаўляецца. Сяргей Навумчык тэрмінова падшуквае іншых удзельнікаў.

**Пятніца.** Гарадзкія муры ўпрыгожваюць новыя зуброўскія надпісы — іхныя традыцыйныя, а таксама супраць «рэпрэсій». Іх хутка зафарбоўваюць, пакідаючы на мурах дамоў плямы. **У суботу** па абедзе менскіх зуброўцаў Афнагеля, Глеба Вязоўскага і Руслана Маразевіча, што прыехалі на падтрымку Сасіма, затрымліваюць міліцыянты ў цывільным.

Адбываецца гэта ў фае гатэлю «Гарызонт». За колькі хвілінаў хлапцоў зь дзіўнымі пытаньнямі запыніла кабета. Як высьветліцца пасьля, супрацоўніца гарвыканкаму. Затрыманым заяўляюць, што іх падазраюць у крадзяжах, якія быццам бы адбыліся ў гатэлі. Сьведкам затрыманьня робіцца адзін з журналістаў. Такім чынам, справа робіцца вядомай «зубрам».

Да будынку міліцыі сьцягваецца моладзь з зуброўскімі значкамі, уціскаецца ў пастарунак. Зь белай «Лады» выходзіць начальнік міліцыі й выганяе зуброўцаў на ганак. Двое «пятнаццацісутачнікаў» дзяўбуць ля пастарунку лёд, жартуюць з «ахламонамі».

Потым да «зуброў» выходзіць чалавек у цывільным, прапануе дапамогу. Напрыклад, сустрэцца з затрыманымі сябрамі. Прычым пусьціць да іх згаджаецца толькі аднаго. Паказвае пальцам на першага-лепшага хлопца ў чырвоным каптуры: «Ці ён, ці ніхто!» Таму «зубру» тэрмінова перадаюць мабільнік, і ён зьнікае за дзьвярыма. А праз якія пяць хвілін пад радасныя воклічы выходзіць затрыманая тройка — якраз скончыліся тры гадзіны, адведзеныя на затрыманьне. Сустрэча азмрочваецца паведамленьнем, што ніхто зь імі не сустракаўся. Выпусьціўшы адных, міліцыянты затрымалі іншага.

Сябры «Чайкі», дарэчы, сядзелі побач — недалёка ад сёньняшняга пастарунку на Чкалава знаходзілася вядомая турма «Крывое кола». Праз яе прайшлі й юнакі з Саюзу беларускіх патрыётаў з Навагрудку...

«Зубры» не разыходзяцца, цярпліва чакаюць на свайго сябра ля ўваходу ў пастарунак. Паралельна раздаюць газэты і ўлёткі. За што адразу ж патруль затрымлівае Мікіту Сасіма. Зь яго бяруць тлумачэньне, складаюць пратакол і адпускаюць. А «чырвонага каптура» вызваляюць роўненька праз тры гадзіны.

Допыт затрыманых здымалі на відэа, падчас вобшуку хлапцоў распранулі да маек з выявамі «Зубра», корпаліся ў заплечніках, гарталі нататнікі ды скапіявалі на свой кампутар здымкі зь лічбавай камэры. Пры канцы начальнік крымінальнага вышуку ўзяў пахвіліннае тлумачэньне аб дзейнасьці за дзень.

**У нядзелю і панядзелак** 8 сакавіка зуброўскія ўлёткі расклееныя па ўсім цэнтры Баранавіч. Камунальныя службы ў сьвяты не працавалі, і агітацыя правісела цэлы дзень. Зьдзерлі яе толькі зь дзьвярэй гарвыканкаму. Ізноў затрыманьні. Усяго праз пастарунак праходзяць 15 чалавек. На іх складаюць пратаколы за парушэньне артыкулу 167-10 КаАП (дзеяньні ад імя незарэгістраванай арганізацыі).

Канфлікт у каледжы нямала раздражняе ўлады. Праўда, гарадзкія СМІ пра яго пакуль не паведамлялі. Нумары недзяржаўных выданьняў яшчэ ў друкарні, а падуладныя «Наш Край» ды тэлестудыя «Інтэкс» не атрымалі, відаць, адпаведнага загаду.

Палітычныя партыі ў канфлікт ня ўблытаныя. Самі «зубры» ня вельмі жадаюць нейкай ад іх дапамогі. Гэта справа моладзі, супрацьстаяньне «Зубра» і БРСМу ня ваша справа, кажуць яны. Шматлікія палітыкі выказвалі жаданьне прыехаць у Баранавічы, але ніводзін пакуль не прыехаў. Ізноў ім не стае рэакцыі. Не баксёры!

Некаторыя сябры мясцовых партый, аднак, ня вельмі задаволены зуброўскім, як яны кажуць, «фальстартам». Яны лічаць, што заўчаснае прыцягненьне да Баранавіч увагі пашкодзіць на выбарах. Чакай цяпер узмоцненага кантролю зь Менску! Нешта падобнае ўжо было ў 2000 г. пасьля пасьпяховага байкоту, наракаюць між сабою. Вось такі настрой-расстрой.

Але што можа быць вашай перамогай, пытаемся ў Афнагеля. Іх перамога — паперка аб перавыбарным сходзе супраць Сасіма. А ваша? Графіці? Улёткі? І што? «Удзел новых людзей і будзе псыхалягічнай перамогай, — Яўген упэўнены, нібы рэвалюцыянэр з Грамады 100 гадоў таму. — Ідэйна з каледжу ў «Зубры» працуюць цяпер дваццаць. А да падзей не было нікога».

**Руслан Равяка,**
**Агата Ступакова,**
**Мікола Бугай,**
**Баранавічы—Менск**

## «Саўбелія» задарма

У газэтныя шапікі нашага гораду, а іх 13, дзяржаўныя газэты і часопісы паступаюць тоўстымі стосамі — нібы дровы з двара клапатлівага селяніна ў хату. Першынство па асобніках трымае «Советская Белоруссия», асабліва суботнімі «таўстухамі» на 32-х старонках, цана якіх, як і чатырохстароначнага выпуску, — 180 рублёў. Вось і «клююць» на яе тыя, хто лічыць кожны свой рубель зь мізэрнага заробку ці ня надта вялікай пэнсіі. Тым ня менш, 250—300 асобнікаў «СБ» штомесячна застаюцца ў шапіках непрададзенымі, а яшчэ столькі ж — іншых дзяржаўных выданьняў. Непрададзеныя асобнікі, зь ведама УП «Аблсаюздрук» і рэдакцыяў, адпраўляюць у бібліятэку цэнтральнай раённай бальніцы, а адтуль разносяць па палатах і аддзяленьнях — бясплатна. Гэткі ідэалягічны «прыварак» да ня надта багатага мэню бальнічнай кухні. А вось нерэалізаваным незалежным газэтам шлях туды закрыты: у канцы месяца іх вяртаюць на склад «Аблкнігагандлю», далей ад масавага чытача. Каб ён верыў таму, што пішуць прыпаркаваныя каля дзяржаўнай кармушкі журналісты.

## Лёс «Першамаю»

Некалі славуты на Случчыне калгас «Першае мая» быў створаны ў 1929 г., пасьля вайны яго ўзначаліў ужо немалады Васіль Козел. Адпрацаваў ён на гэтай пасадзе аж 24 гады, яму першаму са старшынь калгасаў раёну ў 1966 г. было прысвоена званьне Героя сацыялістычнай працы. І было за што: па ўсіх паказчыках гаспадарцы ў 50—60-я не было роўні. І не выпадкова: вакол 13 вёсак, а ў тыя гады вёскі яшчэ былі людныя, рабочай сілы хапала, хоць моладзь і ўцякала зь іх у гарады ад прыгоннай працы. Здаў свае паўнамоцтвы В. Козел толькі на 78-м годзе жыцьця, а пражыў 90. І наўрад ці думаў на схіле веку, што яго хваленая гаспадарка стане праз дваццаць зь лішкам гадоў нерэнтабэльнай. Што з трох сельскіх школ застанецца толькі адна, астатнія дзьве ў вялікіх (пад 200 двароў) вёсках зачыняцца празь недабор вучняў нават у малодшыя клясы.

Нядаўна раённыя ўлады мусілі прымаць рашэньне аб лёсе «Першамаю». Сельскагаспадарчы вытворчы каапэратыў «Слуцкая ніва» (новая назва калгасу) рэарганізавалі ў адкрытае акцыянэрнае таварыства ды аб'ядналі з Слуцкім цукрова-рафінадным камбінатам — які пакуль застаецца адным зь нямногіх высокарэнтабэльных прадпрыемстваў гораду. Ён выдзеліць слабой гаспадарцы зь мільённымі запазычанасьцямі грашовыя інвэстыцыі, толькі мала веры ў сялян-пэнсіянэраў у аддаленых за 10—15 кілямэтраў ад гораду вёсках, што чарговая адміністрацыйна-камандная задумка здольная іх жыцьцё зрабіць лягчэйшым. Вёска даўно чакае карэнных рэформаў, на якія вярхі пакуль нерашучыя.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

## Віктарына да Дня Волі

Баранавіцкая рада Партыі БНФ ладзіць віктарыну, прысьвечаную Дню Волі. Галоўны прыз — CD-плэер. Узяць удзел у ёй могуць школьнікі, студэнты і працоўная моладзь гораду й раёну, не старэйшыя за 20 гадоў. Патрэбна толькі адказаць на шэсьць пытаньняў, прысьвечаных БНР, да 20 сакавіка і даслаць адказы на адрас: вул. Леніна, 1-31, 225320, Баранавічы. Даведкі праз т.: (0163) 41-24-30.

**Пытаньні віктарыны:**

1. Назавіце прозьвішчы людзей, якія стаялі ля вытокаў БНР, а таксама тых, хто ўвайшоў ва ўрад БНР і іх пасады ва ўрадзе.
2. Што такое Ўстаўныя граматы БНР? Асноўныя пастуляты Ўстаўных грамат. Што самае галоўнае, жыцьцевызначальнае для Беларусі было выказана ў трэцяй Устаўной грамаце?
3. Назавіце некалькі прыкладаў таго станоўчага, што пасьпеў зрабіць урад БНР у вайсковым будаўніцтве, культуры, міжнародных зносінах? Якая сувязь існавала паміж утварэньнем БНР і Слуцкім збройным чынам 1920 г.?
4. Якім чынам была прыпынена дзейнасьць БНР?
5. Якія краіны прызналі БНР?
6. Пералічыце прозьвішчы тых, хто на працягу 79 год узначальваў урад БНР у эміграцыі і хто сёньня зьяўляецца старшынёй Рады БНР?

**Равяка Руслан, Баранавічы**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# «Хрыстафор»? А не датычны!

**Розьніца паміж «Хрыстафор-клірынгам» і пірамідамі кшталту «МММ» была толькі ў тым, што кліентамі «Хрыстафор-клірынгу» былі не асобныя грамадзяне, а дзяржаўныя прадпрыемствы Беларусі. Фірма дапамагала апошнім збываць вэксалі беларускага прадпрыемства «Белтрансгаз».**

Мастацкі кіраўнік тэатру «Хрыстафор» Яўген Крыжаноўскі абвяргае падазрэньні ў датычнасьці да круцельстваў з вэксалямі «Белтрансгазу», якія ажыцьцяўляла фірма «Хрыстафор-клірынг». Я.Крыжаноўскі быў сузаснавальнікам фірмы, але, паводле ягоных словаў, ня ўмешваўся ў яе дзейнасьць.

Вэксаляў «Белтрансгазу» за 2001—2004 г. было выпушчана столькі, што іх каціроўкі на біржы зьнізіліся на траціну. «Хрыстафор-клірынг» жа выкупляў вэксалі амаль па кошце наміналу. Аднак грошы абавязваўся выплаціць «пазьней».

На гэта спакусіліся дзясяткі ўнітарных прадпрыемстваў і акцыянэрных таварыстваў. Грошай за перададзеныя кампаніі вэксалі яны да сёньня не сыскалі.

Агульныя прэтэнзіі да «Хрыстафор-клірынгу» складаюць сотні мільёнаў рублёў. Маёмасьць фірмы і тэатру арыштаваныя, кіраўнік «пірамiды» Сяргей Купецкі ўцёк у Расею.

Я.Крыжаноўскі заяўляе, што ні ў чым не вінаваты і сам пацярпеў з прычыны сваёй даверлівасьці. Паводле Я.Крыжаноўскага, С.Купецкі паабяцаў дафінансоўваць сатырычны тэатар «Хрыстафор». За гэта трэ было толькі падпісацца пад дакумэнтамі аб заснаваньні фірмы і даць ёй імя. А пра тое, што Купецкі раней быў пад судом, акторы ня ведалі, сьцьвярджае Я.Крыжаноўскі. «Сяргей Купецкі ўцёк у Расею і там ганьбіць тэатар: ён жа ўцёк зь пячаткай фірмы, на якой стаіць імя «Хрыстафор», — скардзіцца актор у перапынку паміж здымкамі чарговага гумарыстычнага сюжэту для БТ. Дзейнасьць комікаў не спыняецца. Яны здымаюцца ў «Аншлягу» на канале РТР і Першым нацыянальным канале ў Менску.

**МБ**

## ПРАЦЭСЫ ТЫДНЯ

**Чатыры гады зьняволеньня атрымаў капітан расейскага войска Алег Весялоўскі.** 10 сакавіка ён быў прызнаны вінаватым у кантрабандзе выбуховых рэчываў. Затрымалі афіцэра ў Гудагаі на цягніку Санкт-Пецярбург—Калінінград з тратылавымі шашкамі і патронамі да «калаша». На працэсе капітан тлумачыў, што зьбіраўся «наладзіць фаервэрк з нагоды прыезду ў адпачынак».

**27-гадовы беларус Аляксандар быў засуджаны судом мястэчка Люнэбург, што непадалёк ад Гамбургу, на 8 гадоў пазбаўленьня волі.** Аляксандар разам з двума іншымі жыхарамі Беларусі абрабаваў некалькі банкаў на поўначы Нямеччыны на суму 100 тыс. эўра з дапамогай цацачнага пісталета. Ён атрымаў максымальны тэрмін. Гэты прысуд быў расцэнены як занадта жорсткі мясцовай газэтай «Hamburger Abendblatt». Размова зусім не ідзе пра нейкія асаблівыя сымпатыі. Проста немцы параўноўваюць справу Аляксандра зь іншай справай, якая разглядалася Луюнэбурскім судом у той жа дзень. Другі злачынца, 44-гадовы немец, атрымаў толькі 3 гады зьняволеньня за сэксуальныя дамаганьні да непаўналетніх.

**СМ; БелаПАН**

## ХРОНІКА АПАЗЫЦЫІ

Гарадзенскі мастак **Зьміцер Іваноўскі** асуджаны на 10 сутак за арганізацыю мітынгу прадпрымальнікаў, хоць на ім ён не прысутнічаў. У залі суду 3 сакавіка мастак абвясьціў галадоўку на знак пратэсту. 4 сакавіка Ленінскі раённы суд Менску пастанавіў пакінуць актывісту ліквідаванага Праваабарончага цэнтру «Вясна» **Ўладзімеру Лабковічу** штраф у 10 базавых адзінак за непадпарадкаваньне органам міліцыі падчас ліквідацыі арганізацыі. Папярэдні прысуд з такім самым штрафам быў адменены, бо тады падсуднаму не далі магчымасьці карыстацца перакладчыкам. Цяпер Лабковічу давядзецца даплаціць, бо павялічыўся памер базавай адзінкі. 5 сакавіка каля прахадной Менскага аўтазаводу падчас раздачы ўлётак «Пяцёркі плюс» затрыманы актывісты АГП **Віталь Рымашэўскі, Андрусь Козел, Кірыла Ігнацік і Сьвятлана Каралёва.** На С.Каралёву ў Заводзкім РУУС склалі пратакол за распаўсюд друкаванай прадукцыі. 5 сакавіка Магілёўскі гарвыканкам ня даў старшыню Свабоднага прафсаюзу прыватных прадпрымальнікаў Магілёва **Сяргею Фаміну** і кіраўнікам тамтэйшых арганізацыяў АГП і Партыі БНФ **Уладзімеру Шанцаву і Рыгору Костусеву** дазволу на мітынг. 6 сакавіка яны меліся пратэставаць супраць росту тарыфаў на камунальныя паслугі, беспрацоўя. Арганізатары зьбіраюцца абскарджваць адмову ў судзе. У Баранавічах былі затрыманыя актывісты «Зубра» **Дар'я Малдаванава** і **Глеб Вязоўскі**, 7 сакавіка міліцыянты затрымалі яшчэ **Аляксея Контара** і **Мікіту Сасіма**, якіх абвінавацілі ў дзейнасьці ад імя незарэгістраванай арганізацыі, а таксама **Яўгена Афнагеля, Г. Вязоўскага і Руслана Маразевіча. М. Сасіма**, **Насту Васіленка** і **Аляксея Ляўковіча** затрымалі 8 сакавіка. 9 сакавіка падчас раздачы ўлётак былі затрыманыя **М. Сасім,** а таксама сябры суполкі **Кацярына Банкевіч** і **Андрэй Чыж**, на якіх склалі пратакол за дробнае хуліганства. Затрыманых не адпусьцілі да суду, а пакінулі ў камэры: 10 сакавіка М. Сасіму прысудзілі 10 сутак арышту, А. Чыжу — 7, непаўналетняй К. Банкевіч яшчэ не судзілі. У Горадні 8 сакавіка невядомыя зьбілі прафсаюзнага актывіста **Івана Романа.** Навапалацкага праваабаронцу **Зьмітра Салаўёва** 9 сакавіка наведалі прадстаўнікі падатковай інспэкцыі для праверкі «дзейнасьці, зьвязанай з прыёмам наяўных грашовых сродкаў ад пакупнікоў (кліентаў), з вытворчасьцю прадукцыі, выкананьнем работ, аказаньнем паслугаў», хаця падобнай дзейнасьцю ён не займаецца. Падчас раздачы ў Менску газэты «Супраціў» і ўлётак з інфармацыяй пра падзеі ў Баранавічах былі затрыманыя актывісты «Зубра» **Любоў Кучынская, Наста М., Раман Казакевіч:** дзяўчат адпусьцілі адразу, а з Казакевіча ўзялі тлумачэньні ў апорным пункце.

**АШ**

# Вялікія гульні вакол спорту

Спорт у Беларусі — адзін з элемэнтаў дзяржаўнае палітыкі. Пацьверджаньне таму — штогадовая «Менская лыжня», якая зьбірае ўсё кіраўніцтва краіны незалежна ад гадоў ды майстэрства. Цяжка прыдумаць лепшы сродак падвышэньня рэйтынгу, чым дэманстрацыя клопату пра здароўе нацыі ды міжнародную вядомасьць краіны. Спартовыя праграмы на тэлебачаньні маюць самыя высокія рэйтынгі, а спартовых зорак ведаюць лепш за любога палітыка. Нездарма чалавекам 2003 году ў Латвіі стаў футбаліст Марыс Верпакоўскіс, чые трапныя стрэлы па брамках супернікаў дазволілі нацыянальнай камандзе краіны трапіць на першынство Эўропы.

Абраньне кіраўніка дзяржавы ў траўні 1997 г. прэзыдэнтам Нацыянальнага алімпійскага камітэту (дарэчы, НАК — гэта, напэўна, адзіная структура, дзе захавалася назва пасады «прэзыдэнт») было ўспрынятае як маленькая PR-акцыя. Маўляў, прэзыдэнту спатрэбілася нагода, каб паехаць на зімовыя гульні ў Нагана'98. Тым больш што ранейшы кіраўнік НАК **Уладзімер Рыжанкоў** незадоўга перад тым памёр, «зганяць» з пасады нікога не давялося. І хто мог тады падумаць, што кіраўнік дзяржавы праб'е дарогу сваім падначаленым да вяршыняў спартовае вэртыкальнае лесьвіцы?

Так, у 1999 г. на пасаду кіраўніка Беларускай фэдэрацыі футболу (БФФ) быў абраны **Рыгор Фёдараў**, чыё жыцьцё было зьвязана ў першую чаргу з грамадзянскай авіяцыяй. Ужо тады гэта выклікала незадавальненьне асобных прыхільнікаў гульні №1. Варта згадаць шматлікія судовыя разборкі між Фёдаравым ды найбуйнейшым спартовым выданьнем краіны газэтаю «Прессбол».

А 20 сакавіка 2003 г. у БФФ ізноў зьмяняецца кіраўнік: старшынём стаў дзяржсакратар Рады Бясьпекі **Генадзь Нявыглас**. Умяшаньне дзяржавы ў справы БФФ ледзь не прывяло да міжнароднай ізаляцыі беларускага футболу, вось толькі хто тады пра яго думаў?

Цяпер цяжка знайсьці высокага дзяржчыноўніка, які б ня меў свайго спартовага профілю. 21 лістапада 2001 г. Лукашэнка прызначае на пасаду міністра спорту і турызму **Юр'я Сівакова**, былога міністра ўнутраных спраў ды намесьніка кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта. **Леанід Ерын** кіруе біятлёнам, **Уладзімер Навумаў** — хакеем, **Урал Латыпаў** — конным спортам, кулявой стральбой — **Леанід Мальцаў**. Нават цяпер ужо былы рэктар БДУ **Аляксандар Казулін** узначальваў Беларускую фэдэрацыю фрыстайлу, між іншым, аднаго з самых папулярных відаў спорту ў Беларусі. А вось Беларускай асацыяцыяй каноэ кіруе «рэспубліканец» **Уладзімер Парфяновіч**. Хоць і апазыцыя, але трохразовы алімпійскі чэмпіён у гэтай дысцыпліне.

Навошта ўсё гэта прадстаўнікам дзяржаўнага апарату: каб усталяваць жорсткі кантроль альбо проста дзеля дэманстрацыі дзяржаўнага клопату пра спорт? Пасьля зьмены ўлады ў спорце Беларусь не пачала перамагаць часьцей, а нашыя спартовыя школы — масава рыхтаваць чэмпіёнаў. Наадварот, заўважаецца тэндэнцыя прывозу «працоўнага матэрыялу» з-за мяжы.

Нядаўна Юрый Сівакоў выступіў у СМІ з крытыкай «Менскай лыжні»: маўляў, навошта прымусова выганяць на лыжню ня самых прыдатных для гэтага людзей. А яшчэ міністар спорту выказаў занепакоенасьць «спажывецкім» стаўленьнем да спартоўцаў. Ці гэта спачуваньне спартоўцам, на здароўі якіх хтосьці нажываецца, ці перастрахоўка перад Алімпіядай у Атэнах? За год да гульняў НАК паставіў задачу ўзяць там 25 мэдалёў. А цяпер у гэта ня верыць нават сам міністар спорту.

**Зьміцер Казлоўскі**

# Стаўкі зробленыя

**Пасьля 14 сакавіка закончыцца рамантычная эпоха ня толькі ва ўзаемаадносінах вышэйшых кіраўнікоў Беларусі й Расеі. На зьмену прыйдзе рэальнасьць барацьбы ня проста за сувэрэнітэт, а за выжываньне нацыі.**

Калі гавораць пра безальтэрнатыўнасьць цяперашніх прэзыдэнцкіх выбараў у Расеі, міжволі ўзьнікае пытаньне — а ці былі яны калі-небудзь альтэрнатыўнымі? 12 чэрвеня 1991 году адбыліся ўсеагульныя выбары першага прэзыдэнта РСФСР, на якіх з агромністым адрывам перамог Барыс Ельцын. Хто цяпер памятае тагачасных яго спаборнікаў? Але тое было часткай грандыёзнага праекту «перабудова» — праекту, які ўсяго праз паўгоду пасьля абраньня гарбачоўскага «альтэр-эга» скончыўся распадам СССР і зьнікненьнем з гістарычнае мапы самой назвы РСФСР. Расейцы, праўда, самі не перабудаваліся і, абвясьціўшы сваю краіну простай спадкаемцай Савецкага Саюзу, працягвалі жыць так, быццам імпэрыя захавалася, толькі ў крыху зьменшаным варыянце і пад новай назвай — Расейская Фэдэрацыя. Але размова не пра тое.

У 96-м галасаваць расейскаму народу было прапанавана «сэрцам». Гэта азначала: альбо ты верыш у тое, што сэрца Ельцына вытрымае прэзыдэнцкую гонку, альбо ня верыш. Вось такі быў выбар, прынамсі ў расейскае эліты. Бо рэальнай альтэрнатывай былому кіраўніку Сьвярдлоўскага абкаму КПСС, кандыдату ў сябры палітбюро быў не камуніст Зюганаў, а целаахоўнікі новага цара, «сьмерды» Каржакоў з Барсуковым, якія прапаноўвалі выбараў не праводзіць і такім чынам зьдзейсьніць дзяржаўны пераварот.

Пераварот адбыўся праз тры гады, толькі ў мяккай форме, калі вярхоўны правіцель, пры ня надта добрым здароўі і, мабыць, няпоўнай памяці, перадаў дзяржаву са старэчых саслабелых рук у рукі фаварыта «царскае сям'і». Дзе-дзе, але ж у Расеі ўладу бяруць не дзеля таго, каб яе каму-небудзь адразу аддаць. «Маленькая пераможная вайна» ў Дагестане, зразумела, паспрыяла рэйтынгу наваяўленага прэзыдэнта. Але ж ня рэйтынгі робяць прэзыдэнтаў. Хутчэй наадварот...

Шукаць прыклады выбараў у ранейшай гісторыі Расеі было б дарэмным заняткам. Хіба толькі трэба лічыць «абраным» на сваю пасаду баярамі Міхаіла Раманава, які стаў царом амаль 400 гадоў таму.

Калі ўжо казаць пра дэмакратычныя выбары найноўшага часу, дык самы рэвалюцыйны выбар з усіх рэспублік былога СССР быў зроблены ў Беларусі. Ва ўсіх астатніх перамаглі прадстаўнікі былой савецкай эліты — альбо партыйнай (Аліеў), альбо гаспадарчай (Назарбаеў, Ніязаў), альбо інтэлектуальнай (Акаеў, Гамсахурдзія, якога потым зьмяніў «партыйны» Шэварднадзэ), ці ВПК (Кучма). У 1994-м у другім туры выбараў (тут мы ня будзем разглядаць прычыны паразы нацыянальна-дэмакратычнага руху ў першым) выбарцы адрынулі кандыдатуру тыповага прадстаўніка саўпартгасактыву Кебіча і прагаласавалі за... невядомасьць. Бо галасаваць за чалавека, які мае за плячыма чатырохгадовы дэпутацкі стаж і вопыт кіраўніка саўгасу, — гэта прыкладна тое ж, што гуляць у расейскую рулетку.

Тым ня менш, стаўкі былі зробленыя. Цяпер даводзіцца расплачвацца. Казыно новых ставак не прымае. Адзінае, што застаецца грамадзянам, якія жадаюць гуляць зь дзяржавай у азартныя гульні, — гэта купляць аблігацыі дзяржаўнае пазыкі. Рабіць уклады ў беларускіх рублях па-ранейшаму няма ніякага сэнсу. Беларусь так і не займела ўласнае нацыянальнае валюты, у адрозьненьне ад суседзяў. Праўда, пагроза «рублізацыі» (паводле аналёгіі з далярызацыяй) нацыянальнае эканомікі з боку Расеі быццам бы растала ў смузе няпэўнасьці. Але пагроза інкарпарацыі Беларусі засталася.

Пэрыяд рамантычных адносінаў першага беларускага прэзыдэнта з Крамлём — зь біцьцём бакалаў на шчасьце й пацалункамі — застаўся ў мінулым. Некаторыя лічаць, што пасьля выбараў Уладзімер Пуцін паквітаецца з беларускім кіраўніком і за кінутую «Балтыку», і за незгаворлівасьць у перамовах з «Газпромам», і за заявы пра «удар у сьпіну» й «тэрарызм». Як кажуць, мала не падасца. Але ж справа не ў асабістых адносінах двух кіраўнікоў, якія адзін аднаго, выглядае, на дух не выносяць. (Тут, мабыць, як у фізыцы, аднайменныя зарады адштурхоўваюць адзін аднаго.)

У нямецкай газэце Die Welt нядаўна быў апублікаваны артыкул, аўтар якога, Дзьмітры Трэнін, лічыць, што ў бліжэйшым часе адным з прыярытэтаў замежнае стратэгіі Расеі «будзе аднаўленьне ўплыву на рэспублікі былога СССР. Можна назваць гэтую стратэгію «апэрацыяй СНД». Яе мэтай ня ёсьць аднаўленьне Савецкага Саюзу. Усе дзяржавы СНД — магчыма, за выключэньнем Беларусі — захаваюць свой сувэрэнітэт. У абмен на эканамічную падтрымку Пуцін будзе настойваць на палітычнай саяльнасьці». У гэтым пасажы найперш уражваюць словы «за выключэньнем Беларусі». Чым выкліканая гэтая агаворка? Расейскі палітоляг, дарэчы, лічыць «апэрацыю СНД» беспэрспэктыўнай. ЗША, увогуле Захад, на яго думку, ня стануць мірыцца са спробамі Масквы аднавіць свой уплыў у ранейшых маштабах, асабліва ля межаў Эўрапейскага Зьвязу. Бо няма і ня будзе ў Расеі былой імпэрскай моцы.

А можа, Пуціну і не патрэбная ляяльнасьць Лукашэнкі менавіта з тае прычыны, што прэзыдэнт Расеі разьлічвае яшчэ ўбачыць Беларусь у складзе РФ. Варта прыгадаць у гэтай сувязі вядомыя прапановы наконт далучэньня Беларусі да Расеі на правах суб'екту фэдэрацыі (у крайнім выпадку — шасьці губэрняў). Калі гэты варыянт агучвалі апазыцыянэры з СПС, ён здаваўся абсурдным, нават сьмешным: як гэта, Беларусь будзе на правах Татарстану?! Але ж апошнім часам высокае маскоўскае чынавенства, а таксама дэпутаты адкрыта загаварылі пра адмену нацыянальна-адміністрацыйнага падзелу Расеі ўвогуле. Толькі нацыянальна-культурныя аўтаноміі, і ніякіх дзяржаўных утварэньняў, кшталту рэспублікі Татарстан, Чувашыі альбо Чачэніі. Так бы мовіць, сталінскі варыянт нацыянальнае палітыкі. Як некалі казалі бальшавікі, Сталін — гэта Ленін сёньня. А Пуцін — гэта Лукашэнка заўтра?

Што ў сёньняшніх умовах азначае для Беларусі «дзяржаўная ідэалёгія», заснаваная ня столькі на нацыянальных традыцыях і каштоўнасьцях, колькі на ідэях савецкае дзяржаўнасьці сталінска-брэжнеўскага ўзору, — тэма асобнае размовы. Пакуль ясна іншае. Пасьля прэзыдэнцкіх выбараў у Расеі рамантычная эпоха заканчваецца ня толькі ва ўзаемаадносінах вышэйшых кіраўнікоў абедзьвюх дзяржаваў. Час дэмагагічных заяваў наконт непарушнай дружбы і адзінства інтарэсаў братніх народаў альбо шызафрэнічных словаў пра «сувэрэнітэт у складзе саюзнай дзяржавы» мінае. На зьмену ідзе рэальнасьць барацьбы ня проста за сувэрэнітэт, а за выжываньне нацыі. Вось калі стане канчаткова ясным цана выбару, зробленага народам дзесяць гадоў назад.

**Віталь Тарас**



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

## ШТО Ў СЬВЕЦЕ РОБІЦЦА

### У Кіеве за свабоду слова

Некалькі дзясяткаў тысячаў чалавек узялі ўдзел у дэманстрацыі 9 сакавіка ў Кіеве. На дзень нараджэньня Тараса Шаўчэнкі традыцыйна ўскладаючыя кветкі па помніка яму насупраць унівэрсытэту. Сёлета пасьля цырымоніі прыхільнікі апазыцыі прайшлі праз цэнтар сталіцы пад лёзунгамі «Свабоды слова!».

### Пратэсты францускіх навукоўцаў

У адстаўку падалі 2000 кіраўнікоў навуковых лябараторый Францыі. Гэта пратэст супраць недафінансаваньня навукі. Навукоўцы крытыкуюць скарачэньне бюджэтных выдаткаў на навуку. («НН» пісала пра гэта ў №6.) Пэтыцыю пратэсту падпісалі 66 тыс. са 105 тыс. навукоўцаў, што працуюць у дзяржаўных НДІ.

82% французаў падтрымліваюць рух навукоўцаў.

### Мільярдэры ў турме

Кожны чацьверты расейскі мільярдэр... сядзіць у турме або знаходзіцца пад сьледзтвам. У сьпіс мільярдэраў часопісу «Форбс» сёлета трапіла 25 грамадзянаў Расеі. На чале групы 587 найбагацейшых людзей сьвету застаюцца Біл Гейтс, багацьце якога ацэньваецца ў $46,6 млрд, і Ўорэн Бафэт — 42,9 млрд. Першы з расейцаў, Міхаіл Хадаркоўскі, які займае 16-е месца з 15-цю млрд, грэе нары «Матроскай цішыні» зь мінулага году.

**МБ**

# Паксасгейт

## Літоўскі ўрок для Беларусі

**Тое, што адбываецца ў Літве, для Беларусі важна з многіх прычынаў. І таму, што нашы народы сотні гадоў пражылі ў адной дзяржаве. І таму, што шасьцюстамі кілямэтрамі супольнай мяжы мы надзейна павязаныя на ўсю наступную гістарычную пэрспэктыву.**

**Справу Ралендаса Паксаса разгледзела адна камісія, потым Канстытуцыйны Суд, потым другая камісія, нарэшце, у мінулую пятніцу працэдуру імпічмэнту распачаў парлямэнт. А ў нядзелю экс-прэзыдэнт Валдас Адамкус прапанаваў скасаваць пасаду прэзыдэнта ўвогуле. Сутнасьць таго, што адбываецца, знаёмая для Беларусі. Пра гэта Сяргей Дубавец гутарыць зь віленскай журналісткай Тацянай Поклад.**



PHOTO.BYMEDIA.NET

**— Тацяна, даводзілася ня раз чуць, што ў Літве прэзыдэнта зьвінавачваюць і парлямэнт, і Канстытуцыйны суд, тым часам народ паспаліты не разумее — за што. Што такога нарабіў Раландас Паксас, каб яго ўсе так спалохаліся? Курсу краіны не мяняў. Хіба даў грамадзянства спонсару сваіх выбараў? Дык які ён тады прэзыдэнт, калі ня мае права нават на гэта...**

— Частка народу не разумее, за што абвінавачваюць кіраўніка краіны. Як сьведчаць апытаньні і рэйтынгі, гэта прыкладна палова ўсіх выбарцаў. Яны гатовыя падтрымаць прэзыдэнта. Аднак варта зьвярнуць увагу на тое, хто яны. Гэта, як правіла, людзі пэнсійнага веку зь невялікіх паселішчаў, зь невысокімі даходамі і невысокім адукацыйным цэнзам. (Акурат такія, што складаюць — паводле прызнанага стэрэатыпу — электарат Аляксандра Лукашэнкі.) Другая палова — маладзейшыя жыхары буйных гарадоў, што маюць вышэйшую адукацыю і даходы, большыя за 150 эўра на месяц, — гэтыя якраз разумеюць, у чым справа, і таму патрабуюць адстаўкі Паксаса.

**— Вось гэтыя дзьве часткі электарату: умоўна старэйшыя прыхільнікі сьветлага савецкага ўчора і ўмоўна маладзейшыя прыхільнікі эўраінтэграцыі. У Беларусі другія прынесеныя ў ахвяру першым. Прынамсі, папулісцкая рыторыка прэзыдэнта заўсёды другіх зьневажала і аж сьвяцілася бацькоўскім клопатам пра першых. Не скажу, што пачуў нешта падобнае з вуснаў Раландаса Паксаса, але публіка, якая зьбіраецца на мітынгі ў ягоную падтрымку, цалкам адпавядае вобразу змагароў за савецкае ўчора.**

— Аналітыкі кажуць, што Паксас утрымлівае свой сёньняшні рэйтынг найперш пасьпяховай абаронай. Кіраўнік цэнтру дасьледаваньня грамадзкай думкі і рынку Ўладас Гайдзіс піша, што гэтая абарона зводзіцца да аднаго сказу: у краіне ёсьць змова «дрэнных» палітыкаў, якія любымі сродкамі імкнуцца адправіць у адстаўку «добрага» прэзыдэнта. Для той часткі электарату, якая бароніць Паксаса, гэтага дастаткова, каб ісьці на мітынг пратэсту. Тым часам апанэнты Паксаса прыводзяць паўсотні аргумэнтаў для ягонага імпічмэнту, і той, хто задумаецца над гэтымі аргумэнтамі, як правіла, не пратэстуе. На мітынг ня йдзе.

**— Ёсьць яшчэ і такая «народная думка»: прэзыдэнта скідаюць, бо ён хоча «навесьці парадак», у выніку чаго іншыя важныя кіраўнікі могуць паляцець са сваіх пасадаў.**

— Перадвыбарная кампанія Раландаса Паксаса была распрацаваная і праведзеная на даволі высокім узроўні. Важнае месца займалі ў ёй лёзунгі пра навядзеньне парадку і змаганьне з карупцыяй.

**— Тое самае, з чым пачынаў і Аляксандар Лукашэнка ў Беларусі. Але ў Лукашэнкі ўсё выйшла так, як ён хацеў, а Паксас зараз жа сустрэў такія перашкоды, якія ўжо пагражаюць яму стратай самой прэзыдэнцкай пасады...**

— Ён умешваецца ў справы суб'ектаў гаспадараньня і тым самым хоча паказаць, што выконвае свае перадвыбарныя абяцаньні. Вось зусім нядаўна адзін з дарадцаў прэзыдэнта адправіўся ў горад Алітус, каб у тамтэйшым аддзеле дэпартамэнту дзяржбясьпекі забраць сакрэтныя дакумэнты адносна парушэньняў у конкурсе на прыватызацыю акцыянэрнага таварыства «Аліта», якое выпускае алькагольныя напоі. Тое, што прэзыдэнт запатрабаваў сакрэтную інфармацыю ад раённага кіраўніка бясьпекі без папярэдняй згоды кіраўніка Дзяржпэпартамэнту, зьяўляецца парушэньнем нават некалькіх законаў.

**— Кіраўніка Беларусі ў такой сытуацыі ўявіць напросту немагчыма. Ніхто ў Беларусі ня можа пакараць усенароднаабранага прэзыдэнта за парушэньне законаў. А ў Літве такі самы ўсенароднаабраны робіцца аб'ектам ня толькі крытыкі ў СМІ, але й працэдуры адлучэньня ад улады. Ну што гэта за прэзыдэнт!..**

**Варта тут яшчэ параўнаць і дачыненьні кіраўніка краіны са СМІ. Літоўскі калега Лукашэнкі мае толькі законныя паўгадзіны простага этэру на дзяржаўным радыё. Паўгадзіны на тыдзень... З шасьці тэлеканалаў у Літве толькі адзін дзяржаўны, дый той хутчэй на баку парлямэнту, а не прэзыдэнта. У Беларусі ўсе тэлеканалы служаць нават ня столькі прэзыдэнту, колькі той папулісцкай лёгіцы пра добрага кіраўніка і дрэнных усіх астатніх.**

**Але вернемся да літоўскага скандалу. Навошта прэзыдэнту Паксасу спатрэбілася, як кажуць аналітыкі, выкрадаць тыя сакрэтныя дакумэнты пра прыватызацыю гарэлачнага заводу ў Алітусе?**

— Называюць тры матывы, дзеля якіх ён мог гэта зрабіць. Мяркуюць, па-першае, што ў тых сакрэтных дакумэнтах маглі фігураваць асобы з прэзыдэнцкага атачэньня. Па-другое — каб паказаць, што змагаецца з самой «сыстэмай». Такі крок Паксаса будзе прывабны для ягоных прыхільнікаў. Трэцяя прычына — гэта спроба контратакі. Сакрэтныя матэрыялы незаконна апынуліся на стале ў прэзыдэнта дзеля таго, каб у людзей стварылася ўражаньне, што ініцыятарам імпічмэнту — дэпартамэнту дзяржаўнай бясьпекі і іншым палітыкам — ёсьць што хаваць ад народу.

**— Дапусьцім, цяперашні скандал у Літве пачаўся ад таго, што прэзыдэнту не ставала ўлады. Усенародны абраньнік не адчуў адэкватных паўнамоцтваў. Можа быць, прычына канфлікту — у гэтай неадэкватнасьці і нічога падобнага б не было, калі б прэзыдэнта выбіраў ня ўвесь народ, а парлямэнт? Як гэта адбываецца, напрыклад, у Латвіі.**

— Альбо — трэці варыянт — калі народ ведае пра паўнамоцтвы прэзыдэнта і не абірае таго, чые перадвыбарныя абяцаньні відавочна перавышаюць гэтыя паўнамоцтвы. Іншымі словамі, калі народ не спакушаецца на папулісцкія абяцаньні. І разумее, што гэта не ўваходзіць у функцыі прэзыдэнта. Менавіта на гэта спадзявалася літоўская інтэлігенцыя, адукаваная частка грамадзтва.

У мэдыях былі спробы шырэй тлумачыць, за што адказны прэзыдэнт у парлямэнцкай рэспубліцы: замежная палітыка, прызначэньне ўрадоўцаў... Аднак падчас апошніх прэзыдэнцкіх выбараў большасьць літоўскіх грамадзянаў прагаласавалі за таго, хто найболып абяцаў дзейнічаць у той сфэры, у якой прэзыдэнт непаўнамоцны. Прэзыдэнт не выконвае функцыяў пракурора альбо прэм'ер-міністра. Калі любы кіраўнік пачынае займацца тым, што не ўваходзіць у яго абавязкі, — гэта найперш азначае, што ён не дае рады сваім непасрэдным абавязкам.

**— Але што рабіць, калі народ выбраў маладога, энэргічнага і амбітнага прэзыдэнта? Якому не сядзіцца ў ягоным фатэлі сымбалічнага кіраўніка краіны. Паксас, які ганяе на матацыкле і зьяўляецца чэмпіёнам СССР у авіяцыйнай акрабатыцы, пры ўсім жаданьні ня ўлезе ў скуру здаволенага жыцьцём дзядулі, які піша мэмуары. У Беларусі права прэзыдэнта ўнікаць ва ўсё на сьвеце даўно стала няпісаным законам. Такі ўжо склаўся вобраз. І ў 2006 г. у Беларусі народ не прэзыдэнта будзе выбіраць, а новага Лукашэнку.**

— І амбітны дзяяч можа дамагчыся многага, і той жа народнай папулярнасьці, не перавышаючы прэзыдэнцкіх паўнамоцтваў. А народ, які верыць папулісцкім перадвыбарным абяцаньням кандыдата, у якога ўдала наладжаная перадвыбарчая кампанія, галасуе за яго не для таго, каб ён парушаў Асноўны закон краіны.

Але прэзыдэнт Літвы Р.Паксас абраў адваротны шлях, ад першых месяцаў прэзыдэнцтва ён дэманстраваў, што не абмяжуецца функцыямі, вызначанымі Канстытуцыяй. Пра намеры Р.Паксаса быць аўтарытарным лідэрам у Літве загаварылі пасьля таго, як ён пачаў займацца «не прэзыдэнцкімі справамі», а ягоныя дарадцы сталі ўмешвацца ў працу міністэрстваў. Тады ж літоўскія аналітыкі пачалі параўноўваць Р.Паксаса з аўтарытарным кіраўніком Беларусі А.Лукашэнкам. Стыль дзеяньняў Р.Паксаса называюць «звычайным лукашызмам».

Лукашэнка кіруе краінай праз указы, а Канстытуцыю зьмяніў так, каб яму не пярэчыла. Паксас і яго атачэньне адразу пасьля перамогі на выбарах абвесьцілі гэткую ж мэту.

Тое, што функцыі прэзыдэнта дакладна вызначаныя ў Канстытуцыі Літвы, не азначае, што краіне патрэбны слабы прэзыдэнт альбо неактыўны і непапулярны. У дэмакратычнай краіне ня можа быць пасады, якая б давала правы і абавязкі займацца ўсім, чым пажадаецца. Дыктатура і пачынаецца з таго, што існуе моўчкі прызнанае права любога начальніка на неабмежаваныя паўнамоцтвы. У постсавецкім грамадзтве людзям часта і не прыходзіць у галаву пацікавіцца, на што ня мае права іх кіраўнік. Тым болей калі гэта датычыць прэзыдэнта — ці можа быць нешта такое, на што кіраўнік дзяржавы ня мае права?! Так, можа быць, лічыць нямала людзей, прынамсі ў Літве.

**— І ў Беларусі такіх людзей нямала. Праўда, іх думка літаральна згвалтаваная яшчэ ў 1996 г. На рэфэрэндуме большасьць іх суайчыньнікаў на пытаньне, ці хочуць яны ведаць, куды ідуць грошы зь дзяржаўнага бюджэту, адказалі — не. Дзе ўжо цікавіцца паўнамоцтвамі прэзыдэнта, а тым больш ацэньваць, ці перавысіў ён іх, ці не. Аднак усё адно не магу ўявіць сабе, каб Лукашэнка ці Паксас паводзілі сябе неяк інакш. Можа быць, прэзыдэнт нагул непатрэбны ў такіх краінах, як Літва або Беларусь? Ці дыскутуецца такое пытаньне ў Літве?**

— Для постсавецкіх краінаў прэзыдэнт неабходны як цьверджаньне нацыянальнай дзяржаўнасьці. Прэзыдэнт — сымбаль нацыянальнай незалежнасьці, твар дзяржавы ў міжнародных дачыненьнях.

Пасьля стольких месяцаў скандалу звычайныя людзі заяўляюць, што іх засмучае дыскрэдытацыя не канкрэтных асобаў, але іміджу прэзыдэнта ўвогуле, ад чаго церпіць імідж Літвы.

**— Паспрабуем зразумець саму мэханіку — як парушае закон і перавышае паўнамоцтвы начальнік. Прэзыдэнт краіны — гэта ж таксама начальнік. І ў гэтым сэнсе ён, па вялікім рахунку, нічым не адрозьніваецца ад вахцёра ў студэнцкім інтэрнаце.**

**У Літве ў часе прэзыдэнцкага скандалу некалькі такіх начальнікаў пазбавіліся пасадаў. І сярод іх — кіраўнік памежнае службы краіны, які распарадзіўся без чаргі прапусьціць праз мяжу машыну сваёй знаёмай. Уяўляеце сабе выпадак? Начальнік памежнай службы ляціць з пасады за тое, без чаго ў пашыраным уяўленьні ён увогуле ніякі не начальнік. Тым больш што парушэньня закону ў згаданым выпадку не было — машына прайшла мяжу па ўсіх правілах. Толькі без чаргі.**

— Насамрэч гэта — працэдурнае парушэньне, злоўжываньне службовым становішчам. Генэрал А.Сангайла звольнены з унутранай службы за дыскрэдытацыю званьня і пасады. За тую ж самую пазыцыю, калі кіраўнік лічыць, што яму дазволена ўсё. Уявіце сабе, калі дырэктар школы пойдзе на кухню выпякаць катлеты. Гэта ня толькі працэдурнае перавышэньне паўнамоцтваў, але парушэньне правілаў санітарнага кантролю. Нідзе ў Эўропе кіраўнік дзяржаўнай службы аховы мяжы ня будзе прапускаць машыны без чаргі...

Напэўна Літва справіцца са сваім прэзыдэнцкім скандалам. Там ужо сёньня называюць гэты скандал цяжкім, але карысным урокам для краіны і народу. Зрэшты, Літва ў цэлым выказалася за свой эўрапейскі выбар і ўжо праз два месяцы стане паўнамоцным сябрам Эўразьвязу.

Што да Беларусі, дык 1996-ы, калі Вярхоўны Савет ініцыяваў імпічмэнт прэзыдэнта Лукашэнкі, ня стаў для нас ані досьведам, ані навукай. Нашая цяжкая і карысная навука наперадзе. Вяртаньню да вяршэнства закону для ўсіх без выключэньня начальнікаў альтэрнатывы няма.

# Слабы, але паважаны

## Прэзыдэнцкія выбары ў парлямэнцкай рэспубліцы Нямеччыне



AFP
**Хорст Кёлер, кандыдат ад ХДС-ХСС і лібэралаў**

**Некалі ў Нямеччыне прэзыдэнта абіралі на сем гадоў, ён адначасова быў галоўнакамандуючым і меў паўнамоцтвы адмяняць асноўныя грамадзянскія правы і выдаваць дэкрэты. Спатрэбілася 12 гадоў нацыянал-сацыялізму і сусьветная вайна, каб прыйсьці да ўсьведамленьня неабходнасьці абмяжоўваць прэзыдэнцкія паўнамоцтвы.**

Чарговыя прэзыдэнцкія выбары ў Нямеччыне адбудуцца 23 траўня. Але ня будзе ні агітацыі, ні выбарчых участкаў: права выбару прэзыдэнта ўскладаецца не на народ, а на яго паўнамоцных прадстаўнікоў — дэпутатаў бундэстагу і зямельных парлямэнтаў.

Прапанаваная кіроўнай партыяй сацыял-дэмакратаў і зялёнымі Гезынэ Шван мае шанцы стаць першай жанчынай на пасадзе фэдэральнага прэзыдэнта.

Гэтыя шанцы, папраўдзе, не найбольшыя: сацыял-дэмакраты цяпер ня надта папулярныя з прычыны пагаршэньня эканамічнай сытуацыі ў краіне. Яны прайгралі зямельныя выбары ў большасьці земель, а разам з гэтым страцілі большасьць у верхняй палаце парлямэнту — бундэсраце. Лягічна чакаць, што прэзыдэнтам стане прадстаўнік не «чырвона-зялёнага», а «чорна-жоўтага» лягеру. Аднак кандыдатка ад СПД і зялёных Гезынэ Шван сказала, што спадзяецца на прыхільнасьць некаторых сяброў гэтых партый. У такіх рэчах, на яе думку, галоўнае не партыйная дысцыпліна, а сама дэмакратыя.

60-гадовая Гезынэ Шван — з 1999 г. прэзыдэнтка Эўрапейскага ўнівэрсытэту «Віядрына» ў Франкфурце-на-Одэры. Унівэрсытэт вядомы сваім унёскам у інтэграцыю Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы. Сёлета ўнівэрсытэт адкрывае сваю навучальную праграму ў Менску на базе ЭГУ. Спадарыня Шван — прафэсарка паліталёгіі, свае навуковыя працы прысьвяціла марксізму, антыкамунізму і антыамэрыканізму, у апошні час — пытаньням дэмакратыі, палітычнай псыхалёгіі і палітычнай культуры. Заангажаванасьць у агульнаэўрапейскія пытаньні і антываенны рух яна вынесла з бацькоўскага дому: яе бацькі ў час фашыстоўскай дыктатуры належалі да падпольнага хрысьціянскага супраціву, хавалі ў сябе жыдоўскую дзяўчынку.

У партыі Шван карыстаецца аўтарытэтам крытычнай асобы. Падчас працы ў адным з камітэтаў у 1984 г. яна была зь яго выключаная — гэта адзіны выпадак у гісторыі партыі.

Каго ж прапануюць чырвона-жоўтыя? Перамовы пра кандыдатуру прэзыдэнта праводзіліся апазыцыйнымі партыямі ХДС, ХСС і Свабоднай дэмакратычнай партыяй (лібэралы) доўга. Кандыдат быў вылучаны кампрамісны — Хорст Кёлер. Узгадненьне адзінай кандыдатуры — гэта вельмі важны працэс, бо стратэгічна правільна абраная кандыдатура — залог посьпеху на наступных выбарах у бундэстаг і на пасаду бундэсканцлера. Тое, што ХДС, ХСС і СДП пагадзіліся, дае ім дадатковыя шанцы на выбарах фэдэральнага канцлера ў 2006 г.

61-гадовы Кёлер з 2000 г. узначальвае Міжнародны валютны фонд. Ён сябар ХДС, быў дзяржаўным сакратаром пры фінансавым міністры і дарадцам Гельмута Коля на міжнародных эканамічных форумах. У прыватнасьці, ён вёў перамовы пра фінансаваньне працэсу выводу савецкіх войскаў зь Нямеччыны, ствараў сыстэму пераходу ГДР у склад ФРГ і вёў перамовы з эўрапейскімі партнэрамі аб увядзеньні эўра.

Кёлер — гэта ўвасабленьне апазыцыі чырвона-зялёным (МВФ — пудзіла для антыглябалістаў) і адначасова знак абнаўленьня ў ХДС і ХСС, за якое выступае старшыня партыі Ангела Мэркель.

Прэзыдэнта Нямеччыны абіраюць на пяць гадоў. Прэзыдэнт мае права адбыць два тэрміны. Аднак цяперашні кіраўнік краіны Яганэс Раў адмовіўся прапаноўваць сваю кандыдатуру на паўторны тэрмін. Прэзыдэнт — прадстаўнічая фігура, усе ягоныя паўнамоцтвы абмежаваныя ўрадам і міністэрствамі. Ён прадстаўляе краіну на міжнародным узроўні; правярае законы на адпаведнасьць Канстытуцыі і падпісвае; прапануе, прызначае і звальняе фэдэральнага канцлера. Апошняе — фармальнасьць: канцлерам усё адно робіцца лідэр партыі ці кааліцыі, якая набірае большасьць на выбарах у бундэстаг. Калі ніводная кааліцыя не набрала абсалютнай большасьці, прэзыдэнт можа прызначыць канцлера альбо распусьціць парлямэнт і прызначыць новыя выбары. Яшчэ прэзыдэнт, у адпаведнасьці з рэкамэндацыямі ўраду альбо канстытуцыйных органаў, прызначае і звальняе міністраў і вышэйшых судзьдзяў. Толькі ў крайнім выпадку ён можа адхіліць нейкую кандыдатуру — так было, калі прэзыдэнт Любке адхіліў прапанаваную кандыдатуру судзьдзі з прычыны яго прыналежнасьці ў мінулым да нацыянал-сацыялістычнай партыі.

Звычайна фэдэральны прэзыдэнт — гэта самы паважаны і самы папулярны палітык. Магчыма, таму, што не прымае непапулярных рашэньняў. Наагул ніякіх рашэньняў не прымае. Прэзыдэнт проста пільнуе, каб ні ў чым не парушалася Канстытуцыя. Яго найгалоўная функцыя — мацаваньне народнага адзінства.

**Вераніка Дзядок**

# Пуцін на плякатах

## Інтэрнаўты аб прэзыдэнцкіх выбарах у Расеі

**Расейскае інтэрнэт-выданьне www.grani.ru зрэагавала на безальтэрнатыўную прэзыдэнцкую кампанію конкурсам палітычнага плякату. У журы ўвайшлі культавыя фігуры расейскае культуры, сярод іх карыкатурыст Андрэй Більжо, пісьменьнік Віктар Ерафееў, журналіст Арцём Троіцкі. Пераможцам стаў постэр «Ён выбіраў парадак», другое месца заняла «Яўка праваленая».**





















# Прэзыдэнталізм ці

**Канстытуцыйныя інжынэры, якія абралі парлямэнцкую сыстэму, выцягнулі для сваіх краінаў білецік у ЭЗ. А тыя, якія абралі прэзыдэнталізм, — білецік у Трэці сьвет. Можна цяпер нават ужо сказаць, калі Беларусь можна будзе афіцыйна лічыць краінай Трэцяга сьвету, — 1 траўня 2004 г., піша палітоляг Аляксандар Батура, што нарадзіўся ў Мядзеле, а цяпер выкладае ў Дублінскім унівэрсытэце.**

Можна бясконца спрачацца, якая сыстэма лепшая — парлямэнцкая ці прэзыдэнцкая. Штогод дзясяткі доктарскіх дысэртацый абараняюцца па гэтай тэме, у іх аналізуюць і параўноўваюць перавагі, скажам, «амэрыканскай» прэзыдэнцкай сыстэмы над італьянскай парлямэнцкай ці брытанскай «мажарытарнай» над францускай «паўпрэзыдэнцкай» або яшчэ якой іншай заходняй дэмакратычнай палітычнай сыстэмай.

Кожны па-свойму мае рацыю. І кожная сыстэма мае нешта адрознае ад астатніх, яна чымсьці лепшая ці горшая. Але аналіз такога кшталту мае сэнс толькі ў фармаце заходніх дэмакратый. Як я паспрабую паказаць трохі ніжэй, прэзыдэнталізм сапраўды мае пэўныя перавагі, але толькі ў выключных выпадках, і ўсе гэтыя выключныя выпадкі выпадаюць на сталыя заходнія дэмакратыі са сталай палітычнай культурай і панаваньнем закону. Ківаць на прэзыдэнталізм Амэрыкі ці Францыі і не зьвяртаць увагі на дзясяткі нестабільных, карумпаваных, недэмакратычных прэзыдэнцкіх сыстэмаў Лацінскай Амэрыкі, Афрыкі, Азіі ці Эўропы ў мінулы час ня ёсьць добрым прыкладам якаснага паліталягічнага аналізу.

З другога боку, не адзін прэзыдэнталізм вінаваты ў палітычных і эканамічных праблемах. Краіны, якія абралі прэзыдэнталізм, з самага пачатку маглі розьніцца ад былі «дэмакратычных», якія абралі парлямэнцкую форму кіраваньня. Ёсьць пэўныя хібы і ў парлямэнтарызьме. Але прэзыдэнталізм — больш небясьпечная форма кіраваньня, якая мае выразна адрозную ад парлямэнтарызму лёгіку развіцьця, іншы «рухавік», які вядзе да большай імавернасьці канфлікту, пераваротаў і дыктатуры.

## Пуцін ківае на Італію

Выбар сыстэмы залежыць ад таго, якія мэты і каштоўнасьці больш паважаюцца, больш запатрабаваныя ў пэўным грамадзтве. Другімі словамі, залежыць ад таго, што трэба максымізаваць у палітычнай сыстэме. Так, калі грамадзтву больш патрэбны кансэнсус, як мага большая рэпрэзэнтатыўнасьць усіх груповак грамадзтва, тады гэтаму грамадзтву трэба абраць тую ці іншую форму парлямэнцкай «кансэнсуснай» дэмакратыі накшталт скандынаўскай. Калі больш хочацца рашучасьці ў прыняцьці палітычных рашэньняў, дэмакратычнай адказнасьці і стабільнасьці, то трэба абраць пэўную прэзыдэнцкую сыстэму.

Сапраўды — і палітычная гісторыя Італіі таму прыклад — парлямэнцкая «кансэнсусная» форма кіраваньня можа быць рэпрэзэнтатыўнай, але вельмі неэфэктыўнай і безадказнай. Дзясяткі партыяў у парлямэнце спрачаюцца месяцамі над кожным законапраектам, парлямэнт бывае цалкам паралізаваны і ня ў сілах прыняць рашэньне. Выбарцы галасуюць, але ня ведаюць, які ўрад урэшце будзе кіраваць краінай, нават калі іхняя партыя набірае больш галасоў за астатнія.

Так, каб сфармаваць урад у парлямэнцкай дэмакратыі, патрэбная падтрымка паловы дэпутатаў у парлямэнце. Калі партыя не набірае 50% (а часьцей за ўсё гэтак і адбываецца), яна павінна фармаваць кааліцыю зь іншай ці іншымі партыямі. У такім разе выбарцы ня ведаюць, на якую канфігурацыю пагадзяцца палітыкі, і можа адбыцца сытуацыя, калі ва ўрад уваходзіць партыя, якой большасьць насельніцтва не хацела б там бачыць, за яе не галасавала — але палітыкі дамовіліся паміж сабой.

Ізноў жа італьянскі прыклад: Хрысьціянска-дэмакратычная партыя была асновай кааліцый і кіравала краінай бесьперапынна 50 гадоў (амаль як савецкая кампартыя). Дастаткова, каб апазыцыя не магла дамовіцца між сабой, — а далей хрысьціянскія дэмакраты ўжо маглі дамовіцца з астатнімі партыямі... Адна і тая партыя. На працягу 50 гадоў! Гэта зь ёй (ці, лепей сказаць, зь яе карумпаванымі палітыкамі) камісар Катані змагаўся. Цяпер на досьвед Італіі ківае Пуцін, калі яго крытыкуюць наконт палітычнага дамінаваньня «Адзінай Расеі». І ён па-свойму мае рацыю — гэта цалкам дэмакратычна.

## Дэ Голь як выключэньне

Ці ня лепшая прэзыдэнцкая сыстэма, дзе адразу можна бачыць, за каго ты галасуеш? І, калі твой «выбар» пераможа, гэты выбар становіцца ўладай, адразу можа выканаць усё, што паабяцаў?

Францыя была паралізаваная неэфэктыўнасьцю парлямэнцкай сыстэмы і знаходзілася на парозе грамадзянскай вайны пры канцы 1950-х. Выратаваў генэрал дэ Голь. Ён прапанаваў моцную прэзыдэнцкую ўладу з прэзыдэнтам, які знаходзіцца «па-над палітыкай», па-над спрэчкамі разьядналых парлямэнцкіх партый. Бацька нацыі. Ці ўзяць прыклад Амэрыкі — моцная прэзыдэнцкая ўлада, эфэктыўная палітычная сыстэма.

Менавіта досьвед Францыі й Амэрыкі ўзгадваўся найчасьцей постсавецкімі «канстытуцыйнымі інжынэрамі», якія напрыдумлялі канстытуцыяў з моцнымі прэзыдэнтамі на пачатку 1990-х. Але ці гэтыя інжынэры ня ведалі, што рабілі, і былі знаёмыя толькі з досьведам Францыі й Амэрыкі, ці проста ўсё сьпісвалі на момант крызысу (а крызыс, як ведама, так сам і просіць, каб хутчэй прыйшоў дыктатар) і думалі, што пасьля ўсё само сабой вырашыцца як трэба, ці якраз наадварот — добра ведалі, што рабілі? Гэта цяпер неістотна. Істотна, што палітычныя інстытуты прэзыдэнталізму ці парлямэнтарызму маюць пэўныя ўласьцівасьці і пасьля «інсталяцыі» гэтых інстытутаў яны робяцца больш і больш стабільнымі і іх цяжэй і цяжэй зьмяніць.

У момант крызысу можна ўстанавіць «крызысную» ўладу, якая й надалей будзе паводзіць сябе так, быццам крызыс не прайшоў.

Істотна таксама тое, што амэрыканская й француская палітычныя сыстэмы хутчэй зьяўляюцца выключэньнем з правілаў, чым правілам, — рэпрэзэнтатыўнымі эфэктыўнымі прэзыдэнцкімі сыстэмамі. Большасьць прэзыдэнцкіх сыстэмаў, і я зараз гэта праілюструю, папросту не працуюць. Дый францускую сыстэму ніхто й ня ілічыць прэзыдэнцкай — гэта клясычная паўпрэзыдэнцкая сыстэма зь «дзьвюма галовамі» — прэзыдэнтам і прэм'ер-міністрам. І калі прэзыдэнту не пашчасьціла мець падтрымку сваёй партыі ў парлямэнце, прэм'ер-міністар, які гэтую падтрымку мае, становіцца галоўным гульцом на палітычным полі.

## Білецік у Трэці сьвет

Калі паглядзець на сусьветную статыстыку па гэтым пытаньні, усё адразу становіцца відавочна. Так, з 53 маладых краінаў, якія на працягу таго ці іншага часу «эксьпэрымэнтавалі» з дэмакратыяй у пэрыяд з 1973 да 1989 г. (постсавецкія краіны ня ўключаныя), 61% краін, якія абралі парлямэнтарызм, засталіся дэмакратычнымі краінамі на працягу як мінімум 10 год, а то і больш. З другога боку, толькі 20% ад тых, што абралі прэзыдэнталізм, засталіся дэмакратычнымі. Такім чынам, толькі 1/5 прэзыдэнцкіх сыстэм здолелі застацца нармальнымі дэмакратычнымі краінамі, а астатнія скаціліся ў бездань дыктатуры, бясконцых пераваротаў і грамадзянскай вайны.

Сярод 50 былых калёніяў Вялікай Брытаніі 34 абралі парлямэнцкую форму кіраваньня. Зь іх 13 краінаў (40%) здолелі развіцца ў дэмакратыі. Гэта няшмат, але сярод 16 «прэзыдэнцкіх» краін ніводная (!) ня здолела развіцца ў дэмакратыю. Далей. Кіраваньне 91% прэзыдэнтаў у гісторыі сьвету было перарванае гвалтоўна (пераварот, датэрміновая адстаўка ды іншыя «нестабільныя» рэчы) у параўнаньні з толькі 31% кіраўнікоў парлямэнцкіх сыстэмаў.

Постсавецкія і постсацыялістычныя краіны — той жа трэнд. Сярод прэзыдэнцкіх сыстэмаў ніводная не засталася дэмакратыяй у 2004 г. Эканамічная сыстэма неканкурэнтаздольная, рэформы ня йдуць, інвэстыцыі ідуць марудна, правы чалавека не паважаюцца.

Большасьць краінаў, якія цяпер уступаюць у ЭЗ, — парлямэнцкія рэспублікі. Многія памылкова лічаць Польшчу й Літву прэзыдэнцкімі краінамі — гэта ня так. Яны паўпрэзыдэнцкія краіны зь вельмі моцным прэм'ер-міністрам, які зьяўляецца сапраўдным гаспадаром у краіне, галоўным мэнэджэрам эканомікі. Прэзыдэнт застаецца моцнай фігурай, але больш прадстаўнічай, і пераважна ў замежных справах.

Можна алегарычна сказаць, што канстытуцыйныя інжынэры, якія абралі парлямэнцкую сыстэму, выцягнулі для сваіх краінаў білецік у ЭЗ. А тыя, якія абралі прэзыдэнталізм, — білецік у Трэці сьвет. Можна цяпер нават ужо сказаць, калі Беларусь можна будзе афіцыйна лічыць краінай Трэцяга сьвету, — 1 траўня 2004 г.

## Неразьвітыя, бо прэзыдэнцкія, ці прэзыдэнцкія, бо неразьвітыя

Можна спрачацца, што краіны, якія абралі прэзыдэнталізм, ужо з самага пачатку былі «іншымі», адрозьніваліся ад тых, што абралі парлямэнтарызм. Спрачацца пра інстытуцыйную сыстэму — гэта тое самае, што блытаць прычыну і вынік. Ці ўсе неразьвітыя краіны неразьвітыя, бо маюць прэзыдэнцкую форму кіраваньня, ці яны маюць прэзыдэнцкую форму, бо яны неразьвітыя? Так і ня так.

З аднаго боку, вядома, цяжка параўноўваць Туркмэністан і Чэхію і сьцьвярджаць, што Туркмэністан толькі таму атрымаў залатога ідала, які круціцца па сонцы, бо ў іх прэзыдэнцкая рэспубліка.

Ясна, гэта было б глупствам. Формула «прэзыдэнталізм = дыктатура і ўсё дрэнна» і «парлямэнтарызм = дэмакратыя і ўсё добра» шмат што спрашчае. Тут няма дэтэрмінізму. Немагчыма казаць, што, калі абралі прэзыдэнтыялізм, усё, капец, усё дрэнна. У Амэрыцы ўсё больш-менш у гэтым сэнсе нармальна, нягледзячы на прэзыдэнцкую форму кіраваньня. Тут сувязь хутчэй у імавернасных тэрмінах.

Калі краіна мае прэзыдэнцкую сыстэму, існуе большая імавернасьць, што яна скоціцца ў дыктатуру (і будзе дрэнна), і наадварот: калі парлямэнцкая — меншая імавернасьць. Спрачацца са статыстыкай, якую я прывёў уверсе, таксама цяжка. Нешта з прэзыдэнцкімі сыстэмамі ня тое, што вядзе да гэткай статыстыкі.

## Розьніца

«Ня тое» — гэта тое, што прэзыдэнталізм і парлямэнтарызм маюць зусім адрозную лёгіку палітычнага спаборніцтва. Можна сказаць, што сыстэмы маюць розныя «рухавікі». Уся інстытуцыйная сыстэма прэзыдэнталізму пабудавана на ўзаемнай незалежнасьці інстытутаў. І парлямэнт, і прэзыдэнт выбіраюцца наўпрост народам, і абодва маюць аднолькавую легітымнасьць. Рана ці позна прэзыдэнт і парлямэнт не пагодзяцца наконт нейкага законапраекту, трэба будзе неяк дамаўляцца — глядзіце, што адбываецца: і прэзыдэнт абраны народам, і парлямэнт абраны народам, абодва лічаць сябе галоўнымі, а трэцяя галіна ўлады, Канстытуцыйны суд, хутчэй за ўсё яшчэ не зрабілася самастойнай і ня можа сказаць, хто зь іх «галаўнейшы» бясспрэчна. А калі й можа, другая пакрыўджаная, «абраная народам» галіна не пагодзіцца.

«Палітычны рухавік» прэзыдэнталізму прывядзе да крызысу рэжыму. Канстытуцыйныя крызысы рэжымаў вырашаць складана, яны звычайна вырашаюцца, так бы мовіць, «параканстытуцыйна», як Ельцын «вырашыў» канстытуцыйны крызыс у 1993 г. пры дапамозе танкаў. Ельцын атрымаў суперпрэзыдэнцкую рэспубліку. Парлямэнт ужо не спрачаўся, хто галаўнейшы, сыстэма выйшла больш-менш «стабільная». Але затое недэмакратычная і завязаная на аднаго гульца, а не на інстытуты. І калі гулец хворы, сыстэма ў крызысе. Тое самае цяпер у большасьці постсавецкіх краінаў.

Зараз паглядзім на парлямэнцкую сыстэму. Урад і прэм'ер-міністар залежаць ад парлямэнту, і наадварот. Парлямэнт можа выказаць недавер ураду, калі не прагаласуе за які законапраект. Таксама ўрад, у большасьці выпадкаў, можа распусьціць парлямэнт і правесьці новыя выбары. Такім чынам, існуе ўзаемная залежнасьць, і калі сыстэма атрымлівае крызыс, гэта крызыс толькі ўраду, а ня ўсёй палітычнай сыстэмы. Танкі ня трэба, патрэбныя новыя выбары, новыя твары.

## Стабільнасьць прэзыдэнцтва — міт

Міт наконт стабільнасьці прэзыдэнцкай сыстэмы і, наадварот, нестабільнасьці парлямэнцкай — надзвычай жывучы. На самай справе, прэзыдэнцкая сыстэма надзвычай нестабільная. Усё залежыць ад аднаго чалавека, а не інстытутаў, цяжка дамовіцца з парлямэнтам (адзіная прычына, чаму амэрыканская сыстэма стабільная, гэта тое, што і Рэспубліканская, і Дэмакратычная партыі вельмі аморфныя й нямоцныя ў інстытуцыйным сэнсе стварэньні і кангрэсмэны могуць галасаваць нават супраць сваёй партыі; прэ-



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Сярод 50 былых калёніяў Вялікай Брытаніі 34 абралі парлямэнцкую форму кіраваньня. Зь іх 13 краінаў (40%) здолелі разьвіцца ў дэмакратыі. Гэта няшмат, але сярод 16 «прэзыдэнцкіх» краін ніводная (!) ня здолела разьвіцца ў дэмакратыю.**

# парлямэнтарызм?

зыдэнт таксама можа ініцыяваць законапраекты рукамі ляяльных кангрэсмэнаў і г.д.), палітычны крызыс робіцца крызысам усяго рэжыму.

Парлямэнцкая сыстэма больш стабільная: урад мае большасьць у парлямэнце, якая яго падтрымлівае. Існуе згода, а калі не ўдаецца пагадзіцца, тады склікаем выбары! Ізноў крыху статыстыкі: у сьвеце паміж 1973 і 1987 гадамі 83% часу парлямэнцкія ўрады мелі большасьць і падтрымку ў парлямэнце, у той час як прэзыдэнты мелі падтрымку толькі 48% часу. Другімі словамі, сярэднеарытмэтычны ўрад мог разьлічваць на падтрымку парлямэнту 4 з 5 гадоў свайго кіраваньня, у той час як сярэднеарытмэтычны прэзыдэнт — толькі палову свайго тэрміну.

Што рабіць «беднаму» прэзыдэнту, якому трэба правесьці нейкі закон праз парлямэнт? Трэба неяк абыходзіць парлямэнт — трэба палітычная зброя ў выглядзе дэкрэтаў, якія маюць ці ня маюць сілу закону, пасьля, можа, і яшчэ якія паўнамоцтвы на які выпадак, пасьля права вэта, каб блякаваць неўпадабаныя парлямэнцкія законы, пасьля падключаем рэфэрэндумы, каб рабіць тое, што народ сказаў (а рэфэрэндумы ва ўсім сьвеце — гэта самая небясьпечная зброя для дэмакратыі, асабліва калі ў краінах няма дэмакратычнай традыцыі за плячыма, як няма яе ў нас), а пасьля парлямэнт увогуле ня трэба — падключаем лёгіку «дзяржава—народ—прэзыдэнт». Пасьля — капец канстытуцыяналізму і капец дэмакратыі.

Тое, што адбылося ў Беларусі ў 1994—96, ня ёсьць нейкім выключным ненармальным актам. Тое самае адбылося ў дзясятках краінаў Лацінскай Амэрыкі ды Афрыкі і раней — Эўропы, якія абралі падобныя інстытуты і знаходзіліся ў падобных абставінах.

Усё цалкам лягічна. Калі парлямэнт не пагаджаецца з прэзыдэнтам, пачынаем выпускаць дэкрэты, парлямэнт ня можа пагадзіцца і аб’яднацца, бо партыі слабыя, тады падключаем народ праз рэфэрэндум — і гудбай, парлямэнт. Няма тут і дэтэрмінізму.

Францыя засталася дэмакратыяй. Але большасьць «францыяў» — не засталіся. Ня ўсім пашанцавала мець дэ Голя. Пры прэзыдэнталізьме існуе нашмат большая імавернасьць і небясьпека, што ўсё скончыцца дрэнна.

## Трэба моцныя партыі

Яшчэ адно. Бяз партыяў — эфэктыўных, парлямэнцкіх партыяў — немагчымая парлямэнцкая сыстэма. Магчымая толькі прэзыдэнцкая. Можна спрачацца зноў, якая зь іх лепшая, але перад тым, як будаваць любую сыстэму, патрэбныя, як мінімум, парадак і мір. Беспарадак і вайна патрабуюць дыктатара (добра яшчэ, калі дэмакратычна абранага прэзыдэнта, які гуляе паводле дэмакратычных правілаў).

Будаваць дэмакратычную сыстэму зараз у Іраку немагчыма. Спачатку трэба навесьці парадак і пабудаваць парлямэнцкія партыі на лякальным узроўні, як гэта было зроблена ў Нямеччыне пасьля вайны. Як гэта зрабіць у Іраку — я ня ведаю, і добра, што я не працую там палітычным кансультантам.

Каб у Беларусі паўстала парлямэнцкая сыстэма, трэба моцныя парлямэнцкія партыі з рэальнай, а не эфэмернай падтрымкай, і не абстрактнага «народу», а канкрэтных груповак грамадзтва й бізнэсу.

Адна з прычынаў 1996 г. — не існавала сапраўдных партыяў, за плячыма якіх стаялі б моцныя бізнэс-групоўкі. Партыі тут не адны вінаватыя — не існавала яшчэ й бізнэс-груповак.

Прэзыдэнты апраўдваюць сваю моцную выканаўчую ўладу тым, што не існуе моцных партыяў, каб былі падставы ўводзіць парлямэнцкую сыстэму. І гэтыя прэзыдэнты абсалютна маюць рацыю: не існуе моцных партыяў — і немагчымая парлямэнцкая сыстэма. Але з другога боку, калі нічога не рабіць, так яны ніколі і не паўстануць, а калі актыўна супрацьдзейнічаць іх паўстаньню, дык яшчэ й пазьней за «ніколі».

## Канстытуцыі будуюцца на страху

Якая сыстэма патрэбна Беларусі, якая будзе найбольш эфэктыўная? Якая Канстытуцыя? Перш за ўсё, патрэбна вырашыць, што такое Беларусь і чаго хочуць беларусы, доўга й цесна абмеркаваць праблемы й пэрспэктывы. Хочам вольны рынак і жыць, як людзі, ці хочам жыць у Трэцім сьвеце? Калі першае, тады трэба мяняць, і гэта будзе балюча. Калі апошняе, тады нічога ня трэба мяняць, усё і так «чотка».

Парлямэнтарызм ці прэзыдэнталізм — гэта толькі інстытуты, яны самі па сабе не

Працяг на старонцы 10.



WWW.LEVENDEHAV.DK

**Кіраваньне 91% прэзыдэнтаў у гісторыі сьвету было перарванае гвалтоўна (пераварот, датэрміновая адстаўка ды іншыя «нестабільныя» рэчы) у параўнаньні з толькі 31% кіраўнікоў парлямэнцкіх сыстэмаў.**

# Мадэль сярэдзіны 90-х выдыхаецца

## Гутарка зь Міхалам Пліскам

**«Усе дзяржавы, якія дасягнулі незалежнасьці ў 20-я, — Літва, Эстонія, Польшча — таксама прайшлі праз аўтарытарызм. Краіны былі на той момант сялянскія, ідэі дэмакратычнага грамадзтва былі ў іх непапулярныя, і прыйшлі Пілсудзкі, Ульманіс, Сьмятона, — такія паралелі праводзіць адзін з найлепшых у краіне адмыслоўцаў у галіне канстытуцыйнага права Міхал Пліска. — У сёньняшнім сьвеце спадзевы на аўтарытарызм праходзяць хутчэй, чым тады».**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Міхал Пліска:** Калі распрацоўвалася Канстытуцыя (а падрыхтоўка да гэтага пачалася ў 1990-м), то спачатку прадугледжваўся варыянт больш моцнай прэзыдэнцкай рэспублікі, але ў 94-м схіліліся да мадэлі, якую большасьць палітолягаў пазначае як «паўпрэзыдэнцкую рэспубліку», альбо «прэзыдэнцка-парлямэнцкую». 10 гадоў, якія прайшлі з моманту прыняцьця Канстытуцыі, і амаль 15 гадоў з аднаўленьня незалежнасьці краіны сьведчаць аб тым, што парлямэнцкая рэспубліка, відаць, паскорыла б працэс эканамічных рэформаў і дэмакратызацыі.

**«НН»: А можа, справа толькі ў асобе? Можа, іншаму моцнаму прэзыдэнту, наадварот, лягчэй было б асучасьніваць і рэфармаваць краіну, без тармазных спрэчак паміж парлямэнтам і прэзыдэнтам, сьведкамі якіх мы былі ў 1994—1996-м?**

**М.П.:** Многае залежыць ад стану грамадзкай сьвядомасьці. Ёсьць выпадкі ў краінах Усходняй Эўропы, дзе аўтарытарна дзейнічаў не прэзыдэнт, а прэм’ер-міністар (Славаччына). Адна справа — фармальны закон, іншая — як ён зьдзяйсьняецца. Так і з Канстытуцыяй. У нас, як ва Ўкраіне і Расеі, дзейнічала аб’ектыўная заканамернасьць узмацненьня выканаўчай улады, якая набыла перавагу над заканадаўчай, падмяўшы яе. У Беларусі асабістыя рысы прэзыдэнта толькі паскорылі гэтыя працэсы. Але нават у выпадку калі б прэзыдэнтам быў абраны Кебіч, амаль нічога б не зьмянілася.

**«НН»: Прэзыдэнт Расеі стаў вядомы задоўга да выбараў 14 сакавіка, карумпаванасьць рэжыму Кучмы абмяркоўваюць сусьветныя мэдыі, у Літве — скандал з Паксасам, ня кажучы пра азіяцкія праявы кшталту Ніязава. Ці не падаецца Вам, што ў большасьці постсавецкіх краінаў падарваны давер да інстытуту прэзыдэнцтва як такога?**

**М.П.:** Дыскрэдытаваны ня сам інстытут прэзыдэнцтва, але моцнага прэзыдэнта. Безумоўна, дыскрэдытавала сябе дэлегаваная, ці рэфэрэндумная дэмакратыя. Пры абраньні прэзыдэнта ўсеагульным галасаваньнем і надзяленьні яго заканадаўчымі паўнамоцтвамі ня выключана, што дзяржава ўрэшце стане аўтарытарнай ці нават таталітарнай.

Тую мадэль, якая ў нас існуе, нельга ж назваць нават прэзыдэнцкай рэспублікай у чыстым выглядзе! У клясычных прэзыдэнцкіх рэспубліках, як ЗША ці Францыя, прэзыдэнт, пры ўсёй ягонай моцы, не валодае правам прымаць акты, якія па сваёй сутнасьці зьяўляюцца законамі. Беларусь — адзіная з эўрапейскіх краінаў, дзе такое практыкуецца. Нават у Расеі, дзе вельмі моцны прэзыдэнт, права прымаць законы мае толькі Дзяржаўная дума.

**«НН»: Ёсьць меркаваньне, што менавіта прэзыдэнцкая рэспубліка дазваляе забясьпечыць пераход да дэмакратыі.**

**М.П.:** Ва Ўсходняй Эўропе большага посьпеху на шляху дэмакратызацыі і рынкавых рэформаў дасягнулі якраз парляменцкія рэспублікі — Вугоршчына, Эстонія, Чэхія.

Мне падаецца, што ў транзытных краінах або прэзыдэнт не павінен абірацца ўсім народам, або мусіць быць моцны парлямэнт і рэальны падзел улады. Інакш ствараецца ілюзія падвойнай заканадаўчай легітымнасьці: з аднаго боку, законы прымае парлямэнт, а зь іншага — указы і дэкрэты прэзыдэнта таксама маюць сілу закону. У Канстытуцыі 1994 г. было напісана: «Найвышэйшым заканадаўчым органам краіны зьяўляецца парлямэнт». Аднак прэзыдэнта абіраў увесь народ, і гэты народ «у глыбіні душы» лічыў, што прэзыдэнту таксама дазволена прымаць законы. І дзейны прэзыдэнт гэтым вельмі моцна скарыстаўся. Не заўжды мадэль, зафіксаваная ў Канстытуцыі, забясьпечвае нармальнае функцыянаваньне сыстэмы.

**«НН»: Якое існуе канстытуцыйнае выйсьце з той сытуацыі з дысбалянсам галінаў улады, у якую мы патрапілі?**

**М.П.:** Усе краіны, якія дасягнулі незалежнасьці ў 20-я, — Літва, Латвія, Эстонія, Польшча — прайшлі праз аўтарытарызм. Яны ствараліся як парлямэнцкія рэспублікі, але прыйшлі Пілсудзкі, Ульманіс, Сьмятона ды іншыя дыктатарчыкі. Краіны былі на той момант сялянскія, у іх не былі папулярныя ідэі дэмакратычнага грамадзтва. Тое ж можна сказаць і пра Беларусь пачатку 90-х. Народ чакаў, што дэмакратыя прынясе яму паляпшэньне эканамічнага становішча, а калі гэтага не адбылося — вярнуўся да ідэі моцнай улады. Павінна зьмяніцца пакаленьне, і гэта паступова адбываецца. Трэба гадоў 20—25, каб зьмяніць арыентацыю насельніцтва і эліты. Апошняя павінна сама зрабіць вывад, што лепш кіравацца дэмакратычнымі каштоўнасьцямі, чым аўтарытарнымі. Між іншым, ужо цяпер шмат хто стаў заўважаць, што мадэль, створаная ў сярэдзіне 90-х, выдыхаецца.

> Беларусь — адзіная з эўрапейскіх краінаў, дзе прэзыдэнт мае права прымаць акты, што маюць сілу закону. І ў Расеі, і ў Францыі, і ў ЗША права прымаць законы мае толькі парлямэнт.

**«НН»: Давядзецца чакаць 2016 году?**

**М.П.:** Неабавязкова. Я разважаў у сэнсе «ідэальным», калі б Беларусь была замкнутым грамадзтвам. Але ж адбываюцца працэсы глябалізацыі, інфармацыя распаўсюджваецца хутка, грамадзяне Беларусі бачаць, што адбываецца ў суседзяў. У сёньняшнім сьвеце спадзевы на аўтарытарную мадэль праходзяць хутчэй… Не адна Беларусь, шмат якія дзяржавы рэгіёну яшчэ не адшукалі сваёй формы кіраваньня, сваёй «вопраткі».

**Гутарыў Зьміцер Дрыгайла**

## Ільготы вясковым; жыцьцё настаўнікаў...

Пра льготы вяскоўцам-вучням пры паступленьні ў ВНУ: лічу, што гэта правільная ідэя. У нас у краіне стварылася дыскрымінацыйная сыстэма адукацыі, у якой вясковая школа стаіць на апошнім месцы. І часта не па віне настаўнікаў. Праз эканамічнае бязладзьдзе зруйнавана сям’я, Міністэрствам адукацыі кіруюць некампэтэнтныя людзі, якасьць падручнікаў нізкая. Заробак настаўнікаў зьневажальны для іхняга статусу. Мала-мала хто мае кампутар, доступ да Інтэрнэту, спадарожнікавую антэну. Увосень я бачыў анкету на гэтую тэму: з 60 настаўніц ніхто ня меў нічога зь пералічанага начыньня. Пра які сучасны навучальны працэс і трансьляцыю якасных ведаў можа ісьці гаворка?

Вясковы настаўнік мусіць кампэнсаваць свае патрэбы тупой ручной сельскагаспадарчай працай, што недаравальна людзям з інтэлектам. Гэта абкраданьне вучняў. Фэмінізацыя школы зь яе канфармізмам спарадзіла самадурны дэспатычны незьмяняльны пажыцьцёвы дырэктарскі статус і корпус.

Гарадзкі вучань мае добрыя магчымасьці для атрыманьня ведаў праз дадатковыя формы навучаньня. Вясковы гэтага пазбаўлены. Роўнасьці няма.

Але вышэйшая школа таксама мае патрэбу ў шанаваньні і падтрымцы. Без адукаванага разьвітага выкладчыка нашы дыплёмы застануцца паперчынай. Адной з conditio sine quam non ёсьць вывядзеньне ўнівэрсытэтаў з-пад апекі Мінадукацыі і наданьне ім акадэмічнай аўтаноміі. Далей, народнай адукацыяй павінны займацца ўнівэрсытэты па сваіх акругах, задаючы стандарты адукацыі — сёньня завышаныя, не забясьпечаныя часам навучаньня. Застаецца чакаць, што колькасьць гараджан, якія раптам стануць вяскоўцамі, значна ўзрасьце.

**Мікола Бусел,**
**Дуброва (Сьветлагоршчына)**

## Падтрымліваю льготы вясковым

Добра ведаю ўзровень адукаванасьці дзяцей як у вясковай, так і ў гарадзкой школе, бо першую скончыў сам, а ў другой праходжу пэдпрактыку. Узровень адукацыі ў горадзе істотна вышэйшы. Нешта падобнае назіраецца, калі параўнаць школы Барысава й Менску. Вынік будзе на карысьць сталіцы.

Настаўнікі даюць лепшыя веды, удасканальваюць мэтодыкі, выпрацоўваюць новыя прыёмы навучаньня, калі адчуваюць канкурэнцыю, прэсынг з боку маладых спэцыялістаў. А тыя з большай ахвотай ідуць працаваць у горад. Настаўнікі на вёсцы нібы пажыцьцёва замацаваныя на сваіх месцах. Бо хто ж у здаровым розуме паедзе працаваць у вёску, ды яшчэ настаўнікам? А тыя маладзічкі, якія ўсё ж трапляюць у «дзярэўню» па ўнівэрсытэцкім разьмеркаваньні, працуюць у вясковай школе па адным прыкладзе: «Абы два гады пратрымацца, дыплём замацаваць».

Добра, калі яшчэ ў школе ёсьць спэцыяліст. А то настаўнік біялёгіі навучае матэматыцы etc. А пасьля Аляксандар Рыгоравіч дзівіцца, што БДУ стаўся навучальнай установай Менску і яго ваколіцаў. Зусім ня льготы патрэбныя вясковым дзецям, а рэальнае паляпшэньне ўзроўню адукаванасьці ў вёсцы. Адзіны спосаб паступіць у ВНУ для вяскоўца — скончыць якісьці каледж, каб падцягнуць веды. Дый тое большасьць выпускнікоў каледжаў зь вёскі ідуць на завочнае. Бо ня кожныя бацькі здолеюць правучыць сына ці дачку яшчэ пяць гадоў. А тыя шчасьліўцы, што ўрэшце скончаць ВНУ, вылузваюцца са скуры, каб не вярнуцца назад у калгас.

Трэба ствараць умовы для працы чалавека, у тым ліку й настаўніка, у вёсцы. Ствараць там здаровую канкурэнцыю. А пасьля ўжо і каб дзеткі зь вёскі ішлі ў ВНУ на роўных правах з гарадзкімі.

**Зьміцер Панкавец,**
**Кастрыца**

## У павуціньні лукамолу

Дома ў хлопца было сьвята: у малодшага брата дзень народзінаў. Як не «сарвацца» з заняткаў?! Але прагуляць неафіцыйна неяк несалідна, можна і з унівэрсытэту «паляцець». Якое выйсьце? Напісаць заяву на імя дэкана ці яго намесьніка. Той разглядае сутнасьць пытаньня і падпісвае гэты дакумэнт. Варыянт «не падпісвае» вельмі рэдкі.

Панёс студэнцік заяву ў дэканат. Аддае ў рукі маладога «нама». Той, не зірнуўшы, аўтаматычна задае пытаньне: «Вы член БРСМ?» — «Што, прабачце?» — «Ці ў БРСМе, пытаю?!» — «А якое гэта мае дачыненьне?» Выявілася — прамое. Намесьнік растлумачыў, што менавіта наяўнасьць «партбілета», а не прычына заявы, стан студэнта, ягоныя паводзіны, адыгрывае пераважную ролю ў пытаньні дазволу. «Дык што? Ці член ты?» — «Не!» — цьвёрда адказаў хлопец. «На жаль», — дадаў са зьдзекам. «Малады кіраўнік» сурова зірнуў: «У тваім дакумэнце *можна знайсьці* столькі памылак у складаньні, што ён ніколі ня трапіць на разгляд».

Вось дык справа. Такі ўнівэрсытэт, цудоўныя выкладчыкі! Ды якія нізкія ідэалы спавядаюцца, якія ж людзі тут займаюць пасады чыноўнікаў. Шкада тую моладзь, якая пакутуе празь дзейнасьць БРСМ. Ды яшчэ больш шкада хлопцаў і дзяўчынак, якія апынуліся ў павуціньні лукамолу. БРСМ прываблівае скідкамі, дыскатэкамі і іншай лухтой. Ня грэбуюць дзеячы і самым дзейсным сродкам — страхам. Запалохаць сёньняшняга беларуса ня так складана. «Над намі страх, нібыта сьцяг. І мы жывём, нібы ў гасьцях...»

**Юрась Бусел,**
**Маладэчна**

## Пра сэрыял «Гонар маю»

На мінулым тыдні скончыўся сэрыял на канале «РТР» — «Гонар маю» («Честь имею»). Анансаваны як рэквіем роце пскоўскага дэсанту, фільм ператварыўся ва ўводзіны ў асноўныя напрамкі расейскай палітыкі: «Духаў мачыць! Радзіму абараняць!» Прайшліся і па алігархах. Галоўны пэрсанаж капітан Чыслоў адмаўляе прыемнай ва ўсіх адносінах бізнэсоўцы Ганьне. А ў піцерскай камандзіроўцы ён абараняе ад патрыятычна афарбаваных адмарозкаў летуценнага чачэнца і выклікае фанатычна-ненатуральны давер сваёй вайсковай формай у студэнткі-завочніцы, якую правёў па цёмных падваротнях дадому.

Казкі «гражданкі» перарываюць дурнавата-ідылічныя абразкі ў войску. Начальства грубаватае, але чульлівае. Ніяк не абыякавыя і прадажныя людзі, празь якіх, фактычна, і загінулі пскоўскія хлопцы. Гледача рыхтуюць да таго, што ніхто не вінаваты ў сьмерці роты. Калі па выведнікаў не прылятае шрубалёт, палкоўнік спасылаецца на генэрала, а той — на назіральнікаў і журналістаў, што ня ў час завіталі... Нібы скапіяваныя з савецкіх фільмаў, побач паляць зашмальцаваныя цыгаркі «тунгус» і армянін Ара. Як яшчэ беларусаў не прыпісалі? Мароз па скуры...

Разьвязка, сам бой — на другім пляне. Невыразная страляніна і змазаны фінал. Ні баявік, ні мэлядрама. Прыкры ролік ці то ў падтрымку непапулярнай кампаніі ў Чачэніі, ці то ў падтрымку неперараможнага Пуціна.

**Усевалад Сьцебурака,**
**Вялейка**

# Прэзыдэнталізм ці парлямэнтарызм?

**Працяг са старонкі 9.**

вырашаюць праблемаў. Трэба спачатку вырашаць больш грунтоўныя пытаньні. Але й інстытуты ня трэба лічыць драбязой — яны ствараюць і падтрымліваюць тое, што людзі хочуць стварыць і падтрымаць.

Трэба разумець, што канстытуцыі пабудаваныя на страху, самым сапраўдным страху. Француская Канстытуцыя Пятай рэспублікі пабудавана на страху перад хаосам Чацьвертай парлямэнцкай рэспублікі. Страх у францускім варыянце — гэта беспарадак і сварлівыя карумпаваныя партыі. Прэзыдэнталізм павінен з гэтым страхам змагацца.

Нямецкая Канстытуцыя пабудавана на страху пасьля дыктатара і «простых рашэньняў» складаных праблемаў. Нямецкі парлямэнтарызм і моцная судовая ўлада павінны з гэтым страхам змагацца.

Беларуская Канстытуцыя 1994 г. была пабудавана на страху беспарадку, часовасьці, неэфэктыўнасьці ўлады, на заданьні нешта «зьмяніць». Канстытуцыя 1996-га пабудавана на страху палітычнай альтэрнатывы прэзыдэнцкай уладзе.

Калі ў Беларусі будуць якія зьмены, хутчэй за ўсё, будзе страх занадта моцнай прэзыдэнцкай улады і будзе патрэба ў парлямэнцкай Канстытуцыі. Як я абмаляваў вышэй, парлямэнцкая сыстэма ёсьць больш эфэктыўнай сыстэмай па сваёй лёгіцы. Там крызысы не такая праблема.

Аднак тут узьнікаюць два моманты. Па-першае, хто б ні быў пасьля Лукашэнкі, ён атрымае ў спадчыну моцную прэзыдэнцкую ўладу, і будзе спакуса гэтую ўладу пакінуць на добрыя мэты — правесьці балючыя рэформы, прыватызацыю. Будзе беспрацоўе, вельмі непапулярная зьява. Парлямэнт можа быць супраць. Прэзыдэнту можна будзе зноў «бамбіць» дэкрэтамі. Калі мала, можна будзе правесьці адзін-два рэфэрэндумы. Ізноў паехалі па коле «народ—прэзыдэнт—дзяржава».

Па-другое, для парлямэнцкай сыстэмы патрэбныя моцныя парлямэнцкія партыі. Лепей меней, чым болей. Дастаткова ўвогуле дзьве — правая і левая. Можа, яшчэ якая крайне правая — для калярыту. Цяпер іх няма, і іх ня будзе ні перад гіпатэтычнай зьменай, ні адразу пасьля. Што рабіць? Патрэбны агульнанацыянальны кантракт-пагадненьне на адзін тэрмін прэзыдэнцкай улады пад кантролем Канстытуцыйнага суду, падчас якой паўстануць парлямэнцкія партыі.

За гэты тэрмін мусіць паўстаць палітычная эліта, якая б не баялася прайграць і прайграваць выбары, якая паўстала ва ўсіх краінах Сярэдне-Ўсходняй Эўропы на працягу 1990-х. Пасьля гэтага магла б быць замена на парлямэнцкую рэспубліку.

Я асабіста лічу, што для Беларусі найлепей падышла б нямецкая парлямэнцкая сыстэма, зь вельмі моцным Канстытуцыйным судом, але бязь верхняй палаты, ці Сэнату (у маленькай краіне без нацыянальных меншасьцяў гэта нонсэнс), са зьмяшанай выбарчай сыстэмай: палова выбіраецца па партыйных сьпісах, палова — на мажарытарнай аснове, але прапорцыя месцаў у парлямэнце падлічваецца на аснове прапорцыі галасоў, атрыманых па партыйных спісах — каб не было гэткага бардаку, як у Расеі і Ўкраіне, якія прынялі нямецкую зьмяшаную выбарчую сыстэму, але «забыліся» пра перападлік месцаў на партыйнай аснове. Ізноў атрымалі «беспартыйных», якія соўгаюцца ў парлямэнце як хочуць. Купляйце нямецкае.

**Аляксандар Батура**

## ВОДГУКІ

## Шануйма лідэраў

Здаровая людзкая супольнасьць ня можа існаваць, не вылучаючы са свайго асяродку лідэра. Лідэр у цывілізаваным грамадзтве — гэта не пахан на зоне, аўтарытэт якога грунтуецца на гвалце. Аўтарытэт лідэра грунтуецца на здольнасьці (таленце) убачыць, сфармуляваць і пасьпяхова ажыцьцявіць ідэю, што ўвасабляе памкненьні кожнага чальца супольнасьці.

Таленавіты лідэр — зьява ўнікальная. Талент трэба берагчы, падтрымліваць, бо толькі пустазельле размнажаецца і квітнее само. Лідэра трэба гадаваць, шанаваць і песьціць. Ім трэба ганарыцца і на ягоны аўтарытэт працаваць. Гэта даўно зразумелі больш разьвітыя за нашу грамадзкія супольнасьці. Бо, каб прыпыніць разьвіцьцё социюму, дастаткова перашкодзіць вылучэньню зь яго асяродзьдзя лідэра.

Гісторыя ведае безьліч мэтадаў гэткай кастрацыі грамадзтва. Найбольш барбарскі — фізычнае вынішчэньне існых і патэнцыйных лідэраў. Больш вытанчаны — дыскрэдытацыя. Такі мэтад дзейсны ў грамадзтве зь нізкім сярэднім узроўнем самасьвядомасьці, дзе індывіды некрытычна праектуюць уласныя заганы на іншых. Напрыклад на прадпрымальнікаў: «Зладзеі, усе зладзеі», на дэпутатаў: «Усё адно падмануць». У такім грамадзтве найбольш імавернае вылучэньне лідэра-папуліста.

У асяродку, дзе такія дубаломныя прыёмы выклікаюць агіду і сьмех, сваю справу робяць агенты ўплыву і стукачы. Асноўная іх задача — перасварыць усіх з усімі, збэсьціць патэнцыйных лідэраў, выклікаць да іх недавер. Прыёмы вядомыя: хлусьня, плёткі і бруд.

Мы гэта назіраем навокал. Але нашае грамадзтва працягвае вылучаць лідэраў. І гэта ёсьць зарукай таго, што мы ня зьнікнем. Адно засмучае — калі ж навучымся бараніць сваіх лідэраў? Бо грамадзтва дазваляла і дазваляе ганьбаваньне ня толькі сваіх палітычных лідэраў ад Пазьняка і Шушкевіча да Чыгіра і Ганчарыка, але і абсалютна бездакорнага маральнага аўтарытэта — Васіля Быкава. Не здрыганулася і ня выйшла на вуліцы, як па кілбасу ў 91-м, калі бандыты ў камуфляжы зьбілі дэпутатаў у ВС, калі сталі зьнікаць палітыкі, журналісты і простыя грамадзяне.

Цяжка ўявіць, што існая ўлада паклапоціцца пра грамадзкія інтарэсы. У яе іншыя задачы. Мы і не чакаем ад яе ні спагады, ні дапамогі. Але асяродак, які называе сябе беларускім нацыянальным дэмакратычным, павінен разумець важнасьць закранутай тут праблемы. А СМІ мусяць больш адказна ставіцца да выбару публікацый на гэтую тэму. Бо і сапраўды газэта ня плот... Хтосьці самасьцьвярджаецца праз стваральную працу, іншы — праз разбуральную. Грамада мусіць адрозьніваць адных ад другіх, бо зь першых вырастаюць лідэры, а з другіх — азлобленыя няўдачнікі.

**Віктар Савіцкі, Менск**

## Выйсьце ў байкоце

Артыкул Лявона Баршчэўскага ў «НН» ад 20 лютага скіроўвае беларусаў са шляху актыўнага змаганьня за лепшае жыцьцё да марнатраўства інтэлектуальных і іншых рэсурсаў праз удзел у палатных выбарах.

Заявы кшталту «сабралі малавата», «ня мае такіх сіл», «уяўныя страшылкі», «з кім... здолеў дамовіцца... — невядома» патрабуюць спасылкі на крыніцы інфармацыі. Ня ведаю, пра якія «страшылкі» піша сп.Лявон. Працытую на свой розум рэчы, якія падыходзяць для гэтае ролі, з артыкулу З.Пазьняка «Беларусь — Усходняя Эўропа». Уяўныя, паводле Л.Баршчэўскага, страшылкі Пазьняка — гэта: 1) «рэфэрэндум аб «канстытуцыйным акце»; 2)«дэмагогія аб сувэрэнітэце — і адначасна вынішчэньне ўсяго беларускага»; 3) «пасьлядоўная праца спэцыяльных структураў над увядзеньнем расейскіх грошай»; 4) «агітацыя вікаўскай «апазыцыі» ісьці на палатныя выбары, а на рэфэрэндуме сказаць «не» трэцяму тэрміну Лукашэнкі». А прыклад зь Ліцэем ці ня ёсьць яскравай ілюстрацыяй «уяўнае» страшылкі №2?

З.Пазьняк піша, што «ў такіх умовах хаджэньне на выбары ёсьць нацыянальнай здрадай з боку палітычных партыяў, паколькі рэжыму патрэбная партыйная статыстыка ўдзелу ў выбарах для фармальнай легітымізацыі антыдэмакратычнага выбарчага працэсу».

Чарговая прыкрая падмена паняткаў робіцца падчас апісаньня бедаў Ліцэю. Быццам бы Пазьняк супраць дапамогі Ліцэю. Ды ён толькі пра беларускую салідарнасьць і рупіцца. Прапануе рэальны шлях: «не хадзіць на фальшывыя выбары і рэфэрэндумы», ствараць групы падтрымкі, агітаваць за няўдзел у хлусьні. Бо іначай паўплываць на ўладу шараговаму грамадзяніну цяпер цяжка, асабліва ў правінцыі. Да скрыняў лёгка прывезьці вайскоўцаў, студэнтаў. А вось «дастаць» чалавека на кватэры можна толькі зь ягонай згоды.

Л.Баршчэўскі гатовы шукаць выхаду да людзей праз удзел у выбарах, чакаць на прыход свайго Саакашвілі. А прапанову **дзеяньня** праз байкот выбараў (выхаду да людзей з тлумачэньнямі ў сытуацыі інфармацыйнае блякады) абвяшчае фантомнай. Спадзяецца, што маладзейшыя бачаць далей. Прапануе даць ім шанец. А шанец даецца на выбарах. Вынікае — на іх трэба ісьці. А выбары сфальшуюць: «патрэбныя ім лічбы атрымаюць». Калі будзе рэфэрэндум, сфальшуюць і яго. І будзе ўведзены расейскі рубель. І будзе марыянэткавая дзяржава Беларусь з Лукашэнкам на чале. І што тады? Чакаць 2008, 2012 году?

**Міхась Шпакаў,**
**Клімавічы**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб’ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# Энцыкляпэдыя нашага часу



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Захар Шыбека:**
**Такія энцыкляпэдыі выдаюцца ў пэрыяд стабілізацыі, як вядомая Француская. А ў нас яна выдавалася ў пераходны пэрыяд. І гэта фэнамэнальны факт, бо яна магла на трэцім томе спыніцца.**



**Валер Пазьнякоў:**
**энцыкляпэдыі з паперы пераводзяцца ў электронны фармат. На інтэрнэт-старонцы інфармацыя абнаўляецца кожную гадзіну. Нас чакае такі самы шлях.**



**Анатоль Сідарэвіч:**
**Дзякуй Богу, што не далі рамантыкам ад нацыянальнай гістарыяграфіі размахнуцца пёрамі, што ў біяграфіях выкінутыя ўсе ацэначныя моманты.**

«Круглы стол» у Рэдакцыі «Нашай Нівы» быў прысьвечаны выхаду апошняга тому «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі» (ЭГБ). Для беларускай гістарыяграфіі 7-тамовае выданьне ўнікальнае. Над 17 000 артыкулаў працавалі амаль 700 аўтараў. Тыраж першых двух тамоў складае 20 000 асобнікаў, астатніх — 10 000. Грандыёзны кампэндыюм ведаў пра краіну… Як ім карыстацца? Удзел у абмеркаваньні ўзялі аўтар і навуковы кансультант ЭГБ Анатоль Сідарэвіч, доктар гістарычных навук Захар Шыбека, навуковы рэдактар выдавецтва «Беларуская энцыкляпэдыя» Валер Пазьнякоў.

**«НН»: Энцыякляпэдыя гісторыі Беларусі выходзіла ў пару палітычных пераменаў і гістарычных пераацэнак. Ці своечасова?**

**Анатоль Сідарэвіч:** Яна не магла выйсьці раней, бо тады гэта было б нешта накшталт савецкага энцыкляпэдычнага даведніка «Янка Купала», дзе не было ні Вацлава Іваноўскага, ні іншых дабрадзеяў Купалы. Праект ЭГБ быў народжаны ў самы разгар перабудовы. На нарадах па слоўніку энцыкляпэдыі (сьпісе артыкулаў, якія ўвойдуць у выданьне) чулася неверагоднае па тым часе: Першая, Другая Ўстаўная грамата, Рада БНР...

**Захар Шыбека:** Калі Міхась Ткачоў распачынаў гэтую працу, дык гэта была вельмі сьмелая думка — на мяжы фантастыкі. Грамадзтва было саветызаванае, узровень гісторыкаў быў нізкаваты. Падчас працы над энцыкляпэдыяй падвышаўся іх прафэсіяналізм, адкрываліся архівы, зьяўлялася магчымасьць кантактаваць з замежжам. Першыя тры тамы абудзілі цікавасьць да гісторыі ў грамадзтва. І цяпер яно больш падрыхтавана для ўспрыманьня акадэмічных дасьледаваньняў, навукова-папулярных кніг.

**Валер Пазьнякоў:** Калі б ЭГБ зьявілася цяпер, ужо ня той быў бы грамадзкі рэзананс. Складаючы слоўнік энцыкляпэдыі, разьлічвалі на пяць тамоў. Але вырашылі падстрахавацца і заплянавалі шэсьць — на запас. У выніку, як бачым, матэрыял улез толькі ў сем тамоў.

## Савецкія «гіры»

**«НН»: Якія станоўчыя бакі мае ЭГБ? Якіх адмоўных можна было пазьбегнуць?**

**А.С.:** Калі б своечасова адбыліся навуковыя дыскусіі, можна было б пазьбегнуць «гіраў» бальшавіцкай гістарыяграфіі. Мяне зьбянтэжыў артыкул у I томе «Антыфэадальная вайна 1649—51 г.». Не было антыфэадальнай вайны, як вельмі добра паказаў прафэсар Грыцкевіч. Прыходзіць Гаркуша ці іншы «ватажок», бунтуе тут мужычкоў і мяшчанаў — пачынаецца варушэньне. Сыходзіць — усё, ніякага варушэньня няма. Тут дзейнічала схема: у Расеі былі сялянскія войны, ва Ўкраіне — гайдамаччына, значыць, трэба было паказаць і ў Беларусі нешта такое. Хоць тут былі зусім іншыя ўмовы: заставаліся свае арыстакраты, памешчыкі. Сяляне зь дзьвюма каровамі ўцякалі ад пана, лічылі, што жорсткі...

Ёсьць артыкулы пра ўсіх першых сакратароў ЦК КПБ. Але няма ўсіх старшыняў Рады БНР. Не падаюцца імёны ўсіх прэм'ерміністраў міжваеннай Польшчы. Няма Габрыэля Нарутовіча — першага прэзыдэнта Польшчы, абранага з падтрымкай нацыянальных меншасьцяў і забітага польскімі шавіністамі. Няма і Вайцяхоўскага, другога прэзыдэнта, затое ёсьць Масьціцкі — трэці. Прынцып не вытрымліваецца.

## Аўтары і кансультанты

**«НН»: Першыя тры тамы энцыкляпэдыі рыхтаваліся ў адным палітычным кантэксьце, другая палова — у зусім іншым. Ці атрымаўся цэльны праект?**

**З.Ш.:** Гісторыя — грамадзкая навука, і выданьне ўбірае ў сябе эвалюцыю самога грамадзтва. Першыя тамы напісаныя з пазыцыяў беларускага народніцтва, нацыянальнага рамантызму. На 4-ы й 5-ы прыйшоўся пэрыяд рэакцыі, у выданьня зьявіўся цэнзар, дыктаваліся ўмовы. Але ў энцыкляпэдыі пануе факт. І аўтарскі калектыў у шостым томе выйшаў з «контррэвалюцыйнай ямы». Сёньня прафэсійны ўзровень калектыву настолькі высокі, што, каб ён цяпер рабіў другое выданьне, гэта была б супэрэнцыкляпэдыя! Я хачу падкрэсьліць вялікую ролю супрацоўніцы «БелЭн» Ларысы Языковіч.

**А.С.:** Яна практычна захавала аўтарскі калектыў. Некаторыя выйшлі, але шмат хто застаўся. Нават Адам Залескі перастаў быць сябрам навуковай рады.

**З.Ш.:** Засталіся Грыцкевіч, Сідарэвіч, Скалабан... Людзі прымалі правільнае рашэньне: калі пакінуць праект, там застануцца толькі артадоксы, савецкія гісторыкі. І тады б ня выйшла такое выданьне, якое мы маем. Хоць і гэта было няпроста. У ЭГБ пазначаныя навуковыя кансультанты: час ад часу нам дасылалі на рэцэнзію той ці іншы артыкул. Але не запрашалі на кансультацыі наконт патрэбы артыкулаў. Інакш шмат чаго можна было б пазьбегнуць.

**А.С.:** Яны хацелі б і «Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі» не чапаць. Дзякуй Богу, гэтага не паўтарыла 18-тамовая энцыкляпэдыя. У першых тамах ЭГБ мы закурсывілі (пазначылі, што гэтыя тэмы будуць у іншых тамах) такі мацярык, асабліва ў тэмах «беларуская», «віленская», што па гэтых пракладзеных рэйках прайшло шмат артыкулаў. Мусілі даць і Слуцкае паўстаньне, і Саюз беларускай моладзі, і г.д.

## Без нацыянальных іконаў

**З.Ш.:** У ЭГБ ёсьць артыкулы, напісаныя гісторыкамі савецкай школы, гісторыкамі нацыянальнай беларускай школы. Ёсьць уплыў эміграцыйнай гістарыяграфіі. Энцыкляпэдыя ўвайшла ў навучальны працэс. Мы, выкладчыкі, раім яе студэнтам. Культуры карыстаньня энцыкляпэдыяй у нас, на жаль, няма. Часьцей шукаюць нешта кшталту «Краткого курса ВКП(б)», дзе ў кароткай форме растлумачана адразу ўсё. Кніжачка Якава Трашчанка разьлічаная на такіх карыстальнікаў. А ЭГБ дае чалавеку выбар: у ёй нэўтральная інфармацыя, можна ўзяць фактуру і паразважаць.

Такія энцыкляпэдыі выдаюцца ў пэрыяд стабільнасьці, як вядомая Француская энцыкляпэдыя. А ў нас яна выдавалася ў пераходны пэрыяд, падчас трансфармацыі грамадзтва. І гэта фэнамэнальны факт, бо яна магла на трэцім томе спыніцца.

**В.П.:** Ёсьць пераемнасьць паміж сучаснымі зьявамі й тым, што пачалося раней: дабудавалы Палац Рэспублікі, чыгуначны вакзал у Менску... Такая тэндэнцыя — працягваць набыткі.

## Сачыце за спасылкамі

**З.Ш.:** У выданьні поўна старых стэрэатыпаў — пра сацыяльную справядлівасьць, клясавую барацьбу. Але яны ні шкодзяць. Чытач глядзіць, хто напісаў артыкул, і вырашае, ці давяраць аўтару.

**«НН»: Дык карыстальніку, не абазнанаму ў пэрсаналіях гісторыкаў, цяжка будзе разабрацца?**

**А.С.:** Вазьміце артыкул «БССР». Там ёсьць індустрыялізацыя і ўсё такое, але ж ёсьць адсылка «Калектывізацыя». А ў тым артыкуле — адсылкі «Раскулачваньне», «Правы ўхіл» і г.д. Гэта тое, пра што казаў доктар Шыбека, — уменьне чытаць энцыкляпэдыю. І ня ўсё залежыць ад базавага артыкулу.

**З.Ш.:** Савецкія гісторыкі не атрымалі ў ЭГБ манапольнага права на трактаваньне гісторыі. Чалавек здаровага сэнсу зможа разабрацца — праз спасылкі. Добра, што выданьне выйшла плюралістычнае. Такі час быў — з рознымі поглядамі.

**А.С.:** Ацэначныя моманты ў біяграфіях усе выкінутыя. Параўнайце артыкул «Васіль Захарка» ў 12-тамовай «Беларускай савецкай энцыкляпэдыі» і ў гэтай: там 2/3 эпітэтаў і 1/3 інфармацыя, а ў нас — толькі інфармацыя. Але ўявіце сабе, што селі б аднадумцы й пачалі пісаць. Я б напісаў «вялікі Антон Луцкевіч», нехта — «непараўнальны Вацлаў Ластоўскі» і г.д. А за гэтыя дзесяць гадоў зьявіўся вялізны пласт літаратуры. І выяўляецца, што не такімі ўжо ідэальнымі былі Ластоўскі, Езавітаў, Бадунова і г.д. Дзякуй Богу, што не далі рамантыкам ад нацыянальнай гістарыяграфіі размахнуцца пёрамі, займацца агіяграфіяй!

## Перавыданьня ня будзе

**«НН»: Энцыкляпэдыя павінна акумуляваць агульнавядомыя ўстойлівыя веды. ЭГБ шмат у чым публікуе першаадкрыцьці. Добра гэта ці кепска?**

**В.П.:** Гэта мінус. Ува ўсім сьвеце энцыкляпэдыя падсумоўвае. Але ў нас да 80-х выходзіла вельмі мала кніг у параўнаньні з Расеяй, Украінай, Літвой. І аўтары ЭГБ пачалі дасьледчыцкую працу. Зьяўляліся артыкулы пра асобаў, якіх у слоўніку і не прадугледжвалася. Паводле маіх падлікаў, слоўнік зьмяніўся падчас працы на 50%. Многія факты, знойдзеныя ў архівах, былі «сырымі», ацэнкі — папярэднімі. Але яны трапілі ў энцыкляпэдыю і застануцца там на доўгія гады.

Адначасова публікацыя першаадкрыцьцяў накіравала дасьледчыкаў на распрацоўку новых тэмаў, акцэнтавала грамадзкую ўвагу.

**А.С.:** Напрыклад, згадвалася Канстытуцыя БНР, але самога тэксту дасьледчыкі не цыталі. Сёлета ў «Arche» яна ўжо апублікаваная. Многае з таго, што мы бралі напавер у эміграцыйных і падляскіх гісторыкаў, удалося знайсьці ў Беларускім дзяржаўным архівемузэі літаратуры й мастацтва. Дакумэнты да 1990 г. ляжалі там пад грыфам «Сакрэтна». Нават літаратуразнаўчыя артыкулы Луцкевіча!

**З.Ш.:** У ЭГБ нашыя гісторыкі маглі ў сьціслай форме выкласьці свае погляды і адкрыцьці. І гэта вельмі зручна для чытача: ня трэба перагортваць манаграфіі — дастаткова прачытаць артыкул у энцыкляпэдыі. Але ЭГБ ня можа быць нашай іконай. Гістарычныя дасьледаваньні разьвіваюцца. Патрэбнае перавыданьне, дадатковыя тамы. ЭГБ — стрыжань разьвіцьця грамадзтва, гарантыя нашай дзяржаўнасьці, каштоўнасьці нашай культуры, гістарычнай традыцыі.

**В.П.:** Будзьма рэалістамі: перавыданьня ня будзе. Цяпер разглядаецца магчымасьць выданьня крыху скарочанага выданьня на расейскай мове: 3-4 тамы. Сусьветная тэндэнцыя такая: усе энцыкляпэдыі з паперы пераводзяцца ў электронны фармат. Там абнаўленьне ідзе пастаянна. Нас чакае той самы шлях. Гэтыя сем кніг на паперы застануцца як помнік, але энцыкляпэдычная справа ў галіне гісторыі не спынілася.

**Падрыхтаваў Аркадзь Шанскі**

Падзяка Беларускаму ПЭН-цэнтру за дапамогу ў арганізацыі «круглага стала».

# Андрэй Хадановіч:

# Мае вершы як лісты шчасьця



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

Працяг са старонкі 2.

**«НН»: Беларускае выданьне ідэнтычнае папярэдняму ўкраінскаму?**

**А.Х.:** Беларуская кніжка ўнутры зусім іншая. Яна большая, там ёсьць шмат тэкстаў, якія не ўвайшлі ва ўкраінскае выданьне, — вершы, створаныя за апошні год-паўтара.

**«НН»: Пагаварылі найперш з украінцамі, а ня з намі, сваім народам… Лягчэй надрукавацца па-ўкраінску, чым па-беларуску? Няма прарока ў сваёй айчыне?**

**А.Х.:** Украінцы таксама маюць песьню пра «Бедну басоту». Але іх варыянт на восем радкоў карацейшы за наш. Украінская «бідна голота» адразу пачынае біць дзядзьку багатага, які цьвеліцца з добрых людзей. А беларусы спачатку яго ўгаворваюць, да стала просяць: «А ты ня сьмейся, дзядзька багаты!» Усе беларускія працэсы адбываюцца з такім васьмірадковым спазьненьнем — фармаваньне нацыі, далучэньне да агульнаэўрапейскіх працэсаў і, нарэшце, станаўленьне іншафарматнай літаратуры.

**«НН»: Гуляць у карты, чытаць, пісаць і г.д. пад коўдрай зь ліхтарыкам — любімы занятак дзяцей, што хаваюцца ад бацькоўскіх воклічаў: «А ну спаць!»**

**А.Х.:** Толькі гультай не вінавацiў мяне ў інфантылізьме. Як на мяне, дзяціннасьць — зусім не найгоршая рыса. Шмат азарэньняў, адкрыцьцяў прыходзяць да чалавека, калі ён далёкі ад непапраўнай сур'ёзнасьці, ад сфармаванасьці. Творца ўсё жыцьцё мусіць быць недасфармаваным. Ён зьмяняецца, дасьпявае й расьце ў добрым сэнсе слова. Дай Бог дарослым рабіць такія адкрыцьці, задаваць такія пытаньні й знаходзіць такія адказы, як дзеці. Даросламу чалавеку няма чаго займацца паэзіяй — ёсьць грунтоўная проза, запатрабаваная сёньня чытачом: о, возьмеш кніжку, то маеш рэч, сюжэцец ёсьць, можна чытаць месяц у транспарце. Найлепшае дзіцятка ад паэзіі, якое я ведаю, — гэта народны паэт Беларусі Рыгор Барадулін, які па-дзіцячаму непасрэдна рэагуе на дотык да рэальнасьці. У гэтым сэнсе дзядзька Рыгор нічым не адрозьніваецца ад ліцэіста Глеба Лабадзенкі, які піша вершы й дасылае на пэйджэр адрасатам, а найчасьцей адрасаткам. І яны таксама маюць сваё вялікае шчасьце!

**«НН»: Ці можаце Вы пахваліцца прыкладамі сваіх «лістоў шчасьця»?**

**А.Х.:** Магу. Напісаў я колькі беларускіх лімэрыкаў і заўважыў, што людзі пачалі перакладаць ангельскія лімэрыкі — Эдварда Ліра, клясыка жанру, або зьяўляюцца гомельскія лімэрыкі, напісаныя гамельчуком, або лімэрыкі Васіля Фірхольда — відавочна, беларускі нашчадак Казьмы Пруткова — з мацюкамі, салёным слоўкам. Праўда, пасьля «Здубавецыя» Барадуліна беларускага чытача такім ужо ня зьдзівіш. Ён страціў сваю цнатлівасьць, і мы ня будзем яе аплакваць. Другая тэхналёгія «лістоў шчасьця» для мяне — гэта «Перакладніцкая майстэрня», якую я праводжу пры Беларускім калегіюме. Раз на тыдзень дзясятак-два «маладых шаленцаў» зьбіраюцца, каб адрэдагаваць, абмеркаваць, у пакутах спарадзіць сымпатычны пераклад.

**«НН»: «Вашыя творчыя пляны»?**

**А.Х.:** Я ператвараюся ў сэрыйнага маньяка ад выдаваньня кніжак. За другой беларускай кніжкай хутка чакаецца трэцяя — «Землякі, альбо Беларуская лімэрыкі», а там насьпявае й чацьвертая — «Дурка Беларуская» (ня блытаць з Багушэвічам!). Настаў «справаздачны пэрыяд» перад чытачом, які жадаў бы гэта мець у сябе ў выглядзе кніжак. Час ладзіць прэзэнтацыі, відовішчы, «слыховішчы», выносіць сьмецьце з… творчай лябараторыі. Час паэту вылазіць з-пад коўдры!

**«НН»: І калі вылазіны?**

**А.Х.:** У цёплы, спадзяюся, дзень 18 сакавіка. У Доме літаратара а 18.30 будзе прэзэнтацыя «Лістоў з-пад коўдры». Алесь Пушкін прывязе свой новы пэрформанс. Возьме ўдзел і шаноўны Рыгор Барадулін. Будзе Ўладзімер Арлоў, які сьніць экзатычныя сны, у тым ліку пра Хадановіча. Яшчэ будуць Зьміцер Бартосік, Серж Мінскевіч, творчы хаўрус Джэці й Віктар Жыбуль. Апошнія, як на мяне, — адны з самых шматабяцальных у Беларусі аўтараў. Чакаецца шмат харызмы й энэргіі, якой творцы абмяняюцца з тымі, каму гэта патрэбна.

**«НН»: Чым Вы асабіста парадуеце публіку?**

**А.Х.:** Апошнімі часамі паэзія ў нас падзялілася на высокія й нізкія жанры, не раўнуючы як за часоў клясыцызму. Вось жа, на імпрэзе будзе й «высокае», і «нізкае». Будзе, скажам, перасьмешніцтва зь беларускай савецкай літаратуры, кшталту «Хлопчык і копчык», дзе я перапяваю ляўкоўскага Купалу. А зусім днямі, на пачатку посту, напісаўся верш «Пост» зь перасьпевамі Блока, пра дзеўчыну, якая «пела ў шыкоўным бары».

**«НН»: Андрэй, калі Вы пасьпелі так начытацца? У адным Вашым зборніку можна налічыць прыхаванае цытаваньне й алюзіі на сотні аўтараў ад Грабеншчыкова да Гамэра. Ёсьць цытаты з расейскіх папсачоў… Падаецца, Вам усё роўна, з чаго плесьці свае карункі.**

**А.Х.:** Мне часта згадваюцца словы Шарля Бадлера, які казаў, што паэт — як сонца, праменьню якога ўсё адно куды падаць — на залатыя кляйноды ці на кучу лайна. У гэтым сэнсе для мяне сьмецьця не існуе. Любая моўная канструкцыя, любы фрагмэнт культуры, назапашаны чалавекам як у высокім, так і ў нізкім сэнсе, ёсьць як бы фрагмэнтам дзіцячага калейдаскопу. Варта яго пакруціць, страсянуць, зазірнуць — ня ведаеш, што складзецца, які ўзор. У мяне пытаюць, ці шаную я клясыкаў, ці зьдзекуюся зь іх. Найперш шаную, а толькі потым сьмяюся. Хто ж вінаваты, што мая пэрсанальная дошка пашаны часам так нагадвае карыкатуру? На люстэрка ў такіх выпадках наракаць не выпадае.

**Гутарыла Сьвятлана Курс**

## Лісты з-пад коўдры

праз акно месяцовы поўраз
апускаецца па крывой
я ня бачу
залез пад коўдру з
галавой

навісаюць словы хадульна
расстаўляюць пасткі пасты
а пад коўдрай цёпла й утульна
і нястрашна пісаць лісты

будзе рады палкоўнік маркес
і астатнія пацаны
асьцярожна ступае накрас
клышаногі й трохі п'яны

не кампутарныя крамзолі
а жывое рукі сьляды
хай баляць на пальцах мазолі
не бяды

бо нашто электронная пошта
калі проста так не ў пару
немавед пра што і навошта
немавед каму гавару

## Хлопчык і копчык

Дж., В.Ж. і ўсім аматарам Я.К.

Мой мілы таварыш, мой хлопчык,
Што прагнуў калісьці ў палёт,
Я, ведаеш, хворы ўжо копчык,
Разьбіты табою аб лёд.

Брыдзеш па жыцьці нецьвярозы,
Глядзіш у палонку й пятлю...
А помніш, як ты з бамбавоза
Калісьці глядзеў на зямлю:

«Як месяц на небе начуе,
Як блукае ў лесе мядзьведзь...»
А сёньня — і вуха ня чуе,
І вочы працуюць ледзь-ледзь.

Твой месячык мае нябёсы
І мае мядзьведзь свой бярлог,
А ты, ад гарэліцы косы,
Ня маеш нічога, бо лох!

Тры дні цябе трэсла й ламала,
І копчыкам біла аб лёд.
Табе гэта, можа, і мала,
А мне — ляцець толькі ў пралёт.

Мы, зрэшты, і так у пралёце,
Нашто нам маскоўскі гатэль?
З вышыняў на аўтапілёце
Ляцім, як цяжкая гантэль.

Маленькаму копчыку, хлопчык,
Прыходзіць вялікі капец...
І больш не заві мяне «копчык» —
Па-наскаму трэба «хвасьцец»!

## Трызьненьне сівой кабылы

Адкрыю, што мела ў тайне,
згадаю, чаго не забыла:
над купамі гною ў стайні
ўжо колькі стаіць кабыла!

Пакуль у цёплай бялізьне
вы ў ложку сьпіцё пад коўдрай,
я ў стайні стаю і трызьню,
і б'ю аб зямлю падковай.

Кабыла зь мянушкай Нюся,
што ў стойле сумуе ўпотай
між пятніцай і суботай.
Лічэце, што я вам сьнюся.

Малы гаспадар у школе
ня быў — захварэў на герпэс...
А я ня буду ніколі,
ніколі ня буду на гербе з

гатоваю ў бітву зданьню —
і плачу ўначы пра нешта.
Прадаўшы свабоду ў стайню
(а сьлёзы — дробная рэшта),

бунтую — кожнай падковай —
забылай пра сон кабылай,
усёй сваёю жыцьцёвай,
адною конскаю сілай.

# Паганская энцыкляпэдыя




Міталягічны слоўнік. — Менск: «Беларусь», 2004. 3000 ас.

Энцыкляпэдычны слоўнік «Беларуская міталёгія» аб'яднаў пад адной вокладкай зьвесткі зь легендаў, павер'яў і навуковых дасьледаваньняў. Сярод аўтараў — найбуйнейшыя дасьледнікі паганства зь ліку этнографаў, археолягаў, культуролягаў. Інфармацыя пра вышэйшых і ніжэйшых боствах, сакральныя месцы і абрады беларусаў упершыню сыстэматызаваныя пад адной вокладкай. Кожная «літара» слоўніка аздобленая адмысловай застаўкай, намаляванай Тодарам Кашкурэвічам.

Слоўнік, у які ўвайшло 600 артыкулаў 22 аўтараў, рыхтаваўся да выхаду сем гадоў. Аснову аўтарскага калектыву склалі людзі, якія на пачатку 90-х гуртаваліся вакол «Мядзяных ваўкоў», суполкі паганцаў, і цэнтру этнакасмалёгіі «Крыўя». Некалькі гадоў праект быў у «падвешаным» стане: бракавала грошай. Нарэшце ў 2003 г. зьявілася магчымасьць надрукаваць слоўнік у выдавецтве «Беларусь». Палова накладу трапіла ў бібліятэкі.

Аднак гэтая магчымасьць ледзь не абярнулася супраць саміх складальнікаў. У выдавецтва зьявіліся прэтэнзіі да ілюстрацыі на вокладцы, зробленай Т.Кашкурэвічам: «Празь меру багата паганскіх матываў». Малюнак давялося перарабіць, але на вокладцы й цяпер можна ўбачыць рагатага чорціка.

Асаблівасьць слоўніка — аўтарская падача матэрыялу. Артыкулы Тацяны Валодзінай грунтуюцца ня толькі на літаратурных крыніцах, але й на ўласных экспэдыцыйных матэрыялах. Аўтарскі «почырк» адчуваецца ў тэкстах археалягіні Людмілы Дучыц, фізык паводле першай адукацыі Сяргей Санько пэрыядычна спасылаецца на фізычныя й астранамічныя зьвесткі. Стыль жа этнакультуроляга Ўладзімера Лобача добра знаёмы чытачам «НН».

У Беларусі дагэтуль паганствам цікавіліся пераважна этнографы. «Міталягічны слоўнік», са словаў археоляга Эдварда Зайкоўскага, першая сынтэтычная праца такога аб'ёму і ахопу ведаў: ад касмагоніі й пантэону багоў да побытавых рэчаў, увесь сьвет міталягічны, якім яго й бачылі старажытныя людзі.

**Адам Воршыч**

## ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

### Гуканьне вясны з Жыбулем і Джэці

16 сакавіка кнігарня «Сьветач» (пр. Машэрава, 11) ненадоўга ператворыцца ў Сатурн. «Гуканьне вясны на Сатурне» — так назвала сваю творчую вечарыну паэтычная сям'я Віктара Жыбуля і Джэці (Вера Бурлак). Пасьлядоўнікі Драздовіча прачытаюць творы з сваіх новых кніжак — «Дыяфрагма» і «За здаровы лад жыцьця», засьпяваюць песні на свае вершы. Пачатак а 18-й, уваход вольны.

### Беларускія мастакі ў Вільні

Выстава Дзьмітрыя Мохава — сцэнографа, сябра Міжнароднай фэдэрацыі мастакоў — ЮНЭСКА з 2 сакавіка экспануецца ў Музэі тэатру, музыкі й кіно Літвы ў Вільні (былы Радзівілаўскі палац, вул.Вільняўс, 22). На выставе можна ўбачыць мастацкія эскізы дэкарацыяў і тэатральных касьцюмаў, фотаплякаты дэкарацыяў і фрагмэнтаў спэктакляў і г.д. У мастацкай галерэі Саюзу мастакоў Літвы «Арка» адбываецца міжнародная выстава жывапісу «Магія Ніды». Сярод іншых удзельнікаў — беларускія мастакі Галіна Мамонава, Вольга Сазыкіна, Тацяна Бембель, Уладзімер Макарскі, Леанід Мядзьведзкі. Абедзьве выставы экспануюцца да канца сакавіка.

### Фамільныя скарбы

У Нацыянальным музэі гісторыі й культуры (Маркса, 12) да 6 красавіка экспануецца выстава жывапісу і графікі сям'і Івановых «Фамільныя каштоўнасьці». На выставе ёсьць карціны ня толькі бацькоў — Рыгора і Натальлі, але й дзяцей — Галіны і Дар'і. Творы пераважна лірычныя — з мноствам казачных пэрсанажаў, музыкаў, вандроўнікаў, ягнятаў і львоў, катоў і сабак.

## АФІША

**Тэатар імя Янкі Купалы**

**11 сакавіка** — «С.В.» — плястычны спэктакль паводле «Вішнёвага саду» А.Чэхава.
**12 сакавіка** — «Кім» А.Дударава.
**13 сакавіка** — «Згублены рай» А.Курэйчыка.
**15 сакавіка** — прэм'ера «Я не пакіну цябе...» (рэжысэр — Марыя Захарэвіч, мастацкі кіраўнік — Валеры Раеўскі) з народнымі артысткамі Марыяй Захарэвіч і Натальляй Гайдай.

**Малая сцэна Купалаўскага**

**12 сакавіка** — мэлядрама паводле Інгмара Бэргмана «Восеньская саната».
**13 сакавіка** — «Барух-Эмануэль» Дз.Плакса.
**15 сакавіка** — «Салямэя».

**Опэра і балет**

**11 сакавіка** опэра «Чароўная флейта» В.-А.Моцарта.
**12 сакавіка** «Марная перасьцярога»: балет з XVIII стагодзьдзя.

**«Каза»**

**14 сакавіка** ў к/з «Менск» грае рок-гурт «The Stokes». Пачатак а 19-й, квіткі каштуюць ад 9 да 14 тыс. руб. Інфалінія: (017) 266-76-01, 8-029-653-95-67
**17 сакавіка** тамсама адбудзецца вялікі канцэрт групы «Краскі» з прэзэнтацыяй новага альбому. Пачатак а 19-й. Квіткі ад 9 да 25 тыс. руб.

**Залаты век Беларусі**

**20 сакавіка** ў менскім ДК МАЗ (Партызанскі пр., 117а) адбудзецца канцэрт «Залаты век Беларусі». У першым аддзяленьні грае «Стары Ольса», у другім — мюзікл «Залаты век», створаны да 450-годзьдзя Рэфармацыі ў Беларусі. На сцэне — Мікалай Радзівіл Чорны і іншыя вядомыя асобы нашае гісторыі. Мюзікл паказваецца другі раз. Пачатак а 18-й.

**Рэквізыт «Настасьсі Слуцкай»**

Касьцюмы і рэквізыт да фільму «Настасься Слуцкая» выстаўляюцца ў Музэі гісторыі кіно (Траецкае прадмесьце, Багдановіча, 15). На групавых наведваньнях дэманструецца і сам фільм. Выстава працуе **да 17 сакавіка**, з 12-й да 18-й, апроч нядзелі.

## КІНААФІША

**«Аўрора»** (253-33-60)
«Амэрыканскі пірог-3: вясельле»: **12—14** (пт-ндз) 18.30, 20.30.
«Іншы сьвет»: **12—14** (пт-ндз) 19.00, 21.00.
«Гаспадар мораў: на ўскрайку Зямлі»: **12** (пт) 16.00; **13, 14** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00.
«У пошуках Нэма»: **12** (пт) 15.00, 17.00; **13, 14** (сб, ндз) 11.00 (іл), 13.00, 15.00, 17.00.

**«Берасьце»** (272-87-91)
«Чумавая пятніца»: **12** (пт) 16.40, 18.40; **13, 14** (сб, ндз) 13.30 (іл), 18.40.
«Дрэнныя хлопцы-2»: **12** (пт) 20.45; **13, 14** (сб, ндз) 15.40, 20.45.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)
«Цяжкасьці перакладу» (прэм'ера): **12** (пт) 16.20, 18.40, 21.00; **13, 14** (сб, ндз) 14.00 (іл), 16.20, 18.40, 21.00.

**«Масква»** (223-27-10)
«Апошні самурай» (прэм'ера): **12** (пт) 18.30, 21.00; **13** (сб) 13.00, 18.20, 21.00; **14** (ндз) 13.00 (іл), 18.20, 21.00.
«Фаварыт»: **12** (пт) 16.00; **13, 14** (сб, ндз) 15.40.

**«Мір»** (284-37-71)
«S.W.A.T.: спэцназ гораду анёлаў»: **12—14** (пт-ндз) 16.40, 21.00.
«Дзюплекс»: **12** (пт) 19.00; **13, 14** (сб, ндз) 14.30 (іл), 19.00.
«Старыя»***: **12—14** (пт-ндз) 18.20.
«Цыпачка»: **12** (пт) 20.20; **13, 14** (сб, ндз) 16.00, 20.20.

**«Перамога»** (223-77-66)
«Кармэн»***: **12** (пт) 14.45, 18.45; **13, 14** (сб, ндз) 14.45 (іл), 18.45.
«Летуценьнікі»****: **12—14** (пт-ндз) 16.30.
«S.W.A.T.: спэцназ гораду анёлаў»: **12—14** (пт-ндз) 21.00.

**«Піянэр»** (227-64-87)
«Мішэль Вальян: прага хуткасьці»: **12—14** (пт-ндз) 15.00, 17.00, 19.00, 21.00.

**«Цэнтральны»** (220-34-16)
«Дзень Хамячка» (прэм'ера): **12—14** (пт-ндз) 11.00, 18.00, 21.00.
«Апошні самурай» (прэм'ера): **12** (пт) 13.00, 15.50; **13,14** (сб, ндз) 13.00 (іл), 15.50.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

**Юнаму гледачу**

**«Берасьце»**
«Канёк-гарбунок»: **13, 14** (сб, ндз) 12.00.

**«Мір»**
«Ледавіковы пэрыяд»: **13, 14** (сб, ндз) 13.00.

**«Піянэр»**
«Ну, пачакай!» (вып. №9—14): **13, 14** (сб, ндз) 10.30.
«Варвара-краса, доўгая каса»: **12—14** (пт-ндз) 12.00.
«Кніга джунгляў-2»: **12—14** (пт-ндз) 13.30.

**Выставы**

**З 16 да 18 сакавіка** ў Палацы мастацтва (вул.Казлова, 3) пройдзе выстава «Выратавальнікі вачыма дзяцей»: дзіцячыя малюнкі, вырабы, мадэлі, вершы і сачыненьні. Уваход вольны.
**Да 14 сакавіка** працягнецца выстава жывапісу і графікі сучасных мастакоў «Сакавіцкія каты». Паглядзець можна ў Пушкінскай бібліятэцы (вул. Гікала, 4). Тэл.: 236-89-84.

## Новы Запавет у перакладзе Чарняўскага




Беларускі пераклад Новага Запавету, зроблены айцом Уладзіславам Чарняўскім, выдала накладам у 3000 асобнікаў Беларускае Біблійнае таварыства. Перакладам Новага Запавету з лаціны а.Уладзіслаў займаўся з 1968 г. і на пачатку 80-х скончыў працу. Правы на выданьне ён перадаў Біблійнаму таварыству яшчэ пры жыцьці, у 2001 г. Падрыхтоўка кнігі заняла яшчэ каля двух гадоў. Вокладка кнігі стылізаваная: з старадаўнім абразом Раства, абгорнутым традыцыйным беларускім ручніком.

**Набыць кнігу можна ў Менску, у Біблійным таварыстве (вул.Чыгладзэ, 19). Інфармацыю можна таксама атрымаць на сайце таварыства (byebs.11net.com) ці праз т.: 250-39-98.**

## Гарадзенскія Казюкі

Традыцыйны кірмаш на Казюкі — дзень Сьвятога Казімера паводле каталіцкага календара, 4 сакавіка — арганізавалі ў Горадні. У гэтым горадзе сьвяты каралевіч Казімер правёў частку свайго жыцьця і тут акурат 4 сакавіка 1484 г. памёр. Труна зь целам была адпраўленая ў Вільню. А ў Горадні, у Фарным касьцёле, захоўваецца абраз сьв.Казімера — апекуна Гарадзенскай дыяцэзіі.

Лічылася, што сьвяты Казімер спрыяе майстрам, на яго дзень у ВКЛ прыпадалі першыя вясновыя кірмашы, найбольш слаўны зь якіх — віленскі — праводзіцца да нашых дзён. Па тым, як пойдзе гандаль на Казюкі, варажылі на ўвесь год. У Горадні на Казюкі можна было купіць вырабы з керамікі, скуры, саломкі, мэталу, а таксама пернікі з эвангельскімі цытатамі і адмысловыя галінкі вярбы — «казімеркі».

## Прэміі гітарыстам

На X Міжнародным конкурсе гітарыстаў імя Чэслава Дразьдзецкага, што адбываўся ў Крыніцы пад Кракавам (Польшча), дзьве першыя прэміі атрымалі беларусы — студэнт I курсу Акадэміі музыкі Павал Кухта і 13-гадовы Ігар Дзедусенка з Маладэчна. Абодва — вучні Яўгена Грыдзюшкі.

## Мэрыдыян — сусьветная спадчына

Міністарка культуры Фінляндыі Таня Карпэла падала ў ЮНЭСКА хадайніцтва пра ўнясеньне ў Сьпіс сусьветнай спадчыны 34 пунктаў, якія захаваліся на «мэрыдыяне Струвэ». Заяўка паступіла ад імя Міжнароднай фэдэрацыі землямераў (FIG) і ўрадаў дзесяці краінаў, па тэрыторыі якіх праходзіць мэрыдыян. Мэрыдыян названы ў гонар заснавальніка расейскай Пулкаўскай абсэрваторыі акадэміка Вільгельма (Васіля) Струвэ, які правёў замеры гэтага мэрыдыяну ў амаль 300 пунктах ад Дунаю да Паўночнага Ледавітага акіяну ў 1816—1855 г. У Беларусі з 30 пунктаў захаваўся 21 (усе ў Сьпісе гісторыка-культурных каштоўнасьцяў), зь іх пяць названыя ў сьпісе, пададзеным у ЮНЭСКА: вёскі Цюпішкі (Ашмяншчына), Лапаты (Шчучыншчына), Ляскавічы, Шчакоцк і Асаўніца (Янаўшчына). Пункты мэрыдыяну пазначаныя сямімэтровымі пірамідамі з мэталёвых трубаў. Пытаньне пра ўнясеньне «мэрыдыяну Струвэ» ў Сьпіс сусьветнай спадчыны будзе вырашанае ў чэрвені 2005 г.

## Рушдзі ўзначаліў ПЭН



Салман Рушдзі абраны прэзыдэнтам Амэрыканскага ПЭН-цэнтру. 59-гадовы пісьменьнік будзе ўзначальваць пісьменьніцкую арганізацыю цягам двух гадоў. 15 гадоў таму іранскі аятала Хамэйні асудзіў яго на сьмерць за раман «Шатанскія вершы». Рушдзі больш за дзесяць гадоў жыў пад ахоўвай брытанскіх спэцслужбаў. Толькі ў 1998 г. урад Ірану абвесьціў, што ня мае намеру перасьледаваць аўтара «Шатанскіх вершаў». Цяпер Рушдзі жыве ў Нью-Ёрку. Кажа, што на новай пасадзе будзе змагацца за свабоду слова, якая пасля 11 верасьня 2001 г. і ў ЗША сутыкнулася з абмежаваньнямі.

## Джэймс Бонд асірацеў

У ЗША ў веку 82 гадоў ад раку памерла Дана Брокалі — удава прадусара Альбэрта Брокалі, прэзыдэнтка кампаніі «Danjaq», уладальніца правоў на экранізацыю раманаў пра Джэймса Бонда. Пры Даніным кіраўніцтве кампаніяй былі зьнятыя тры фільмы паводле раманаў Яна Флемінга. Агента 007 у іх увасабляў Пірс Броснан: «Заўтра не памрэ ніколі», «Цэлага сьвету мала», «Памры, але ня сёньня». З падачы Даны зьявіўся й першы вобраз Джэймса Бонда, створаны Шонам Конэры. Кабета ўбачыла актора ў іншым фільме і параіла мужу, які акурат шукаў прэтэндэнта на ролю агента 007. Дана Брокалі была таксама пісьменьніцай — напісала раманы «Сцэнар забойства» і «Флярында».

**АШ; БелаПАН, Газета.ru**

25 сакавіка 1921 году ў Коўне падчас сьвяткаваньня 3-й гадавіны абвяшчэньня незалежнасьці БНР былі прадстаўлены новы міністар нацыянальных меншасьцяў — 50-гадовы Самуіл Жытлоўскі.




КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

# Габрэі ў БНР

Коўна, лістапад 1920 г. Віцэ-міністар замежных справаў Літвы Сымон Разэнбаўм ня мог не сымпатызаваць беларусам: ён нарадзіўся ў Пінску, доўгі час жыў і працаваў у Менску, прадстаўляў Менскую губэрню ў 1-й Дзяржаўнай думе.

Тыдзень таму, 11 лістапада, ён паставіў свой подпіс на міждзяржаўнай дамове паміж Літвой і Беларускай Народнай Рэспублікай. І вось цяпер проста ня мог адмовіць у ласцы прэм'еру БНР Вацлаву Ластоўскаму, які папрасіў забясьпечыць яго некалькімі рэкамэндацыйнымі лістамі. Віцэ-міністар са шчырым сэрцам зьвярнуўся да свайго ўплывовага знаёмца ў Жэнэве:

*«Дарагі Ісак Адольфавіч.*

*Я цяпер да Вас па наступнай справе:*

*Беларускае пытаньне, да якога мы заўжды ставіліся з усьмешкай (як, праўда, у свой час і да літоўскага), пачынае набываць значную рэальнасьць. Мая мара пра унію між Літвой і Беларусяй і, такім чынам, аб'яднаньне ўсяго «літоўскага габрэйства», у габрэйскім сэнсе слова, цяпер як літоўскім, так і беларускім дзеячам не падаецца ўжо хімэрай. Габрэі, як па сутнасьці, так і з тактычных меркаваньняў, мусяць мець вялізную сымпатыю да гэтага руху.*

*Калі мы адмовім у сваіх сымпатыях беларусам, нам прыпішуць безвыніковасьць беларускага руху і мы будзем мець у Беларускім народзе сур'ёзнага ворага.*

*Усё сказанае — прадмова да пісьма, зь якім да Вас зьвернецца Беларускі Ўрад».*

Узброіўшыся дзясяткам такіх лістоў ад вядомых і ўплывовых прадстаўнікоў беларуска-літоўскай габрэйскай супольнасьці, Вацлаў Ластоўскі выправіўся на штурм новага бастыёну — сусьветнага сіянізму.

Першая спроба была шматабяцальнай. У Жэнэве ў апошні дзень працы сэсіі Лігі Нацыяў беларуская дэлегацыя — Ластоўскі, Ладноў і Цьвікевіч — наведалі Нахума Сакалова і Лео Моцкіна — уплывовых сіяніцкіх дзеячоў. Тыя паабяцалі беларусам дапамогу і прасілі скантактавацца зь імі пазьней у Парыжы.

Такім чынам, адкрываўся новы фронт працы, які патрабаваў адмысловай падрыхтоўкі, спэцыфічных сувязяў і кантактаў — таму непазьбежна паўстала кадравая праблема. Нехта мусіў заняцца гэтым асобна і спэцыяльна. Пошукі адпаведнай кандыдатуры былі даручаныя радніку беларускай місіі ў Бэрліне Давіду Анэкштэйну, студэнту, былому менчуку, які меў неабходныя кантакты. Праз тых самых Сакалова і Моцкіна Анэкштэйн выйшаў на Хаіма Жытлоўскага — філёзафа, гісторыка і публіцыста, які жыў у Амэрыцы,— і той параіў зьвярнуцца з прапановай да свайго брата Самуіла.

25 сакавіка 1921 г. у Коўне падчас сьвяткаваньня 3-й гадавіны абвяшчэньня незалежнасьці БНР, быў прадстаўлены новы міністар нацыянальных меншасьцяў — 50-гадовы Самуіл Жытлоўскі.

* * *

Прыняцьце на службу прадстаўніка беларускага габрэйства ў якасьці міністра нацыянальных меншасьцяў не было выпадковым крокам. Яно мела шырэйшы, стратэгічны кантэкст. На тым самым сьвяткаваньні 3-й гадавіны БНР было абвешчана яшчэ некалькі важных дакумэнтаў, якія надавалі Беларускай Народнай Рэспубліцы новую і даволі арыгінальную пэрспэктыву.

Ва ўрачыстай адозьве Рады БНР і Рады Народных Міністраў сярод іншага было сказана:

*«Гістарычны шлях быў доўгі і цярністы. Шмат ахвяраў паклаў Беларускі Народ на алтар свабоды. Шмат жывых палягло ў самаахвярным змаганьні за шчасьце і дабро народу...*

*Ды ня сам адзін быў Беларускі Народ у сваім змаганьні. Побач яго цярпеў і змагаўся другі народ — пракавечны пакутнік Народ Жыдоўскі — зь незапомных часоў паліваўшы зямлю беларускую сваім потам, сьлязьмі і крывёю.*

*Жыдоўскі Народ зразумеў ясна, што яму няма чаго чакаць ласкавасьці ад сваіх паняволынікаў, што толькі ў змаганьні жыды здабудуць правы на жыцьцё і свабоду.*

*Уразумеўшы гэта, жыды падалі прыязную руку свайму брату ў няшчасьці — Народу Беларускаму, дзеля супольнага змаганьня за Незалежнасьць, змацаваўшы гэта актам 25 Сакавіка».*

У падсумаваньні палітычных тэзысаў адозва 25 сакавіка 1921 г. абвясьціла сувэрэннасьць нацыяў беларускай і жыдоўскай ды поўнае аб'яднаньне іх у адзіны дзяржаўны Беларускі Народ.

* * *

На той час у сьвеце не было дзяржаваў, дзе б правы габрэяў былі вызначаныя канкрэтна і экспліцытна. БНР сталася першай дзяржавай, у якой габрэі прызнаваліся супольнай дзяржаўнай нацыяй. Гэта было замацавана ў афіцыйным акце, падпісаным Радай Народных Міністраў БНР у той самы дзень — 25 сакавіка 1921-га.

Акт гэты меў сем пунктаў:

1) Абедзьве сувэрэнныя нацыі — беларуская і жыдоўская — аб'ядноўваюцца, каб разам працаваць для дэмакратычнай рэспублікі, у палітычным жыцьці якой жыды адыгрываюць важную ролю.

2) Жыды ў межах рэспублікі маюць аднолькавыя палітычныя і рэлігійныя правы.

3) Ва ўрадавых установах прымаюцца жыдоўскія чыноўнікі, прапарцыйна колькасьці жыдоўскага насельніцтва ў краіне.

4) Жыды маюць права на заладжваньне цывільных спрэчак сваімі судамі.

5) Зямля дзеліцца прапарцыйна паміж жыдоўскім і астатнім насельніцтвам.

6) Абедзьве мовы — беларуская і жыдоўская — маюць роўныя правы. Усе дзяржаўныя паперы, грошы і маркі друкуюцца на гэткіх чатырох мовах: беларускай, жыдоўскай, польскай і расейскай.

7) Дачыненьні грунтуюцца на ўзаемным даверы, і ўсялякія спрэчкі мусяць быць пазьбегнутыя.

Як зазначыў міністар Жытлоўскі, гэты акт быў беспрэцэдэнтны ў габрэйскай гісторыі за два тысячагодзьдзі дыяспары.

* * *

Адразу пасьля сакавіцкіх урачыстасьцяў міністар Жытлоўскі распачынае напружаную дзейнасьць. Цягам некалькіх месяцаў ён наведвае эўрапейскія сталіцы, дзе сустракаецца бадай што з усімі больш-менш уплывовымі прадстаўнікамі сіяніцкага руху. Кансультацыі адбываліся ў сьвятле падрыхтоўкі да 12-га сусьветнага сіяніцкага кангрэсу ў Карлсбадзе.

Галоўнай тэмай кансультацыяў было пашырэньне пагромаў у Беларусі. Падчас польскай акупацыі, акцыі Балаховіча, розных дробных антыбальшавіцкіх паўстаньняў па краі пракацілася крывавая хваля — і ўрад БНР браўся яе спыніць. На гэтым і грунтаваўся разьлік знайсьці спачуваньне і падтрымку з боку сусьветнага сіянізму.

Дагэтуль так і не вядома, ці выступаў Самуіл Жытлоўскі на карлсбадзкім кангрэсе. Захаваўся толькі тэкст ягонага мэмарандуму старшыню кангрэсу доктару Юліюсу Сімону. Паводле мэмарандуму, Урад Беларускай Народнай Рэспублікі праз сваіх прадстаўнікоў на месцах быў гатовы распачаць шырокую антыпагромную дзейнасьць. Урад, тлумачыў Жытлоўскі, мае ў сваім распараджэньні сотні агентаў у кожным пункце з габрэйскім насельніцтвам. Гэтыя людзі — адукаваныя сяляне, усёй душою адданыя ідэі Незалежнай Беларусі, карыстаюцца на месцах велізарным уплывам на сялянскія масы і здолеюць супрацьпаставіць сваю агітацыю прапагандзе цёмных пагромных сілаў. Для іх утрыманьня, а таксама для выданьня неабходнай літаратуры Ўрад прасіў 5 тысячаў фунтаў стэрлінгаў штомесячна і яшчэ 2 тысячы фунтаў аднаразова на выдавецкія патрэбы.

* * *

Спробы Жытлоўскага ды іншых дзеячоў БНР схіліць на свой бок сіяністаў плёну не далі. У сьнежні 1921-га, падводзячы вынік сваёй працы, міністар пісаў: *«Да таго часу, пакуль я не пераканаюся, што я для нашай справы нічога зрабіць не змагу, я ад яе нізавошта не адыду. Але я яшчэ ня трачу надзею. Даводзіцца тараніць шмат сьценаў, і самая цьвёрдая сьцяна — габрэйская».*

Магчыма, сіяніцкія лідэры з асьцярожнасьцю паставіліся да дэклярацыяў беларускага ўраду, прадстаўнікі якога, седзячы ў эміграцыі, гаварылі пра свае шырокія ўплывы на Бацькаўшчыне. Магчыма, у гэтых дэклярацыі ня надта верылі і самыя беларусы. Як бы там ні было — дзяржавы аднаго народу дзьвюх нацыяў так і не атрымалася. Хто ведае, ці не дала б гэткая этнічная камбінацыя ў выніку больш жыцьцяздольны і дынамічны, пасіянарны народ.

**Сяргей Шупа, радыё «Свабода»**

# З запазухі

Рыгор Барадулін

**Працяг. Пачатак у «НН» № 19-46 за 2003 год, 8 за 2004 год**

## Нарастуць!

Мамы няма. Запісваю песьні ад Марушкі. Час ад часу, зрабіўшы перадых у сьпяваньні, тлумачыць:

— У кажнай песьні свой голас. У кажнай песьні свой вывад (як выводзяць, цягнуць). А малыя ўсе адводныя.

Пад канец крэўніца мая як бы суцяшае й сябе й мяне:

— Пакуль гэты песьні запішаш, новыя нарастуць!

Аратайна-жнейная душа верыць у нязводнасьць усяго жывога. І песьня — яна жывая, яна ж голас шчырае душы.

## Безь вянца

Марушка неяк казала пра новыя формы шлюбу:

— Баба ў Ваўчы к яму прысвоілася: я твая баба.

Ня трэба вянца, абы троху вінца!

## Калі ж

Прыйшла маладзіца ў клюб. Марудныя танцы. Яна ў думках зазначае: «Цягнуць, як жабрака за х…». І чакае, чакае. Ня вытрымала:

— Дык калі ж танцаваць пачнуць?

Бо звыкла да скокаў з папеўкамі:

Ой ты, сіся, не трасіся!
Расступіцеся, шуя, не стапчыце мне х.я!
Упрысядкі прысядаў,
За касматую хватаў,
А за тую касматую
Тры дні сядзеў за хатаю.
Ой, чашы, чашы, чашы за апошнія грашы!
Ні рукі, ні ногі ня мелі спакою.
І рукамі, і нагамі,
І ўсякімі спасабамі.
Скаку-скаку на пальчыках,
Села скулка на яйчыках,
Скаку-скаку на пяце,
Села скулка на п....е!
Ой, ня сам я трасуся,
Мяне чэрці трасуць,
А малыя чарцяняткі падкалачаваюць!

Бадай што рытм крыху запавольваўся, калі прыпявалі:

Выхадзіла пані Яні,
Танцавала танцы,
Цалавала пані Яні
Пану Яну яйцы.

Як перадых. Як уздых.

Скакала ўсё, як у нас казалі, хадзіла хаданём.

Ходзіць хата, ходзіць дол,
Ходзіць па п....е хахол!

Крывічы марудных танцаў не прызнавалі. Як і каханьня.

Ой, ня сам я трасуся,
Мяне чэрці трасуць,
А малыя чарцяняткі падкалачаваюць!

## Падбочніца

Сяброў па змаганьні, аднадумцаў называюць паплечнікамі. Плячо ў плячо стаяць, ворагу супрацівяцца.

А напарніцаў, ці паходных жонак, вяльмуюць падбочніцамі. Яны пад бокам, значыць, блізка, а ня збоку прыпёку. Хоць ня толькі бок прыпякаюць.

Бок — важная часьціна ў чалавека. І дабра ў бок жадаюць, і праклёны шлюць. Бокам завуць і старану: «У сваім баку й дым грэіць, а ў чужым і сонца халоднае».

Затое падбочніца й печ, і грубку заменіць, нават хатнюю жонку. Ні зь ёй, ні на ёй не замерзьнеш. Бо запытаецца:

Ці ты хвор, ці нядуж,
Ці якое ліха?
Я кручуся, шавялюся,
А ты ляжыш ціха.

## Як пры Мікалаю

Са школы знаёмы нам дзед Талаш.

Невядома, наколькі Якуб Колас дадаў яму да характару, наколькі недабраў.

Адно зразумела, што ня мог ён надта быць за савецкую ўладу, бо гаспадаром быў у палескім варыянце.

Распавядалі пасьля.

Дзеда падчас вайны паслалі на нейкі маскоўскі завод мабілізаваць сілы, агітаваць. Нешта казаў, нешта прыгадваў. І раптам пытаньне:

— А скажыце, як будзе пры камунізьме?

Адказ канкрэтны:

— Як пры Мікалаю, толькі без калхозаў.

Болей дзед агітатарам не працаваў.

Пакуль той камунізм, дык ад сацыялізму хоць што трэба было атрымаць. З паршывай авечкі хоць воўны кузлак.

Панамарэнка, кіраўнік партызанскага руху на Беларусі (кіраваў з Масквы), выклікаў дзеда і спытаўся, што ён хоча.

Дзед папрасіў:

— Дай мне такую зорачку, як у Казловага.

Казлоў быў узнагароджаны зоркай героя Савецкага Саюзу за партызаненьне.

Панамарэнка з сумам заначыў, што цяпер з золатам тугавата, пасьля вайны будзе відаць…

Тады ўвесь партыйны й асабліва гэбісцкі актыў хадзіў у скураных палітонах. Нездарма ж іх называлі скуралупамі.

Панамарэнка, каб загладзіць недарэчнасьць з зоркай, як у Казловага, зноў пытаецца ў дзеда, ці ня хоча ён скураны палітон. Талаш згаджаецца. Тады апошняе пытаньне, якое даўжыні скураное ахінала мусіць быць.

Дзед пачынае паказваць рукой за калена, ніжэй, ніжэй і шкрабе даланёю па падлозе. Загад пашыць дакладна такое даўжыні. І Панамарэнка й сьвіта ў думках усьміхаюцца, як жа ў такім палітоне дзед хадзіць будзе.

Празь нейкі час убачылі Талаша ў караценькім, піжоністым напаўпалітончыку. Дзед улавіў зьдзіўленыя позіркі й патлумачыў:

— Адрэзаў лішніцу дый на халявы й пераДы прадаў.

Гаспадар перамог хрэстаматыйнага змагара. Дый у сьветлае заўтра ў кароткім ісьці зручней, крысьсе ног ня путае.

## Пытаньне

Сустрэча ў беларускай гімназіі ў Ляхавічах. Усё па-беларуску. Як бы ў сваю школу вярнуўся. Расчуліўся, як бы гэта рэпэтыцыя развітаньня. Пытаньняў задавалася шмат. І раптам адно:

— Што б Вы хацелі пажадаць сабе самому?

Нешта адказваў, нешта казаў. Але пытаньне так і засталося неадказаным. Доўга думаць буду ды так і не адкажу…

## Цяплей...

Граматыка ўжывае дыктатуру ўніфікацыі, аднолькавасьці, сталага месца жыхарства слова ў форме. А жывая мова ніяк ня хоча зьмірыцца, падпарадкавацца дысцыпліне. І тое, што граматыка лічыць адхіленьнямі ад нормы, мае болей першароднасьці.

Да прыкладу, мне цяплей ад такога нязвыклага для іншых гучаньня фразы: *гэткай парой зьбіраюцца на валачобнікі ісьці.*

Змалку ведаю і чуў, што трэба *схадзіць вады*, *схадзіць хлеба*, а не *па ваду*, *па хлеб*. Літаратурнай мове пісьменьнікамі, якія жывую мову чулі мала ці забыліся, навязалі жыўцом узяты з расійскай выраз *пайсьці на рыбалку*. Нават не патурбаваліся калькаваць. А мне гучыць крывіцкае, маміна *пайсьці на рыбу*. Гэта зь сівой даўніны, калі рыба была магутная, калі яе было багата. Як бы пайсьці на бойку. Таксама *пайсьці ў грыбы*, *пайсьці ў ягады*. Значыць, іх густа, іх амаль глыбока. Як у лес, дзе згубіцца можна. Як некалі.

Запомніцца кожнаму й такая вушацкая форма: *на гармонік іграў, на йскрыпку йграў, на ўсе рукі малец быў.*




АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## Адлік часу

Рост дзяцей вызначалі проста. Ставілі да дзьвярнога вушака й рабілі накрэсьлінкі над макаўкай.

І рост дня таксама вызначалі. Толькі ўжо дзень каля вушака ня ставілі. Яшчэ на маёй памяці вушацкія вяскоўцы дый мястэчкоўцы казалі:

— Вырас дзень, сонца ўжо ў дзьве ляхі...

Ад гароду — асноўнага карміцельніка, ад ягоных лехаў (градак) ішоў адлік часу. І ён быў дакладны, бо лучыў неба зь зямлёю.

## Вымярэньне

Маладзіца сумна зазначае:

— Да камуністаў рака была ў два расты, а цяпер — вераб'ю па калена.

І глыбіня вызначаная, і час акрэсьлены.

Мяне зацікавіла, як вымяралі глыбіню. Ці адзін станавіўся босымі нагамі на дно ракі, а другі — яму на плечы й рукі выцягваў?

Магутныя былі нашыя продкі, трывалыя й кемлівыя. Мы, як вераб'і тыя, ім на зьмену прыляцелі толькі чырыкаць…

## Новая прычоска

У Вушачу зь Менску прыехала фіфа ўзначаліць журы конкурсу мастацкай самадзейнасьці. На галаве як ня стог. Валасы сабраныя ў хвост.

Мой сваяк Пятрок, які аб'ехаў на машыне сьвет з прысьветкам, адразу назваў учасьніне: «конь тужыцца».

Надта ж перадавала гэная прычоска намаганьне…

## Праз злучок

На слупе аб'ява: «Прадаецца новы кілім». Хтосьці чарнiламі праз злучок дапісаў: самалёт. Ляці ды не хачу! Толькі куды?

## Апіска

У аўтаркі было: дайшоў да белага каленьня. Наборшчык набраў: да белага калена. Гэтак гарачэй і спадзеву болей.

## Трывалы падмурак

Маладзёны вязуць калясачку зь першынцам. У нагах у малога падручнікі. Бацькі здаюць залікі, экзамэны.

Малы нагамі ўпіраецца ў трывалы падмурак. Веды — надзейны пункт апоры!

## Ліст

Вясна хацела паслаць ліст лету. Абмакнула сьцяблiну ў блакіт і размашыстым почыркам пачала пісаць на палёх.

Лета як не да восені расчытвала словы васільковыя. Аж вочы сталі васільковымі.

## Неакрэсьленая дакладнасьць

Маці глядзіць на сына, які дзень з ноччу шукае рыфмы, нагой рытм адбівае. Сама сабе: цабэрак яснага розуму пры смутнай галаве.

Рэцэнзіі будуць потым. Магчыма…

## Пры выкананьні...

Міліцыянт сядзіць у туалеце супраць ЦК. Служыцелька зазірае, бо задужа шмат галасоў. Аж гэта ўключана рацыя. Пры выкананьні службовых абавязкаў і ў туалеце пастух парадку драмаць права ня мае. Лычкі, як тое лыка, зьдзерці могуць.

## Прыдаўся

Нарач. Задажджыла. Пастухі ў нэйлёнавых насавах. У аднаго ў руцэ піянерскі горан. Хоць тут прыдаўся. Бо час адпіянерыўся. Праўда, у адной каровы чырвоны гальштук. Як у старшай піянерважатай…

## Чувак

Каля тэатральна-мастацкага інстытуту магазін. Нядзельны вечар. Нэгр без чаргі просіць цыгарэты. Хлопец ляпае яго па плячы:

— Не нахабнічай. Ты хто? Адкуль?

— Беларус! — белазубіцца нэгр. Бярэ цыгарэты й да хлопца, што рабіў яму заўвагу:

— Чувак.

## Не навязалі...

Бабка прыехала дамоў у вёску й бядуе:

— Я ж была ў горадзе. Там усе машыны навязаны. А майго дурня не навязалі, дык ён і разьбіў машыну.

Бабка й не падумала, што й думкі стараюцца навязаць. Як думкі на прывязі, уладзе спакайней…

## Рады

З раёнаў, зь вёсак бацькоў, сваякоў вязуць у цырк, бо й там, і ў горадзе дзеткі адвыклі ад жывога. А старым зразумелыя й кот, і конь, і нават пацук. І яны рады за іх здольнасьці. У жывацінаў мазгі не сынтэзаваліся…

## Дзе?

Малая ў вечаровым тралейбусе:

— Не хачу, каб цёмна. Дзе сягоньня?

Маці тлумачыць, што сёньня ўжо ня будзе, будзе толькі заўтра.

Малая маўчыць. Маўчыць тралейбус.

Пытаньне болей чым дарослае. Хутчэй перарослае. Самое сябе перарасло.

**Працяг будзе.**




# Сяргей Абламейка «Egoізмы»

**У Вільні выйшла новая кніга з сэрыі «Вострая Брама» выдавецтва «Наша Ніва».**

Гэта — унівэрсальная кніга чалавечай (хрысьціянскай, але ня толькі) маралі, побыту і жыцьцёвай мудрасьці, якая ахоплівае ці ня ўсе бакі людзкога існаваньня. Не зважаючы на ўяўную даступнасьць, кнігу трэба чытаць нетаропка, з роздумам, асэнсоўваючы кожны паварот лёгкі прапанаванага афарызму. Тады ён адкрыецца вам ва ўсёй глыбіні свае мудрасьці. Сабраныя ў кнізе сэнтэнцыі ў бальшыні сваёй пазбаўленыя спрошчанай павучальнасьці, сумнеўнай навуковасьці, выкладзеныя даступна для разуменьня, добрай беларускай мовай. У прамежках між імі яны як быццам пакідаюць чытачу да роздуму ў паўзах, часам, можа, не выключаючы нязгоды ў высновах ці фармулёўках.

Маральны погляд аўтара, часам бязьлітасны да чалавечай экзыстэнцыі, можа нават шакаваць. Тое абгрунтавана, калі мець на ўвазе перажыты грамадзтвам час і набыты ім досьвед.

**Васіль Быкаў**
(з прадмовы да кнігі)

### Адказы на крыжаванку з №9

**Па гарызанталі:** 4. Абэртон. 9. Базавы. 10. Тэорыя. 11. Санта. 12. Азіят. 13. Кафля. 18. Масла. 20. Амэтыст. 21. Імідж. 22. Бандэроль. 23. Андалюсія. 25. Шагал. 27. Амбіцыя. 28. Манат. 32. Лухта. 33. Купец. 34. Голуб. 36. Вярста. 37. Імшара. 38. Малітва.

**Па вэртыкалі:** 1. Абрыс. 2. Арганаўты. 3. Аорта. 5. Вакзал. 6. Хамяк. 7. Колас. 8. Дыплём. 14. Сабатаж. 15. Эмблема. 16. Эсэнцыя. 17. Адбітак. 19. Арэал. 21. Іслам. 24. Міталёгія. 26. Акуляр. 29. Алегра. 30. Атоса. 31. Лукша. 34. Гамак. 35. Бітва.

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

18 сакавіка, на Дзень сьвятога Патрыка, на гістфаку БДУ (вул.Кірава, 28) адбудзецца абмеркаваньне на тэму «Разуменьне вольнасьці ў мэнталітэце ірляндцаў і беларусаў». Запрашаем усіх ахвотных. Пачатак а 18-й.

### КАНТАКТЫ

**Шаноўная пані!** Я чакаю ад Вас ліст, каб ведаць пра Вас. Шаноўны пан. А/с 39, 222160, Жодзіна

**«Загародзьдзе».** Заходнепалескае навуковае таварыства зьбіраецца, каб ушанаваць 80-годзьдзе з дня нараджэньня праф.Вярэніча. 16 сакавіка а 18.15 па адрасе: вул. Казлова, 7-101 (код пад’езду 101), Менск

### КНІГІ

**Багаты выбар** кніжных рарытэтаў, навучальныя дапаможнікі, часопісы, слоўнікі, відэа, аўдыё, CD, значкі, шаўроны, кашулі, календары на Румянцава, 13 (ТБМ): панядзелак—пятніца (13.30—19.00), ля Лінгвістычнага ўнівэрсытэту

**Кнігі — поштай.** Новыя CD: «NRM» «Spravazdača 1994—2004. Gold», Віктар Шалкевіч «За сто крокаў ад Вострае Брамы, альбо Геаграфія ВКЛ і ваколіцаў». Тэл.: (029) 643-57-33

**Кнігі — поштай.** Новыя: Язэп Лёсік «Збор твораў 1921—1930», Андрэй Хадановіч «Лісты з-пад коўдры», «Czasopis» №2/2004, Сакрат Яновіч «Пад знакам Арла і Пагоні», Мікола Ермаловіч «Беларуская дзяржава Вялікае княства Літоўскае». Т.: (029) 643-57-33, e-mail: exlibris@tut.by

**Кнігі — поштай.** Замаўляйце каталёг: поштай — п/с 333, 220050, Менск; e-mail: exlibris@tut.by; Internet: http://www.knihi.net; тэл.: (029) 643-57-33

### ПРАЦА

**Рок-гурт** шукае бас-гітарыста (узровень не ніжэйшы за сярэдні) з асабістым інструмэнтам і творчым жаданьнем. Т.: (029) 778-34-22 (Дзіма), 222-72-64 (Каця), belman@tut.by

**Аэраграфія**, мастацкі росьпіс аўтамашын (нанясеньне малюнку), маб.тэлефонаў і г.д. Т.:(029) 757-38-30, Аляксандар або Аляксей

**Мастацкі росьпіс** сьцен, дзьвярэй, аздабленьне памяшканьняў, фрэскі, графіці й г.д. Т.: (029) 755-19-49, Сяргей

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя. Т.: 235-18-72. Юрась (пасьля 17-й)

**Праца** альбо дадатковы заробак для цікаўных, актыўных, ініцыятыўных, амбітных. Т.: (029) 766-12-79. Зьмітрусь

**Вядзеньне** бухгальтэрыі, цэнаўтварэньне, бізнэс-пляны на роднай мове. Т.: (029) 687-83-72. Юрась

**Працу/супрацоўніцтва** шукае мужчына 26 год: кампутар, сувязь, мовы, пасьведчаньне ІП. Т.: 213-18-77. Аляксандар

### ВЕРШ НА КУПОНАХ

Верш ад Ганны для безнадзейна хворае Марыны, але й для ўсіх

Не люблю анікога,
бо Кахаю усіх;
не жадаю нічога —
маю больш за усіх.

Узьлятаю да Неба,
бо хаджу па зямлі
і ня маю патрэбы
ў славалюбстве зямлі.

Будзе тое, што Будзе,
будзе Неба й Зямля,
будуць роўнымі людзі,
як і Неба й Зямля.

Я сказала вам многа,
шмат сказаць не магу.
Мо стаю ля Парогу…
Мо ўсе мы — на Шляху…

**Запрашаем на падарожжа 14 сакавіка** (нядзеля) па маршруце: Менск — Ракаў — Пяршай — Падневічы — Івянец — Дзераўная — Акінчыцы (музэй Якуба Коласа) — Новы Сьвержань — Стоўпцы — Менск.
26—29 сакавіка — у Львоў. Тэл. 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер); 264-12-38, 776-24-35 (Павал).

# Як вылічыць крата

## фэльетон

**Пераход сотні лукамольцаў у Баранавічах на бок «зуброў» сьведчыць пра тое, што ў шэрагах афіцыйных структураў дзейнічае цэлае павуціньне апазыцыйных кратоў.**

З 1943 г., калі ўласаўская брыгада Гіль-Радзіёнава кагалам перайшла на бок партызанаў, Беларусь ня бачыла такой буйной дэманстрацыі палітычнай здрады. Апазыцыянэры не хаваюць, што гэта толькі пачатак: БРСМ нашпігаваны іх агентамі, як 81-ы нумар аўтобуса пасажырамі ў гадзіну пік.

Хоць «зубры» прыпісваюць сабе ідэю паюзаць людзкія і тэхнічныя рэсурсы БРСМ, капірайт тут належыць трацкістам. З 30-х гадоў адэпты 4-га Інтэрнацыяналу практыкуюць «інтрызм» — уступаюць у шэрагі партый і арганізацый, захопліваюць там кантроль або чэрпаюць адтуль кадры. Інтрызм прынёс ім шыкоўныя вынікі.

Што там сто лукамольцаў! У 50-я гады французкія трацкісты наклалі лапу на прафсаюз «Force Ouvriere», створаны на гранты ЦРУ для барацьбы з камуністычным CGT. На радзіме «Бітлз» яны двойчы зводзілі да сябе ўсю маладзёжку лейбарыстаў: у 70-я гэта зрабіла Workers Revolutionary Party, у 80-я — група «Militant».

Эфэктыўнасьць тактыкі інтрызму ставіць баронаў БРСМ у пікантную позу. Як вылічыць агентуру ворага? Сакратарка, якая нонстоп рубіцца ў «касынку», — хто яна: сэксапільная дура або агентка «Зубра» пад нікам «доктар Пляйшнэр»?

Лепей за ўсё было б узброіць кожную філію БРСМ дэтэктарам хлусьні. Праца апарата пабудавана на тым, што, кажучы хлусьню, чувак адчувае псыхалягічны дыскамфорт, а хітрадупая машына гэта фіксуе. Мінусы ж — па-першае, палову дэтэктараў сапруць, па-другое, яшчэ агент Філбі ведаў, як падмануць робата. Каб не было дыскамфорту, перад тэстам трэба прыняць сто грам.

Наўрад ці дапаможа і анкета з падкавырыстымі пытаньнямі кшталту: «Ці пражывалі ў 1990—96 г. вашы бацькі ў выбарчых акругах, у якіх перамагалі кандыдаты ад БНФ?»

Пэрспэктыўны мэтад — эліксыр праўды. Пасьля прыняцьця амброзіі (шырка або алькаголь) сьвядомасьць асобы прытупляецца і зь яе вуснаў прэ праўда-матка. У мэтах эканоміі патрыётаў можна тэставаць звычайным чарнілам — у крамах ёсьць бырло пад назвай «Ісьціна».

Пазытыў: паколькі ў апазыцыянэраў чацьверты тост «за снайпэра», агент абавязкова праколецца. Нэгатыў: запой структуры і зрыў турніру «Залатая шайба» па прызы прэзыдэнта.

Лепш за ўсё БРСМаўцам выкарыстаць рапарт Рэя Андэргіла. Рэй быў спэцагентам М6, якога інфільтравалі ў «Militant» з заданьнем высьвятліць, як працуюць інтрысты. Як піша 007, галоўная зброя «трацкісцкіх кратоў» — нудота. Скажам, вы агент Севярынца, якому даручана правесьці на базе БРСМ «Шоў Беларушчыны». Для гэтага на паседжаньні ячэйкі трэба нудотна і доўга бухцець пра тое, якія сьветлыя пэрспэктывы чакаюць нас у кантэксьце апошняга прагону ППРБ. Паралізаваныя нудотай «левыя» звальваюць або дрыхнуць, пакуль вы зь сябрамі прымаеце патрэбную рэзалюцыю.

Рэзюмэ для Арды: сапраўдны фанат у БРСМ ня той, хто пяць разоў на дзень робіць намаз у кірунку Маркса, 38, а той, хто абыякава ставіцца да сяброўства ў Саюзе. Прапануйце сябру бясплатна папрацаваць на будоўлі Нацыянальнай бібліятэкі. Калі чэл адказа: «Ты што, абкурыўся?» — або пакажа дабедку аб тым, што Айбаліт забараніў яму гарбаціцца на суботніках БРСМ, — гэта свой чалавек, патрыёт. Калі пабяжыць па лапаты — гэта крот.

Заўжды Ваш,

**Лёлік Ушкін**




**21 сакавіка** запрашаем на экскурсію **«Гістарычны Пінск».**

Праграма туру:
**Пінск:** капліца XVII ст.; Варварынская царква; палац Бутрымовіча; касьцёл Карла Барамея; манастыр францішканцаў; касьцёл Ушэсьця XVIII ст.; жылая забудова, касьцёл Божай Маці, манастыр езуітаў; сядзіба, драўляная царква XIX ст.; музэі гораду;
**Косава:** палац; сядзіба Касьцюшкаў;
**Парэчча:** парк Скірмунтаў.
Кошт — 18 000 р. для дзяцей і 21 000 р. для дарослых.
Тэлефануйце: 8-029-755-03-70, 222-88-61, 222-88-76 (ф).



## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Тутэйшаму з Горадні.** Гутарка на тое і ёсьць, каб чытач мог сам разабрацца, што за чалавек перад ім. Гэтак і зь Сяргеем Міхалком. Неабавязкова яго стаўленьне да алькаголю ці трасянкі мусіць супадаць з рэдакцыйнай пазыцыяй. Ён — вядомы артыст, асоба, якую цяжка ігнараваць. Пачытаўшы ж яго развагі, кожны можа скласьці пра чалавека самастойнае ўражаньне і зрабіць свае высновы. Вы пагарачыліся.

**Аляксею Ш. зь Менску.** На жаль, ня маем на гэта сродкаў цяпер.

## КОШТЫ

**На платныя прыватныя абвесткі (для прыватных асобаў) на старонку 16 рэклямныя расцэнкі:** да 20 словаў (тэкставы модуль) — 2100 руб., за кожныя наступныя 20 словаў (тэкставы модуль) — 2100 руб. Аформленая абвестка з улікам кошту арыгінал-макету за 1 кв. см. — 360 руб.

## In memoriam
## Міхась Навумовіч



4 сакавіка ў Вільпэне пад Парыжам абарвалася жыцьцё слыннага сына Беларусі Міхася Навумовіча — мастака, скульптара і выкладчыка, сябра Рады Згуртаваньня беларусаў сьвету. Ён стаяў ля вытокаў стварэньня беларускай незалежніцкай арганізацыі моладзі ў Францыі, быў рэдактарам яе друкаванага органу — часопісу «Моладзь». Да апошняга часу быў старшынём Саюзу беларусаў Францыі «Хаўрус» — найстарэйшай зь дзейных дыяспарных арганізацый.

Апошнія паўгоду жыцьця Міхась Навумовіч актыўна працаваў над успамінамі для кнігі «Месца выданьня — Парыж», якая ўключае агляд бачын часопісу «Моладзь» за 1948—54 г. Кніга падрыхтаваная да выданьня. На жаль, Міхась Навумовіч не пабачыць яе.

**Сябры Ўправы МГА «ЗБС «Бацькаўшчына»**

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ______________________

**Імя і прозьвішча** ______________________
**Адрас, тэлефон** ______________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| выпускны рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
Наклад 3535. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 22.00 10.03.2004.
Замова № 1466.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а